WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 ЛІПЕНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 141
(26749)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

КАЛІ ЯЗВА АБВАСТРЫЛАСЯ І «ДАСТАЎ» ПАНКРЭАТЫТ...

На нашай чарговай «прамой лініі» мы пагаворым пра хваробы страўнікава-кішачнага тракту, такія як язвы, гастрыты, панкрэатыты і іншыя. Вы зможаце задаць пытанні **дацэнту 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта, кандыдату медыцынскіх навук, урачу-гастраэнтэролагу Мікалаю Валянцінавічу КАПРАЛАВУ,** а таксама **дацэнту гэтай жа кафедры, кандыдату медыцынскіх навук, урачу-гастраэнтэролагу Ірыне Аляксандраўне ШАЛАМІЦКАЙ.**

«Прамая лінія» адбудзецца сёння з 14.00 да 15.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.

ПАМЕРЫ ЎСІХ ВІДАЎ ПРАЦОЎНЫХ ПЕНСІЙ У БЕЛАРУСІ З 1 ЖНІЎНЯ ПАВЯЛІЧАЦЦА Ў СЯРЭДНІМ НА 12,5 ПРАЦЭНТА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 ліпеня падпісаў указ № 371 «Аб павышэнні працоўных пенсій».

Гэтым указам з 1 жніўня 2010 года павялічаны памеры ўсіх відаў працоўных пенсій у сярэднім на 12,5 працэнта. У выніку памер сярэдняй пенсіі ў жніўні 2010 года складзе Br528,3 тыс. і павялічыцца на Br58,6 тыс.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка адзначае неабходнасць нарошчвання тэмпаў уборкі ўраджаю

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў учора даклады губернатараў Віцебскай і Гродзенскай абласцей аб ходзе ўборачнай кампаніі.

На 21 ліпеня ў рэгіёнах убрана прыкладна па 6 працэнтаў плошчаў збожжавых, завяршаецца ўборка азімага рапсу (убрана ўжо больш за 75 працэнтаў). Як далажылі Прэзідэнту Аляксандр Косінец і Сямён Шапіра, у бліжэйшыя дзень-два вобласці выйдуць на масавую ўборку збожжавых з тэмпам каля 5 працэнтаў штодзень. У сувязі са складанымі ўмовамі надвор'я кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу губернатараў на неабходнасць нарошчвання тэмпаў уборкі, яе якасць, мінімізацыю страт вырашчанага ўраджаю. Ён таксама запатрабаваў своечасова і рацыянальна правесці ўборку саломы, выкарыстаць яе як арганічнае ўгнаенне, а таксама забяспечыць пасеў азімага рапсу ў аптымальныя тэрміны.

Прэзідэнт у канцы гэтага тыдня зробіць рабочую паездку па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, а на наступным тыдні праінспектуе іншыя рэгіёны краіны.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ НАМАЛАЦІЛІ БОЛЬШ ЯК 1 МЛН ТОН ЗБОЖЖА

Гаспадаркі Беларусі намалацілі 1 млн 86,9 тыс. т збожжа. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.

Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур складае 31 ц/га. Самая высокая ўраджайнасць — у Гродзенскай вобласці (40,9 ц/га). Больш за ўсё намалочана збожжа ў Гомельскай вобласці — 338,4 тыс. т. На другім месцы па намалоце Брэсцкая вобласць (213,9 тыс. т), на трэцім — Магілёўская (194,8 тыс.т). Гаспадаркі Мінскай вобласці намалацілі 166 тыс. т, Гродзенскай — 89 тыс. т, Віцебскай — 85 тыс. т.

Падрабязнасці

У ГРАФІКАХ ПЕНСІЙНЫХ ВЫПЛАТ ЗМЕН НЕ БУДЗЕ

Рашэнне кіраўніка дзяржавы аб павелічэнні з 1 жніўня памераў працоўных пенсій будзе датычыцца 2,4 мільёна грамадзян нашай краіны — пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва.

Варта нагадаць, што паводле рашэння кіраўніка дзяржавы, сярэдні памер пенсій у Беларусі ўзрасце на 12,5 працэнта — да адзнакі ў 528,3 тыс. рублёў. Пры гэтым, заўважыла Валянціна Каралёва, дабаўка ў кожнага пенсіянера будзе рознай — у залежнасці ад асабістага стажу, памераў ранейшых заробкаў, а таксама — ад магчымай наяўнасці права на надбаўкі і павышэнні. Разам з тым, падлікі паказваюць, што са жніўня сярэдняя пенсія па ўзросце будзе адпавядаць 553,9 тыс. рублёў (павелічэнне ў параўнанні з ліпенем — на 62 тысячы), максімальная пенсія непрацуючых пенсіянераў (пры стажы ў мужчын не менш за 45 ці жанчын не менш за 40 гадоў і індывідуальным каэфіцыенце 4,0 і вышэй) — 864,1 тыс. рублёў (дабаўка складзе 99,9 тысячы), а новая максімальная пенсія працуючых пенсіянераў (пры такім жа стажы і каэфіцыенце заробку 1,3 і вышэй) — 627,2 тыс. рублёў (рост на 72,5 тысячы).

Адначасова таксама з 1 жніўня ў Беларусі плануецца індэксацыя мінімальных і сацыяльных пенсій, а таксама надбавак і павышэнняў да іх. Канкрэтныя памеры павелічэння гэтых выплат стануць вядомыя крыху пазней — пасля зацвярджэння новага бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

Ужо цяпер вядома: пераразлік працоўных пенсій з 1 жніўня прывядзе да росту выдаткаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 146,8 млрд рублёў — яны складуць 1 трлн 323 млрд рублёў у месяц. Тым не менш прабем з выплатамі пенсіянерам не ўзнікне. «Апошнім часам запазычанасць па плацяжах у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва скарачаецца, дастатковыя сродкі ў Фондзе ёсць, і, адпаведна, пенсіі ў новых памерах будуць прафінансаваныя своечасова», — адзначыла намеснік міністра.

Сяргей ГРЫБ.

НА ПАЎДНЁВЫМ УСХОДЗЕ ЧАКАЕЦЦА ДА 37 ГРАДУСАЎ

Тэмпература паветра днём 22 і 23 ліпеня ў цэлым па Беларусі дасягне адзнакі плюс 30—34 градусы, на паўднёвым усходзе будзе 35—37 градусаў спёкі, паведамілі ў Рэспубліканскім гідраметэацэнтры.

У Мінскай вобласці максімальная тэмпература паветра 22 ліпеня складзе 30—34 градусы вышэй за нуль, 23 ліпеня ў паўднёва-ўсходніх раёнах вобласці паветра прагрэецца да 35—36 градусаў. У Мінску сёння будзе 30—32 градусы вышэй за нуль, а 23 ліпеня — плюс 31—33 градусы. Штармавое папярэджанне аб небяспечнай метэаз'яве Рэспубліканскі гідраметэацэнтр перадаў па ўсіх рэгіёнах краіны.

У гідраметэацэнтры адзначылі, што папярэджанне аб неспрыяльнай метэаз'яве складаецца, калі тэмпература паветра прагназуецца плюс 30 градусаў і вышэй. Штармавое папярэджанне аб небяспечнай з'яве складаецца ў тых выпадках, калі прагназуецца плюс 35 градусаў і вышэй. Ва ўсіх выпадках гэта інфармацыя перадаецца ў МНС, кіруючым органам краіны і метэазалежным прадпрыемствам народнай гаспадаркі.

БЕЛТА.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Зенит-БелОМО» (продавец)**
проводит очередной открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: **Минская область, Вилейский район, Нарочанский с/с, д. Принта, в составе:**

Лот № 1: свинарник, об. пл. 848,5 кв.м. **Начальная цена с НДС – 23 333 953 бел. руб.** Земельный участок пл. **0,4518 га.**

Лот № 2: склад хранения семян, об. пл. 495,6 кв.м. **Начальная цена с НДС – 13 849 857 бел. руб.** Земельный участок пл. **0,6985 га.**

Лот № 3: склад зернофуража, об. пл. **442,5 кв.м. Начальная цена с НДС – 58 856 706 бел. руб. Цены снижены на 20 %.** Земельный участок пл. **0,1245 га.**

Задаток 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 18.05.2010.

Аукцион состоится **29.07.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.07.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Па вялікую рыбу — на дзедавым чоўне

Крыху болей за год жыве са сваёй сям'ёй на азёрнай Лепельшчыне малады настаўнік з Чарнобыльскай зоны (а дакладней, з вёскі Асарэвічы Брагінскага раёна) Аляксандр Бельчанка.

— Я вырас на Дняпры, у нас і дагэтуль выраблюць чаўны з вярбы, таму прывёз дзедаў човен з сабою, — кажа Аляксандр, збіраючыся з пяцігадовым сынам Сяргеем на возера вудзіць рыбу, і ўдакладняе: — На поўначы Беларусі гэткія выдзеўбаныя чаўны называюць дубіцамі, але на Лепельшчыне, напрыклад, яны практычна не сустракаюцца, таму многія глядзяць на мой човен, як на сапраўднае дзіва.

У Старалепельскай базавай школе Аляксандр выкладае фізіку і працу. Толькі ў час летніх канікулаў у яго хапае часу на адпачынак з вудамі. А нядаўна ў сям'і настаўніка-перасяленца нарадзілася дачушка Карына.

«НАСТРАЛЯЎ» 300 МІЛЬЁНАЎ

Мінскі прадпрымальнік «кінуў» сяброў і знаёмых на вялікія грошы.

36-гадовы падазроны ў махлярстве, паводле звестак прэс-афіцэра Цэнтральнага РУУС Кацярыны Лісоўскай, «падсеў» на чужыя грошы больш за два гады таму, калі пачаліся праблемы ў бізнэсе. Тады на выручку яму прыйшоў добры сябра, у якога прадпрымальнік узяў у доўг 5 тысяч долараў ЗША. Вяртаць жа грошы не спяшаўся. Прычым, каб расплаціцца з сябрам, прадпрымальнік узяў крэдыт у банку на развіццё бізнэсу, да таго ж аформіў 4,8 тысячы долараў крэдыту ўжо на іншага сябра. Апошняму ён паабяцаў, што будзе вяртаць крэдыт своечасова. Аднак ужо праз месяц стала вядома, што падмануў: з банка крэдытаатрымальніку, які адпачываў на адным з паўднёвых курортаў, прыйшло СМС з напамінам аб запазычанасці па крэдытным абавязацельстве. А вось усе спробы звязацца з тым, каму насамрэч спатрэбілася падтрымка банка, не ўдавалася, і тады падмануты чалавек звярнуўся з заявай у міліцыю.

Высветлілася, што на сумленні бізнэсмена не адна падобная «здзелка». Раней падазроны таксама для развіцця бізнэсу пазычыў 50 тысяч еўра ў сям'і прадпрымальнікаў. Між іншым, вярнуць гэтыя грошы ён абяцаў праз месяц з працэнтамі. Але ў прызначаны час аддаў усяго 6 тысяч, спаслаўшыся на пэўныя цяжкасці. На астатнюю ж суму доўгу напісаў распіску, аднак праз месяц перастаў выходзіць на сувязь з пазычальнікамі. Яшчэ адзін сябар «ахвяраваў» хітруну 10 тысяч еўра пасля таго, як апошні паабяцаў праканверсаваць валюту па выгадным курсе. І гэты пацярпелы не дачакаўся сваіх грошай. Агульная сума ўрону, які нанёс падазроны ў махлярстве прадпрымальнік, складае каля 300 мільёнаў рублёў. «Легкадумны» бізнэсмен затрыманы.

У НЕПРАЦУЮЧАГА ЎКРАЛІ $29 000

Невядомы зладзюжка забраўся ў кватэру 48-гадовага жыхара Маладзечна ў адсутнасці гаспадара і завалодаў грашыма пацярпелага.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, злачынца прабраўся ў чужую кватэру днём, падабраўшы ключ да дзвярнога замка. Здабычай злодзея сталі 29 300 долараў ЗША і залатыя вырабы, якія ён украў у гэтага непрацуючага маладзечанца. А ў пасёлку Дружны Пухавіцкага раёна ахвярай невядомага стала 55-гадовая жанчына, у якой ён «прыхваты-заваў» буйную суму грошай з сумкі. Між іншым, сумка знаходзілася ў кватэры, гаспадыня якой таксама адсутнічала дома. У гэты час у жыллё і наведаўся злачынца праз незачыненыя балконныя дзверы і забраў 4060 долараў. У абодвух выпадках вядзецца пошук зладзюжак.

Ігар ГРЫШЫН.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
(организатор аукциона) по поручению
Минского областного союза потребительских обществ (продавец)**
проводит очередной открытый аукцион по продаже единым лотом объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: **г. Минск, ул. Казинца, д. 11а**, в составе: **административно-хозяйственное здание** (инв. № 500/С-40517), об. пл. 117,2 кв.м, **здание складов** (инв. № 500/С-40518), об. пл. 666,9 кв.м.

Начальная цена с НДС (снижена на 10 %) – 1 620 000 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,4111 га.**

Задаток – 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.05.2010.

Аукцион состоится **29.07.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.07.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

ПАДАТАК НА ПРЫБЫТАК СПРОСЦІЦЦА З НАСТУПНАГА ГОДА

ЭКАНАМІЧНЫЯ інстытуты Беларусі плануюць у наступным годзе істотна паменшыць падатковы цяжар прадпрыемстваў і максімальна спрасціць падатковую сістэму, такім чынам зблізіўшы яе з падатковымі сістэмамі развітых краін свету, паведаміў учора начальнік упраўлення падатковай палітыкі і даходаў бюджэту Міністэрства фінансаў Беларусі Дзмітрый КІЙКО.

У наступным годзе плануецца скараціць адразу на дзве пазіцыі колькасць абавязковых плацяжоў. Запланавана адмяніць падатак на паслугі і збор на развіццё тэрыторый. Дадаткова да гэтых новаўвядзенняў прапануецца спрасціць экалагічны падатак праз адмену ў яго складзе трох абавязковых плацяжоў. Паводле падлікаў спецыялістаў, гэтыя мерапрыемствы дазволяць дадаткова пакінуць у эканоміцы прадпрыемстваў каля 720 млрд рублёў, што забяспечыць зніжэнне падаткавага цяжару на 0,4 працэнта да ВУП.

Галоўным напрамкам змяненняў у падатковым заканадаўстве ў наступным годзе стане іншая частата плацяжоў у бюджэт. Калі сёння юрыдычным асобам трэба плаціць падаткі штомесяц, а буйным прадпрыемствам — нават штотыдзень, то ў 2011 годзе гэты парадак аплаты прапануецца прынцыпова змяніць. Падаткі на прыбытак запланавана збіраць раз у квартал, а падатковую дэкларацыю падаваць адзін раз у год. Распрацоўшчыкі новаўвядзенняў прапануюць, каб больш падрабязную гадавую дэкларацыю на прыбытак арганізацыі падавалі ў сакавіку гэтага года з указаннем плануемай сумы прыбытку на ўвесь год. Тут плацельшчыку даецца права памылкі па вызначэнні прагназуемай сумы прыбытку не больш чым на 20 працэнтаў у той ці іншы бок. Зыходзячы з заяўленай сумы прыбытку, падатак будзе надалей аплачвацца штоквартальна ў памеры адной чвэрці ад агульнай сумы плацяжу. Такая сістэма будзе цалкам адпавядаць сусветнай практыцы выплаты і адміністраванню падатку на прыбытак. Менавіта пасля гэтага арганізацыі будуць вызваленыя ад неабходнасці вядзення бягучага падатковага ўліку па прыбытку. З першых дзён 2011 года будуць цалкам адмененыя авансавыя плацяжы па ПДВ і акцызах. Сёння гэта каля 6 дадатковых плацяжоў у месяц.

Налета плануецца вызваляць прыбытак ад падатку непасрэдна па факце ажыццяўлення на гэтую суму інвестыцый капітальных укладанняў без прывязкі да амартызацыйнага фонду. Застанецца адзінае абмежаванне, калі льготнае падаткаабкладанне будзе распаўсюджвацца толькі на фінансавыя сродкі ў памеры да 50 працэнтаў уласнага прыбытку прадпрыемстваў.

Гэтыя змены айчыннага падатковага заканадаўства павінны істотна палепшыць пазіцыю Беларусі ў рэйтынгу Сусветнага банка па лініі падаткаабкладання і дазволяць нашай краіне трапіць у першую трыццатку дзяржаў па агульных умовах вядзення бізнэсу.

Адказваючы на пытанні журналістаў Дзмітрый Кійко паведаміў, што з верасня падаражэе гарэлка і цыгарэты. З першых дзён восені запланавана павялічыць стаўкі акцызаў на алкагольныя вырабы і тытунёвую прадукцыю.

Экспертамі міністэрства падрыхтаваныя дакументы, згодна з якімі ў верасні стаўкі акцызаў на алкаголь будуць павялічаны на 10 працэнтаў, а на тытунёвыя вырабы яшчэ больш — да 20 працэнтаў.

Дзмітрый Кійко адзначыў, што наша краіна вымушана пайсці на гэты крок, бо існуе дамоўленасць з Міжнародным валютным фондам пра неабходнасць павелічэння ставак гэтых акцызаў у межах праграмы «стэнд-бай». Акрамя таго, у нашай краіне дзейнічае дзяржаўная праграма па пераадоленні п'янства і алкагалізму, дзе прадугледжана даволі істотнае павелічэнне (летась і сёлета) ставак акцызаў на алкагольныя тавары і тытунёвую прадукцыю.

Сяргей КУРКАЧ.

Свая справа

ЛІЛЕІ Ў РОСКВІЦЕ

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Там, дзе ў звычайных людзей агарод, у Ганны і Васіля Французёнкаў — кветкавая плантацыя. Замест бульбы і агуркоў — поле з лілеямі. Эфектныя гатункі, пяшчотныя фарбы, фантазійныя пахі — падобныя на вытанчаную парфуму, усходні водар, скрозь які нібыта прабіваюцца лясныя ландышы.

СТАР. 4

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
Цептер Банк

ЗАО «ЦЕПТЕР БАНК»
Адрес: 220034, ул. Платонова, 1Б, г. Минск
эл. адрес: info@zepterbank.by.
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 г.

ЗАО «Цептер Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2010	01.07.2009
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	2 015,7	548,9
3	Средства в Национальном банке	1102	3 369,2	1 972,6
4	Ценные бумаги:	1103	18 094,6	9 707,5
	для торговли	11031	16 584,5	1 346,4
	удерживаемые до погашения	11032	-	-
	в наличии для продажи	11033	1 510,1	8 361,1
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	17 079,2	38 403,1
6	Кредиты клиентам	1106	44 001,7	8 403,4
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	-	-
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	8 378,7	1 198,6
9	Прочие активы	1109	1 373,2	579,1
10	ИТОГО активы	110	94 312,3	60 813,2
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	-	1,2
13	Кредиты и другие средства банков	1205	5 511,4	1 990,9
14	Средства клиентов	1206	27 607,9	13 200,2
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	7 385,6	-
16	Прочие обязательства	1209	1 082,6	1 084,6
17	ВСЕГО обязательства	120	41 587,5	16 275,7
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	42 030,0	36 000,0
20	Эмиссионный доход	1212	-	-
21	Резервный фонд	1213	2 101,5	131,8
22	Накопленная прибыль	1214	8 556,3	8 420,4
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	37,0	(-14,7)
24	ВСЕГО капитал	121	52 724,8	44 537,5
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	94 312,3	60 813,2
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	36 405,5	1 697,5
28	Обязательства	1302	16 530,1	341,6

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ с 1 января 2010 г. по 30 июня 2010 г.

ЗАО «Цептер Банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.01.2010-30.06.2010	01.01.2009-30.06.2009
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	6 070,9	2 165,0
2	Процентные расходы	2012	1 039,9	239,6
3	Чистые процентные доходы	201	5 031,0	1 925,4
4	Комиссионные доходы	2021	386,5	59,3
5	Комиссионные расходы	2022	91,6	26,7
6	Чистые комиссионные доходы	202	294,9	32,6
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	706,5	10 678,9
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	14,4	7,3
9	Доход в форме дивидендов	205	-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	214,2	229,9
11	Прочие доходы	207	0,2	-
12	Операционные расходы	208	3 792,6	2 486,0
13	Прочие расходы	209	321,4	52,0
14	Налог на прибыль	210	218,8	2 183,8
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	1 500,0	7 692,5

Председатель Правления **Дворников Игорь Андреевич**

Главный бухгалтер **Нестерова Галина Чеславовна**

Дата подписания «14» июля 2010 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь от 13 ноября 2008 года № 31 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214 БИК 153001820

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.07.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲1 долар ЗША	2 985,00	1 чэшская крона	151,36
▼1 еўра	3 850,05	1 польскі злоты	932,73
1 латвійскі лат	5 410,55	▲1 расійскі рубель	98,17
1 літоўскі літ	1 111,55	1 украінская грыўня	377,94

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,4059
10 UAH	38,4982
1000 BYR	10,1896
EUR	39,2145

Агенцтва Уладзіміра Грыцова

Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям ЧС па акадэмічным веславанні сярод спартсменаў да 23 гадоў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам і гасцям чэмпіянату свету па акадэмічным веславанні сярод спартсменаў да 23 гадоў.

«Упершыню ў сваёй гісторыі Беларусь прымае моладзевыя спаборніцтвы весляроў акадэмічнага стылю такога ўзроўню. І мы ў поўнай меры заслужылі гэты высокі гонар і давер міжнароднай супольнасці. У нашай дзяржаве, без перабольшання, пануе культ здароўя і фізічнай культуры, а любоў да спорту з'яўляецца сапраўды ўсенароднай. За гады незалежнасці Беларусь выхавала нямала вялікіх спартсменаў і ўпэўнена ўвайшла ў лік алімпійскіх дзяржаў», — гаворыцца ў прывітанні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў нашай краіне ўведзены ў строй шэраг новых, створаных па апошнім слове тэхнікі, спартыўных аб'ектаў, прыдатных для правядзення самых прэстыжных чэмпіянатаў. Сярод іх — цудоўны канал у Брэсце, дзе ў мінулым годзе спаборнічалі лепшыя майстры вясла Еўропы, а ў гэтым будуць спаборнічаць больш за паўтары тысячы маладых весляроў з 59 краін свету.

«Няхай жа беларуская вада закіпае ад напружання высакароднага захаплення, а сумленная і бескампрамісная барацьба прынясе перамогу наймацнейшаму. Жадаю ўдзельнікам спаборніцтва невычэрпнай энергіі і сілы духу, веры ў сябе, вытрымкі, настойлівасці і ўдачы, балельшчыкам — радасці за поспехі любімых камандаў і ўсім вам — моцнага здароўя, шчасця і святочнага настрою», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У БЕЛАРУСІ ПРЫ ПРОДАЖЫ АБ'ЕКТАЎ ДЗЯРЖМАЁМАСЦІ ДАРАЖЭЙШАЙ ЗА 10 ТЫС. БАЗАВЫХ ВЕЛІЧЫНЯЎ БУДЗЕ ДАВАЦЦА РАСТЭРМІНОЎКА

У Беларусі ўдасканалены парадак прыняцця рашэнняў аб перадачы ў арэнду (узгадненні перадачы ў субарэнду), у бязвыплатнае карыстанне дзяржаўнай маёмасці, непасрэдна замацаванай за рэспубліканскімі органамі дзяржкіравання і іншымі дзяржарганізацыямі, падпарадкаванымі ўраду, дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі, падпарадкаванымі Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, адміністрацыямі свабодных эканамічных зон. Устанаўліваецца таксама парадак растэрміноўкі плацяжоў пры адчужэнні аб'ектаў дзяржаўнай нерухомай маёмасці. Гэта прадугледжана ўказам № 367 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях распараджэння дзяржаўнай маёмасцю», які падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Указам прадугледжваецца прадастаўленне растэрміноўкі плацяжоў на тэрмін не большы за адзін год пры продажы будынкаў, збудаванняў, памяшканняў, незавершаных збудаванняў, устройстваў, кошт якіх перавышае 10 тыс. базавых велічыняў, з дня заключэння дагавора куплі-продажу са штомесячнай індэксацыяй плацяжоў.

Пры гэтым права ўласнасці на маёмасць пры аплаце яе ў растэрміноўку пераходзіць да пакупніка з моманту перадачы яму незавершанага незаконсерваванага капітальнага збудавання пасля дзяржаўнай рэгістрацыі права ўласнасці на капітальнае збудаванне, ізаляванае памяшканне. З моманту ўзнікнення права ўласнасці ў пакупніка і да поўнага выканання ім абавязацельстваў па аплаце маёмасці, прададзенай з растэрміноўкай аплаты, гэта маёмасць знаходзіцца ў залогу ў прадаўца для забеспячэння выканання пакупніком абавязку па аплаце яе кошту.

Дзяржкаммаёмасць надзяляецца паўнамоцтвамі на прыняцце рашэнняў па распараджэнні дзяржаўнай маёмасцю, кошт якой не перасягае 5 тыс. базавых велічыняў. Дэлегаванне паўнамоцтваў Дзяржкаммаёмасці дасць магчымасць больш аператыўна прымаць рашэнні па адчужэнні маёмасці, што не выкарыстоўваецца дзяржавай.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У ЛІДЗЕ ЎЗВОДЗЯЦЬ ТРАСУ ЗДАРОЎЯ

Лыжаролерную трасу, якая размешчана ў лесапаркавай зоне каля Кургана Бяссмяротнасці, плануецца здаць да паслуг аматараў актыўнага адпачынку ў верасні, паведамляе афіцыйны сайт Лідскага райвыканкама.

Працягласць трасы здароўя — прыкладна паўтара кіламетра, са спускам і пад'ёмам, а таксама з мастамі ў двух пунктах, прычым можна праехаць і па іх, і пад імі. Уздоўж трасы будзе пракладзена дарожка для кросавых забегаў, установяць шмат спартыўнага абсталявання. Будуецца і пункт пракату інвентару, для якога раённы аддзел па фізічнай культуры, спорце і турызме ўжо закупіў веласіпеды, ролікавыя канькі, лыжаролеры і скейтборды, будуць і лыжы для катання зімой. У перспектыве побач з трасай мяркуецца абсталяваць пляцоўку для экстрэмальных відаў спорту.

НАСУПЕРАК СТЫХІІ

Паводле інфармацыі з Гродзенскага аблсельгасхарча, пасля ўрагану з градам, што пранёсся па тэрыторыі вобласці, у шэрагу раёнаў значна пашкоджаныя сельгаскультуры.

Напрыклад, на Лідчыне пашкоджанне і гібель раслін зарэгістраваныя на плошчы 4718 гектараў (13 працэнтаў), у Воранаўскім раёне — 5785 гектараў (15 працэнтаў). Стыхія таксама пакінула свой след у Дзятлаўскім, Шчучынскім, прыняла да палегласці хлябоў у Смаргонскім, Бераставіцкім, Гродзенскім і іншых раёнах. Тым не менш хлебаробы Прынямоння не панікуюць і зробяць усё, каб выканаць галоўную задачу — завяршыць жніво ў максімальна кароткія тэрміны.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Абзац

◢ У Віцебскім раёне з-за пажаранебяспечнай сітуацыі ўведзеная забарона на наведванне лясоў. Акрамя Віцебскага, складаная сітуацыя па пажарах адзначаецца ў Сенненскім, Полацкім, Лепельскім, Докшыцкім і Аршанскім раёнах.

◢ **У аўтамабільнай аварыі ў Крыме загінула грамадзянка Беларусі. Таксама пацярпелі 5 чалавек — двое грамадзян Беларусі і трое — Расіі, у тым ліку двое дзяцей. З траўмамі розных ступеняў цяжкасці яны шпіталізаваныя. Жыхар Мінска на аўтамабілі Peugeot рухаўся па аўтадарозе Херсон — Феадосія ў напрамку Феадосіі. Па нявысветленых прычынах ён выехаў за межы праезнай часткі, пасля чаго аўтамабіль занесла. Машына апынулася на паласе сустрэчнага руху і сутыкнулася з аўто Toyota RAV-4, у якім ехала расійская сям'я. Ад сутыкнення абодва аўтамабілі выкінула за межы праезнай часткі. Прычыны і падрабязнасці ДТЗ высвятляюцца.**

◢ У Гродне на пешаходным пераходзе кіроўца таксі наехаў на мужчыну, які ад атрыманых траўмаў памёр на месцы.

◢ **У Докшыцкім раёне бабуля ледзь не зарэзала 8-гадовага ўнука. Напярэдадні вечарам пасля ўжывання алкаголю 59-гадовая жанчына вырашыла ўціхамірыць трох сваволнікаў-унукаў, якіх пакінулі ёй на летнія вакацыі. Якім чынам яна гэта зрабіла, высвятляецца, але ў выніку адзін з хлопчыкаў з сур'ёзным нажавым раненнем грудзей трапіў у бальніцу. Дактарам давялося ў тэрміновым парадку прааперыраваць хлопчыка, дастаўленага з пашкоджаннем межрэбернай артэрыі і лёгкіх. Зараз малы знаходзіцца ў рэанімацыі, пагрозы для яго жыцця няма. Дапамога медыкаў спатрэбілася і яго бацькам, якія атрымалі шок ад выпадку.**

◢ На 94-м годзе жыцця ў сераду памёр былы генеральны сакратар кампартыі Чылі Луіс Карвалан.

Поўны абзац

◢ **У гандлёвым цэнтры кітайскага горада Шыньян адчынілася адмысловая «крама супакаення» для жанчын. У ёй можна разбіваць бейсбольнымі бітамі хатні рыштунак. Памяшканне раздзеленае на дзве паловы — гасцёўню і спальню, у якіх знаходзяцца канапы, дываны, тэлевізары. Усе прадметы сапраўдныя. Для большай рэалістычнасці (альбо проста з эканоміі) іх купляюць патрыманымі. Уладальнік крамы кажа, што яго наведвальніцы павінны адчуваць сябе «як дома». З той толькі розніцай, што тут можна ўсё патрушчыць. Мужчын у краму чамусьці не пускаюць. Відаць, уладальнікі лічаць, што ў іх нервовая сістэма больш трывалая.**

◢ Сямейную пару са шведскага горада Нэсшэ аштрафавалі за тое, што яна да гэтага часу афіцыйна не зарэгістравала імя свайго 16-месячнага дзіцяці. Згодна са шведскімі законамі, дзіця павінна атрымаць імя не пазней чым праз 3 месяцы пасля нараджэння. Хлопчык нарадзіўся яшчэ ў сакавіку мінулага года, праз 3 месяцы бацькі не прыйшлі яго рэгістраваць, і ім прыслалі напамінак. Ён таксама застаўся без увагі. У выніку было вырашана аштрафаваць бацькоў на 6 тыс. шведскіх крон (каля 820 долараў).

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ВУП БЕЛАРУСІ ЗА 2011—2015 ГАДЫ ПАВІНЕН ПАВЯЛІЧЫЦЦА Ў 1,6 РАЗА

Тэмп росту валавога ўнутранага прадукту Беларусі за перыяд 2011—2015 гадоў павінен скласці 162—168 працэнтаў. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі ўчора на пасяджэнні рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні чацвёртага Усебеларускага народнага сходу, перадае БЕЛТА.

У аснове павышэння валавога ўнутранага прадукту, на думку прэм'ер-міністра, павінна быць маштабная паскораная мадэрнізацыя эканомікі, а таксама стварэнне новых прарыўных напрамкаў. Гэта прадыктавана тым, што ў рэспубліцы не шмат сыравінных рэсурсаў. Эканоміка вельмі залежыць ад імпарту энерганосьбітаў, сыравіны. «Рэчаіснасць вядзе да таго, каб жыць за кошт высокай кваліфікацыі, інтэлекту спецыялістаў, развіцця маларэсурсаёмістых высокатэхналагічных вытворчасцяў з высокай доляй дабаўленай вартасці», — сказаў Сяргей Сідорскі.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што на першае месца ў бліжэйшыя 5 гадоў урад будзе ставіць якасныя паказчыкі развіцця эканомікі. «Гэта перш за ўсё рэнтабельнасць продажаў, тэмпы росту прадукцыйнасці працы, экспарт тавараў і паслуг», — растлумачыў ён.

Беларусь мае намер за пяць гадоў павялічыць аб'ём прамых замежных інвестыцый да $7 млрд у год, заявіў Сяргей Сідорскі.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, у праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на наступныя 5 гадоў закладзены важнейшы паказчык па прыцягненні інвестыцый на чыстай аснове. «Гэты паказчык пастаянна знаходзіцца на ўзроўні $1-1,5 млрд, што, на жаль, недастатковa для эфектыўнага развіцця эканомікі. Мы ўпершыню ўводзім паказчык прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове ў аб'ёме да $7 млрд штогод», — сказаў Сяргей Сідорскі. Гэта дасць магчымасць у наступныя 5 гадоў забяспечыць тэмп росту рэальных грашовых даходаў насельніцтва 170—176 працэнтаў, у тым ліку ў Венесуэле, Іране, у суседніх краінах. Прадугледжваецца таксама развіццё інвеставання перспектыўных азіяцкага і афрыканскага напрамкаў.

Акрамя праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011—2015 гады, трэба будзе таксама распрацаваць канкрэтныя пяцігадовыя праграмы міністэрстваў і ведамстваў. Сяргей Сідорскі асабліва выдзеліў дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця на наступныя 5 гадоў. Паводле яго слоў, фінансаванне навуковых даследаванняў і распрацовак будзе павялічана ў 6,5—7 разоў. «Гэта каласальная задача. Мы дадзім у навуку рэсурсы, якія павінны актыўна, у дзясяткі разоў павялічыцца і перайсці ў рэальную эканоміку краіны», — дадаў ён.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, праект асноўных палажэнняў праграмы можа быць прыняты на наступным тыдні, а далей урад пачне падрыхтоўку самой праграмы.

Ірына НАРКЕВІЧ, намеснік міністра гандлю:

«Мы ідзём да сусветнай практыкі сезонных распродажаў»

Як заявіла на прэс-канферэнцыі намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ, Беларусь набліжаецца да еўрапейскай практыкі сезонных распродажаў: 10 працэнтаў на пачатку сезона, 30 працэнтаў — у сярэдзіне і 50 працэнтаў — пад канец.

Беларусы, што вярнуліся з еўрапейскага шопінгу, з сумам зазіраюць у аддзелы адзення і абутку ГУМа, ЦУМа і іншых універмагаў сталіцы і іншых гарадоў Беларусі. Што і казаць, калі скураныя боты ўлетку тут каштуюць столькі ж, як і зімой, а асноўныя зніжкі — 5—10 працэнтаў. Аднак спадарыня Наркевіч упэўненая, што ў хуткім часе сітуацыя зменіцца да лепшага.

— Сусветная практыка гандлю — гэта зніжкі 10 працэнтаў у пачатку сезона, у сярэдзіне — 30 працэнтаў і дзесьці да 50 — пад канец. Як правіла, 70—90 працэнтаў — гэта ўжо самы апошні тавар. Мы сёння да гэтага набліжаемся, — кажа Ірына Наркевіч. — Цяпер нашы таваравытворцы пачынаюць гэты працэс. Вы ўжо бачыце сезонныя зніжкі. Тут, безумоўна, варта разумна выбудаваць коштавую палітыку і з боку вытворцы і з боку прадаўца. Працаваць трэба ў межах пагадненняў. І калі на гэтыя пагадненні будуць ісці і вытворца, і прадавец, то, бясспрэчна, працэнт зніжкі павялічыцца. І сёння крамы кшталту ГУМа, ЦУМа і г.д. важныя, таму што ў іх шырокі асартымент. Цяпер ідзе рэканструкцыя прадпрыемстваў, будзе павялічана зона самаабслугоўвання і г.д. Літаральна праз паўгода мы ўбачым, як гэтыя крамы пераўтворацца.

А наконт зніжак, то яны ёсць і ў ГУМе. Мяне ўразіла акцыя ГУМа да 65-годдзя Перамогі, калі для ветэранаў была зніжка ў 65 працэнтаў. Гэта была самая вялікая зніжка. І вельмі сімвалічная.

На пытанне, чаму кошты на сярэдняе па еўрапейскіх мерках адзенне і абутак у Беларусі ў два, а то і ў тры разы вышэйшыя, Ірына Наркевіч адказала, што адна з прычын — ненасычанасць гэтага сегменту беларускага рынку.

— Я думаю, што як толькі наш рынак будзе насычаны гэтымі таварамі, напэўна, адбудзецца зніжэнне коштаў, — патлумачыла спадарыня Наркевіч. — Магчыма, гэтая з'ява назіраецца і з-за адсутнасці канкурэнцыі. Паколькі ў нас свабоднае цэнаўтварэнне, калі няма дастатковай канкурэнцыі, то крамы могуць кошты і павялічыць. А дзе канкурэнцыя вышэйшая, там кошты могуць зніжацца. У нас няма ніякіх бар'ераў. Ёсць проста мытныя зборы і транспарціроўка.

Што датычыцца еўрапейскай брэндавай прадукцыі, то, па словах Ірыны Наркевіч, еўрапейскія брэнды прысутнічаюць на беларускім рынку. Гэта і Canali, і Reebook, і Adidas, таксама SASH і іншыя. Аднак актыўнасць іх не такая вялікая з прычыны нізкай плацежаздольнасці насельніцтва.

— Цяпер ідзе працэс лібералізацыі і інвестыцыйнай прыцягальнасці. Гэта ўсё зробіць сваю справу, — перакананая спадарыня Наркевіч. — Я лічу, што пакуль мы ў працэсе гэтых пабудоў. Таму такая сітуацыя з брэндамі — гэта нармальна.

Настасся ЗАНЬКО.

Навіны сталіцы

ЗА КВАТЭРУ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ

Сёлета ў сувязі з вялікай запазычанасцю па аплаце жыллёва-камунальных паслуг жыхары сямі кватэр, згодна з рашэннем суда, былі пераселены ў жыллё меншай плошчы, а адзін мінчанін зусім пазбавіўся жылля.

Як паведамілі ў ГА «Минская гарадская жыллёвая гаспадарка», спіс патэнцыйных перасяленцаў значна шырэйшы. Так, за студзень—чэрвень гэтага года жыллёвыя службы падалі ў суд 188 іскаў аб перасяленні ў кватэры меншай плошчы і 9 — аб высяленні без выдзялення іншага жылля. Калі ў першым выпадку прычынай для звароту ў суд з'яўляецца вялікая запазычанасць, то ў другім, згодна з артыкулам 39 Жыллёвага кодэкса, — яшчэ і парушэнне правілаў карыстання жылым памяшканнем.

Гэта датычыцца толькі наймальнікаў дзяржаўных кватэр. Большасць жа неплацельшчыкаў (на сёння — 64,9 працэнта) — уласнікі жылля. Дзейнае заканадаўства не дазваляе іх перасяліць або выселіць. Аднак у праекце новага Жыллёвага кодэкса прадугледжана, што ў выпадку ўзнікнення вялікай запазычанасці прыватызаваная кватэра, згодна з рашэннем суда, можа быць прададзена з аўкцыёну, а частка выручаных сродкаў накіравана на пагашэнне доўгу. Суму, што застанецца, вернуць ужо былому ўладальніку жылля, якой ён зможа распарадзіцца па сваім рашэнні.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, *«Мінск-Навіны»*.

Стыхія

Ці шкодзіць гарачыня бульбе?

Гарачае надвор'е ў Беларусі пагоршыла ўмовы фарміравання ўраджаю бульбы і цукровых буракоў, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Вельмі гарачае надвор'е прыкметна паскорыла выспяванне збожжа. Высокія тэмпературы паветра садзейнічаюць яго прасыханню. Гэта дало магчымасць прыкладна на паўтара тыдня раней, чым летась, пачаць масавую ўборку збожжавых. Разам з тым анамальная спёка прывяла да зніжэння запасу вільгаці ў глебе, асабліва на ўсходзе і паўднёвым усходзе краіны. Пагоршыліся аграметэаралагічныя ўмовы для фарміравання ўраджаю бульбы, цукровых буракоў, іншых караняплодаў, адрастання траў на сенажацях і пашы. Так, тэмпература глебы на глыбіні 10 см у большасці раёнаў рэспублікі складае плюс 26-30 градусаў, што на 10-12 градусаў вышэй за аптымальную для ўтварэння і росту клубняў бульбы (плюс 16-18 градусаў).

Месцамі ў Гомельскай вобласці ўжо назіраецца пажаўценне і скручванне ад засухі лісця кукурузы, пачалося засыханне траў. Пры такім надвор'і ва ўмовах палівання найбольш спрыяльна адчувае сябе цеплалюбівая агародніна, асабліва памідоры.

Тэмпература вады ў вадаёмах рэспублікі павысілася і складае на рэках басейнаў Заходняй Дзвіны, Нёмана, Заходняга Буга плюс 23—26 градусаў. Крыху халаднейшая яна ў вадаёмах на захадзе і паўночным захадзе, у Вілейскім вадасховішчы. А на ўсходзе тэмпература вады ў рэках дасягае экстрэмальных значэнняў, Напрыклад, у Дняпры каля Лоева на граніцы з Украінай яна складае плюс 29 градусаў. Гэта рэкордная значэнне тэмпературы вады для названага басейна, падкрэсліла Вольга Фядотава.

Напярэдадні

У БЕЛАРУСІ ПРОЙДЗЕ МОЛАДЗЕВЫ ЧЭМПІЯНАТ ЕЎРОПЫ ПА ВАЛЕЙБОЛЕ

У Мінскай гарадской ратушы адбылася жараб'ёўка фінальнай стадыі мужчынскага моладзевага чэмпіянату Еўропы па валейболе, які 28 жніўня — 5 верасня пройдзе ў Магілёве і Бабруйску, паведамляе БЕЛТА.

У турніры выступяць юнакі 1991 года нараджэння і маладзейшыя. Зборная Беларусі атрымала пропуск на першынство кантынента на правах гаспадароў.

На папярэднім этапе ўдзельнікі будуць падзелены на 2 групы:

1 (Бабруйск): Германія, Расія, Турцыя, Польшча, Галандыя, Бельгія;

2 (Магілёў): Францыя, Беларусь, Балгарыя, Сербія, Італія, Іспанія.

Па выніках папярэдняга этапу па дзве лепшыя каманды кожнай групы па сістэме плей-оф разыграюць медалі. Трэція і чацвёртыя каманды ў такіх матчах паспрачаюцца за пятае — восьмае месцы.

Зборная Беларусі папярэдні этап чэмпіянату Еўропы правядзе ў Магілёве на пляцоўцы спартыўнага комплексу «Алімпіец», які ўмяшчае 1500 гледачоў. Наша каманда пачне турнір матчам з Балгарыяй (28 жніўня), а потым сустрэнецца з Сербіяй (29 жніўня), Іспаніяй (30 жніўня), Італіяй (1 верасня) і Францыяй (2 верасня). Французы з'яўляюцца чэмпіёнамі Еўропы сярод юнакоў, сербы — чэмпіёны свету. Матчы другой папярэдняй групы пройдуць на «Бабруйск-арэне», якая ўмяшчае 7 тыс. гледачоў.

Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні ў сувязі са смерцю народнага артыста Беларусі Ігара Дабралюбава

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні родным і блізкім вядомага кінарэжысёра, народнага артыста Беларусі Ігара Дабралюбава ў сувязі з яго смерцю.

Ігар Дабралюбаў пакінуў прыкметны след у гісторыі айчыннай культуры. Знятыя ім цудоўныя фільмы для дарослых і дзяцей сталі сапраўднай класікай нацыянальнага мастацтва, яны карыстаюцца нязменным поспехам у гледачоў розных пакаленняў. Жыццё і творчасць Ігара Міхайлавіча — прыклад высокага прафесіяналізму і самаадданага служэння сваёй справе для ўсіх кінематаграфістаў краіны, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Светлая памяць пра знакамітага майстра беларускага кіно Ігара Міхайлавіча Дабралюбава будзе заўсёды з удзячнасцю захоўвацца на нашай зямлі», — гаворыцца ў спачуванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дзеля памяці

КРОКІ ПА ЗЯМЛІ ІГАРА ДАБРАЛЮБАВА

Славуты беларускі кінарэжысёр пайшоў у лепшы свет

РАЗВІТАЦЦА з Ігарам Дабралюбавым — выдатным рэжысёрам і прынцыповым, валявым чалавекам, можна будзе 22 ліпеня ў Доме кіно. Ён будзе пахаваны сёння на Маскоўскіх могілках сталіцы.

Як загартаваны спартовец рэжысёр Ігар Дабралюбаў змагаўся за будучыню да апошняга на сваёй дыстанцыі даўжынёй у 76 гадоў. Ігар Дабралюбаў быў загартаваны змагар: знаходзіў сілы на жыццё пасля інсультаў апошнія некалькі гадоў. Але ён за гады працы навучыўся выходзіць з самых складаных сітуацый, сцвярджаючы сваё права на творчасць у часы савецкай цэнзуры. Былі моманты, калі не вытрымлівала сэрца з-за няспраўджаных надзей, але пра перажытыя інфаркты забывалася, калі ішла гаворка пра магчымасць працы над новым фільмам, кожны з якіх папаўняў скарбонку беларускага кіно. Менавіта яго стужка «Іван Макаравіч» здабыла адну з ганаровых міжнародных узнагародаў — на кінафестывалі ў Венецыі. А фільм «Белыя росы» быў прызнаны ў 1997 годзе «камедыяй года».

Ігар Дабралюбаў на здымках фільма «Плач перапёлкі». 1989 год.

Фота з архіва БЕЛТА.

Сібірак па паходжанні, Дабралюбаў, дзіцем апынуўшыся ў разбуранай Беларусі, здолеў адчуць яе боль, разгадаць яе лёс і паверыць у будучыню. Можа таму героі яго фільмаў — цікавыя асобы, кожны з якіх па-свойму спасцігае таямніцы жыцця, пачынаючы з маленства: ці то вы пазнаёміцеся з прыгодамі Дзяніса Караблёва, то ці будзеце захапляцца мужным хлопчыкам Іванам Макаравічам, ці то ўбачыце таленавітых дзяцей з фільма «Расклад на паслязаўтра»... Дабралюбаў рабіў свае «Крокі па зямлі», для сябе зразумеў, што значыць «Шчаслівы чалавек» і быў шчырым, калі рабіў сваю справу, прызнаўшыся ў назве аднаго фільма: «Таму што люблю»... Фільмы часта мелі сімвалічныя назвы, па іх можна прасачыць этапы творчасці рэжысёра: усяго ён стварыў 17 выдатных карцін. Сярод іх былі і тыя, праз якія можна адчуць душу Беларусі — праз «Плач перапёлкі» ці «Белыя росы».

Беларусь ганарыцца гэтымі фільмамі — па іх можна зразумець, што значыць лепшае айчыннае кіно. Яны заўсёды застануцца фільмамі Дабралюбава, чалавека, які іх стварыў часта насуперак: вырашальную ролю ў іх з'яўленні зрабіла яго воля, яго настойлівасць і яго погляд. Як бы сёння ні цэнзарджалі, што аўтар у Савецкім Саюзе не меў правоў на свой прадукт, у цітрах заўсёды будзе пазначана: рэжысёр Ігар Дабралюбаў. І выкрасліць гэтае імя з гісторыі беларускага кіно немагчыма. Як немагчыма пазбавіць гэтага чалавека павагі шматлікіх гледачоў.

Смуткуем.

Ларыса ЦІМОШЫК і ўсе звяздоўцы.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает:

Лот № 1: Право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 240100000003006332 площадью 0,1687 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Медицинская, для строительства объекта «Торговый объект по улице Медицинской в микрорайоне «Медцентр» в г. Витебске», срок аренды 25 лет, опубликованный в информационном сообщении о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в газете «Звязда» от 26 июня 2010 г. № 123 (26731), снимается с торгов согласно решению Витебского городского исполнительного комитета.

Сумма задатка, внесенная участниками аукциона на счет городского исполнительного комитета, подлежит возврату им в течение 5 рабочих дней со дня отказа местного исполнительного комитета от проведения аукциона.

Приносим свои извинения.

Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, vitinvest.biz.

Антикризисный управляющий ОДО «ОВИЯ» ПРОДАЕТ СЛЕДУЮЩЕЕ ИМУЩЕСТВО ДОЛЖНИКА:

сейфы с кодовым замком — 2 шт. всего за 627 815 руб.; **телевизор «Горизонт»** — 1 шт. за 82 765 руб.; **вакуумная установка** — 1 шт. за 1 206 519 руб.; **автомашина Шкода-Фелиция** — 1 шт. за 215 000 руб. УНП 100008753

ПА ПОЎДНІ ЗНОЎ ГУЛЯЕ ВЕЦЕР

Чатыры раёны пацярпелі ад моцнага ветру, які прайшоўся па поўдні Гомельскай вобласці.

У Брагінскім, Петрыкаўскім, Калінкавіцкім і Гомельскім раёнах пацярпела 6 населеных пунктаў. Ад многіх шыферных дахаў засталося толькі смецце. Пашкоджана 13 жылых дамоў і 28 сельскагаспадарчых будынкаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У АВАРЫІ ПАЦЯРПЕЛІ ТРЫ АЎТАМАБІЛІ

20 ліпеня ўдзень у Магілёве на вуліцы Першамайскай сутыкнуліся два «Мерседэсы» і адзін «Рэно». Паводле інфармацыі ДАІ, 28-гадовы вадзіцель «Мерседэса» не справіўся з кіраваннем, выехаў на сустрэчную паласу і ўдарыўся ў «Рэно», якім кіравала 30-гадовая жанчына. Пры сутыкненні «Рэно» зачапіла яшчэ адзін «Мерседэс», які ехаў за ім. У выніку вадзіцель «Рэно» атрымала траўмы: жанчыну шпіталізавалі ў аддзяленне нейрахірургіі бальніцы хуткай дапамогі. Што стала прычынай аварыі — цяпер высвятляе праверка.

Ілона ІВАНОВА.

Фота Магілёўскай ДАІ.

САБАКА ЗНАЙШОЎ КУРЭЙ

У жыхаркі в. Медна (Брэсцкі раён) нехта выкраў уначы 8 курэй — вырваў прабой і залез у хлеў.

Аператыўная група прыехала са службовым сабакам, які хутка ўзяў след і прывёў міліцыянераў да беспрацоўнага з гэтай жа вёскі. Злодзея затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЛІТВЕ ПРЫТУЛАК ШУКАЮЦЬ РАСІЯНЕ І АФГАНЦЫ

Паводле апошніх звестак еўрапейскага статыстычнага агенцтва Eurostat, у першым квартале гэтага года ў Літве прытулак шукалі 95 грамадзян замежных дзяржаў, з іх 30 — гэта грамадзяне Расіі, 20 — Афганістана, 10 — В'етнама, па 5 — Грузіі і Шры-Ланкі.

Пры гэтым рашэнні літоўскіх дзяржструктур першай інстанцыі былі прынятыя па 30 заяўках, статус уцекача не быў нададзены ніводнаму з заяўнікаў.

Да ўладаў Латвіі з просьбай аб прытулку за гэты перыяд звярнулася 10 чалавек, у Эстоніі — 5. Галоўным чынам гэта былі грамадзяне Афганістана.

У першым квартале 2010 года прытулак у краінах ЕС часцей за ўсё прасілі грамадзяне Афганістана (5300), Расіі (4400), Ірака (4000), Самалі (3600) і Сербіі (3200).

Самымі папулярнымі сярод краін ЕС былі Францыя (9300 зваротаў), Германія (8100) і Вялікабрытанія (7000). Статус уцекача Германія надала ў 1670 выпадках, Францыя — у 1160, Вялікабрытанія — у 1000.

Што да расіян, то ў першым квартале гэтага года часцей за ўсё яны прасілі прытулак у Францыі (32% ад агульнай колькасці заяўнікаў), Польшчы (23%), Бельгіі (13%), Аўстрыі (10%), і Германіі (7%).

У ЯЛЦЕ, СУДАКУ І СЕВАСТОПАЛІ ЗАКРЫЛІ ПЛЯЖЫ



Санэпідстанцыя Украіны правяла праверкі крымскіх пляжаў, пасля якіх у шэрагу курортных гарадоў купанне было часткова забаронена. Як паведамляе ІА «Новы рэгіён», прэтэнзіі эпідэміёлагаў выклікалі пляжы Ялты, Судака, Вялікай Алушты і Севастопаля.

У Ялце забаронена купацца ў чатырох месцах. У пастанове СЭС згаданы пляж гасцініцы «Арэанда», «Прыморскі», «Боўлінг-лета» і пляж турысцказдараўленчай кампаніі «Левант». Акрамя таго, вада з рэк, якія працякаюць па Ялце, прызнана залішне бруднай.

У Севастопалі забаронены два з васьмі месцаў для купання — «Амега» і «Крыштальны».

У Судаку санэпідстанцыя зачыніла пляж санаторыя Міністэрства абароны Украіны.

У мястэчках Рыбацкае, Маларэчанскае і Сонечнагорскае (Вялікая Алушта) забаронена купанне на камунальных пляжах агульнага карыстання.

Масавае закрыццё пляжаў па Крыме ў Ялце выклікала панічныя чуткі пра нібы выяўленую ў вадзе халеру, аднак гэтая інфармацыя пакуль не пацвердзілася.

ЛЯТАЦЬ РАСІЙСКІМІ РЭЙСАМІ НЕБЯСПЕЧНА, ПАПЯРЭДЗІЛІ ПІЛОТЫ

Сітуацыя з бяспекай пасажырскіх авіяперавозак і са станам расійскага авіяпрама дайшла да крытычнай рысы, пасля якой — непазбежныя катастрофы з чалавечымі ахвярамі, піша газета «Маскоўскі камсамолец» са спасылкай на некалькі лётчыкаў «найбуйнейшай расійскай авіякампаніі», якія распавялі пра сітуацыю ў галіне, не хаваючы сваіх імёнаў.

Паводле слоў пілотаў, ва ўсім расійскім авіяпарку лятаюць толькі шэсць далёкамагістральных айчынных самалётаў «Іл-96-300». Пры гэтым такія самалёты, як сцвярджаюць лётчыкі, на парадак больш бяспечныя, чым патрыманыя Boeing і Airbus, якія часта выкарыстоўваюцца ў Расіі.

У Расіі да палёту дапускаюць самалёты, у якіх да 20 неліквідаваных адмоў, «якія не ўплываюць на бяспеку», бо доўга даводзіцца чакаць запчастак, адзначаюць лётчыкі. Акрамя таго, паводле слоў пілотаў, практычна разбурана сістэма падрыхтоўкі пілотаў. Другім пілотам на Boeing саджаюць лётчыкаў, якія толькі што скончылі лётнае вучылішча, тады як раней на лайнеры дапускаліся толькі пілоты 1 класа. Цяпер ужо каля паўгода градацыю на класы адмянілі. Большая ўвага надаецца вывучэнню англійскай мовы, чым лётнай справы, а прафесійная вучоба зведзена да самападрыхтоўкі — лётчыку выдаюцца дыскі, па якіх ён вучыцца самастойна.

Нормы для лётчыкаў увесь час павялічваюць — стомленыя пілоты засынаюць проста ў небе. У СССР, калі распрацоўкай нормаў займаліся адмысловыя інстытуты, для лётчыкаў «Іл-86» і «Іл-96» яна складала 67-70 гадзін, не больш. Цяпер — 80 гадзін. Аднак намеснік міністра транспарту Кароль падпісаў дакумент, дзе прапанаваў правесці даследаванне-эксперымент прама падчас палётаў і высветліць, ці нельга гэтую норму павялічыць да 90 гадзін, сцвярджаюць пілоты. Яны распавялі, што паўгода назад экіпаж Airbus, які вылецеў з «Шарамецьева», проста заснуў у палёце. Самалёт ішоў на аўтапілоце, пакуль дыспетчары крычалі, спрабуючы дабудзіцца лётчыкаў. І гэта не прывяло да пераглядаў нормаў.

Паводле словаў лётчыкаў, хоць страйкі на транспарце забароненыя, рэальная сітуацыя, калі амаль усе лётчыкі разам не прымуць рашэнні на вылет.

ТЭРАКТ СПЫНІЎ ГЭС

**Раніцай у сераду на Баксанскай ГЭС у Каб

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

22 ліпеня 2010 г. № 26 (220)

ДАЧЫ — грошы рэгіёнаў

Адлегласць ад Мар'інай Горкі да сталіцы складае крыху больш за шэсць дзясяткаў кіламетраў, прычым гэты шлях значна «скарачаюць» добрыя аўтобусныя зносіны, і што не менш важна — электрычка. Нездарма сам Пухавіцкі раён традыцыйна лічыцца «дачным» — кожнае лета рэальная колькасць яго насельніцтва ўзрастае амаль на трэць.

Ад таварыства і да вёскі

На тэрыторыі раёна налічваецца 183 садаводчыя таварыствы, што аб'ядноўваюць больш за 22 тысячы чалавек. Дзеля справядлівасці, гэты варыянт — ужо не такі папулярны. Усё больш гараджан, і перш-наперш жыхароў Мінска, лічаць за лепшае набыць звычайны дамок у вёсцы. Іх кошты, асабліва ў «прысталічнай» зоне, даходзяць да 40 тысяч «умоўных адзінак». Зрэшты, многія ўсё ж ідуць крыху іншым шляхам: купляюць больш сціплыя і больш танныя хаты — з тым, каб надалей перабудаваць іх на свой густ. Але і ў першым, і ў другім выпадку «вясковыя дачнікі» імкнуцца рабіць выбар на карысць населеных пунктаў з інфраструктурай — як мінімум, у сферу інтарэсаў уваходзяць крама і комплексны прыёмны пункт.

— Ёсць вёскі, дзе мясцовае насельніцтва ўжо апынулася ў меншасці, прычым сёй-той з дачнікаў па сутнасці жыве ў нас ці не цэлы год, — распавядае **старшыня Пухавіцкага райсавета Юрый ШАПАВАЛАЎ**. — Але бывае, што пастаяннымі жыхарамі становяцца і некаторыя садаводы ў таварыствах, як правіла, гэта людзі, што выйшлі на пенсію. Прычым падобных прыкладаў нямала — асобныя таварыствы ўжо нават ставяць пытанне аб наданні ім статусу вёскі.

Адкуль бяруцца крамы?

Амаль усе садаводы ў таварыствах — зноў жа мінчане. Магчыма, адсюль і даволі высокія патрабаванні да ўзроўню інфраструктуры. Варта заўважыць, што гэтыя патрабаванні цалкам нармальныя. Адно, што выканаць усе просьбы адразу атрымліваецца не заўсёды. Праблема той жа дарогі — справа нятанная. А значыць, і «расцягнутая» ў часе.

— Па магчымасці мы ідзём таварыствам насустрач, многія з іх ужо маюць і газ, і ваду, — адзначае Юрый Шапавалаў. — Але ці не ўсё тут залежыць ад таго, як у таварыстве працуе старшыня. Калі старшыня актыўны, ён заўсёды напіша ліст у райвыканкам з просьбай вырашыць тое ж «гандлёвае» пытанне. А ў сваю чаргу райвыканкам або дапаможа «пашукаць» індывідуальнага прадпрымальніка, які паставіць для дачнікаў кіёск, або забяспечыць аўтакрамай. Такім чынам, варыянты ёсць. І галоўнае — проста паварушыцца.

Аднак у адносінах з садаводчымі таварыствамі ўзнікае і пасапраўднаму вострая праблема — смецце. Рэгулярна дагаворы на яго вываз заключаюць не паўсюль. Як вынік, пасля кожных выхадных бытавыя адходы з незайздроснай стабільнасцю з'яўляюцца на дарогах ці ў навакольных лясах.

— Асобныя члены садаводчых таварыстваў заключаць дагаворы катэгарычна адмаўляюцца, аргументы тут самыя розныя — ад «смецця ў нас няма» і да «мы за вываз плацім у сталіцы», — кажа Юрый Шапавалаў. — Аднак зразумела: бытавыя адходы ёсць ва ўсіх, і ёсць там, дзе чалавек жыве прынамсі адзін дзень. Таму гэту праблему неабходна вырашаць — напрыклад, шляхам выстаўлення кожнаму дачніку абавязковага плацяжу. Прычым гаворка не ідзе аб надта вялікіх грошах — у залежнасці ад аддаленасці таго ж таварыства цяперашнія сумы вагаюцца ад 600 да 1200 рублёў у месяц.

Попыт на кароў

Яшчэ адна асаблівасць любога «дачнага» рэгіёну — дадатковая нагрузка на міліцыю. Не сказаць, што крымінал тут квітнее, але аматары паквапіцца на чужы мех бульбы ці слоікі з агуркамі ёсць таксама. Аднак дзе «мінус» — там і «плюс». І пераваг у «дачнай» спецыфікі раёна нашмат больш.

— Вельмі добра, што ў нашых населеных пунктах з'яўляюцца дачнікі — са сваёй культурай і поглядамі на вядзенне гаспадаркі, — заўважае Юрый Шапавалаў. — Многія гараджане ставяць прыгожыя дамы, падтрымліваюць вакол сябе чысціню і парадак. А мясцовыя жыхары глядзяць на гэта — і імкнуцца не адставаць.

Таксама не сакрэт: сёй-той з дачнікаў робіць добраахвотныя ахвяраванні на добраўпарадкаванне вёсак — выдаткоўвае грошы на клумбы, уборку могілак, падкошванне травы. А плюс да таго, гараджане даюць аб'ёмы мясцоваму гандлю, спрыяюць развіццю бізнэсу і асабістых падсобных гаспадарак. Адным з папулярных прадуктаў было і застаецца малако. А значыць, у жыхароў раёна з'яўляецца яшчэ адзін стымул трымаць кароў — асабліва з улікам прапановы больш высокіх, у параўнанні са «стандартнымі», грошай.

— У сваю чаргу, на зямлі працуюць і дачнікі, прычым у рэшце рэшт іх агуркі, памідоры, капуста і буракі шмат у чым уплываюць на змяншэнне агульных цэнаў на агародніну, — кажа Юрый Шапавалаў. — Адно, пажадана, каб тыя ж старшыні садаводчых таварыстваў рабілі справаздачу — што і ў якіх аб'ёмах тут вырошчваецца. Такім чынам можна пазбегнуць непажаданай канкурэнцыі на рынку. Калі будзе бачна, што дачнікі атрымліваюць дастаткова вялікую колькасць бульбы, сельгаспрадпрыемствы раёна могуць пераарыентавацца на іншыя культуры.

Між тым, дачнікі пачынаюць працаваць на эканоміку рэгіёну не толькі ўскосна. Ёсць інвестыцыі і прамыя. Пакуль перш-наперш гаворка ідзе пра ўкладанні грошай у аграсядзібы. Але менавіта «турыстычны» напрамак адкрывае і іншыя перспектывы.

— У сусветнай практыцы самым лепшым лічыцца варыянт, калі дача знаходзіцца не бліжэй за 80 кіламетраў ад буйнога горада, — зазначае Юрый Шапавалаў. — І ў гэтым плане сітуацыя тут ці не ідэальная. Да таго ж у раёне практычна адсутнічае прамысловасць, затое шмат лясоў — адпаведна, і грыбоў-ягад. Словам, не выпадае сумнявацца, што з цягам часу «дачная» спецыфіка павінна даць дадатковы штуршок для развіцця нашай эканомікі — скажам, тых жа аграсядзібаў, гасцінічнага бізнэсу, а таксама пунктаў грамадскага харчавання.

Сяргей ГРЫБ.

Пухавіцкі раён.

ПАДСОБНАЯ ГАСПАДАРКА

ПАЗБЕГНУЦЬ «ПЕРАКОСАЎ» ДАПАМОЖА «ДЗЁННІК УЛІКУ»

Летась Бабруйскі раён не выканаў толькі два планавыя паказчыкі па аб'ёмах сельгаспрадукцыі, вырашчанай на падворках вяскоўцаў, прадугледжаныя праграмай развіцця асабістых падсобных гаспадарак. Гэта яйка курынае — 96,7 працэнта і малако — 79 працэнтаў. Асобую цікавасць выклікае апошняя лічба, бо рэгіён не першы год лідзіруе ў вобласці па аб'ёмах сабранага ў насельніцтва малака.

— Заданнем улічваецца ўсё малако, якое даюць каровы ў асабістых гаспадарках, — патлумачыў **старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў Леанід БАРКОЎСКІ**. — І ў пераліку на адну рагулю, згодна з даведзенымі нам лічбамі, у 2009 годзе неабходна было атрымаць па 7 тон малака. На такое здольныя толькі каровы-рэкардысткі ў СВК. Дасягнуць такіх паказчыкаў на асабістым падворку нерэальна. Гадавое заданне было яўна завышанае. Разлік рабіўся на тое, што ва ўмовах падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак мясцовыя жыхары павялічаць пагалоўе буйной рагатай жывёлы. Але такога пакуль не назіраецца. Пажылым людзям, якіх у вёсцы большасць, цяжка даглядаць кароў. Многія ўвогуле адмаўляюцца іх трымаць, таму пра павелічэнне пагалоўя пакуль гаварыць не даводзіцца.

Па прычыне слабасці здароўя пенсіянеры адмаўляюцца не толькі ад каровы, але і ад пасеву збожжавых культур.

— Сёння ў нас назіраецца пераарыентацыя зямельных надзелаў: там, дзе раней вяскоўцы вырошчвалі збожжа і бульбу, цяпер высяваюць шматгадовыя травы. Збожжа было патрэбна ў якасці корму для парсючкоў, хатняй птушкі, а калі гаспадарка скарачаецца, то і патрэба ў пасевах кармавых культур адпадае. Па асобных сельсаветах у разрад сенакосных угоддзяў пераведзена ад 40 да 60 гектараў (як, напрыклад, па Осаўскім сельсавеце).

Ліквідаваць «перакосы» ў дзяржаўным планаванні дапамогуць новыя падыходы да ўліку сельгаспрадукцыі, вырашчанай на асабістых падворках. Існуе адпаведны пілотны праект, ініцыятарам яго выступіў Мінстат. Згодна з ім, па краіне з дапамогай камп'ютара было адабрана некалькі сярэднестатыстычных (па колькасці насельніцтва, па аб'ёмах вырашчанай сельгаспрадукцыі і інш.) сельсаветаў, у кожным з якіх вылучылі шэраг сем'яў, якія трымаюць гаспадарку і пагадзіліся весці дзённік уліку сельгаспрадукцыі. З Бабруйскага раёна ў пілотны праект патрапіў Гарбацэвіцкі сельсавет, на тэрыторыі якога выбралі 40 сем'яў-удзельніц.

Кожныя дзесяць дзён у спецыяльны дзённік уліку яны будуць заносіць усе вырашчаныя прадукты раслінаводства і жывёлагадоўлі: колькі атрымалі ад кур яек, ад кароў і коз — малака, колькі з авечак настрыглі воўны, колькі сабралі бульбы, збожжа, ягад і г.д. У дзённіку ўсё распісана вельмі падрабязна, напрыклад, не проста «гародніна», а «гародніна адкрытага грунту», з дэталізацыяй: агуркі, перцы, капуста, кабачкі, часнок і інш. Асобна ідзе графа «гародніна закрытага грунту», асобна — «плады» і г.д. Для ўдзелу ў праекце запрасілі як заможныя, моцныя асабістыя гаспадаркі, так і зусім сціплыя, каб атрымаць максімальна поўны малюнак і больш дакладную інфармацыю... Такое выбарачнае даследаванне тыповых беларускіх асабістых гаспадарак дапаможа пазбягаць завышаных лічбаў пры складанні гадавых планаў і прыпісак падчас справаздач, а таксама пазбавіць работнікаў сельвыканкамаў неабходнасці хадзіць па дварах з гаспадарчай кнігай.

Праект распачаўся 1 ліпеня, а яго вынікі будуць падводзіцца напрыканцы года. «Будзем спадзявацца, што праект сябе апраўдае», — падсумаваў Леанід Баркоўскі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДАВЕРАНА БЫЦЬ ЛІДАРАМ

Жыхары Бабінавіцкага сельскага Савета Лёзненскага раёна не толькі зноў абіраюць Вольгу Маржаедаву сваім дэпутатам, але другі раз запар давяраюць ёй кіраваць выканаўчым камітэтам. Як і раней, першараднымі клопатамі Савета яго старшыня лічыць вырашэнне сацыяльных праблем усіх катэгорый насельніцтва, добраўпарадкаванне населеных пунктаў і асабліва Бабінавічаў, якім лёсам вызначана знаходзіцца на старажытным шляху Орша—Віцебск.

ГРОДЗЕНСКІ ЎКЛАД У АЛІМПІЙСКІ КАТОК

Пятнаццаць гродзенскіх студэнтаў з аграрнага і медыцынскага ўніверсітэтаў па запрашэнні расійскай грамадскай арганізацыі «Будатрад» накіраваліся ў Сочы, каб паўдзельнічаць у будаўніцтве алімпійскай арэны для канькабежцаў.

Пры адборы кандыдатаў на паездку ў алімпійскую сталіцу-2014 улічваліся стан здароўя, будаўнічыя навыкі, а таксама поспехі ў навучанні і ўдзел у грамадскім жыцці. А затым сваё плячо падставіў, як кажуць, Гродзенскі гарадскі Савет дэпутатаў, які знайшоў сродкі на аплату праезду будатрадаўцаў у Сочы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

Зроблена падсыпка, праведзена грэйдзіраванне

У нумары ад 17 чэрвеня быў змешчаны матэрыял «Тыдзень — на падсыпку», дзе агучвалася праблема, узнятая жыхарамі вёскі Сталіца Германовіцкага сельсавета Шаркаўшчынскага раёна. Жанчыны паскардзіліся ў рэдакцыю на нездавальняючы стан дарогі ад вёскі да пашы, дзе пасвяцца іх каровы і куды днём прыязджае малаказборшчык з машынай сабраць свежанадоенае малако. У сухое надвор'е дабрацца да месца выпасу жывёлы проста, а вось у дождж ці пасля дажджу — вельмі праблематычна. Дарогу размывала, машына буксавала, «вязла», таму малаказборшчык, каб не рызыкаваць, спыняўся ў вёсцы, а жыхары ішлі пешшу 400 метраў да пашы, даілі кароў і потым з поўнымі вёдрамі цягнуліся назад у вёску. Мясцовыя ўлады паабяцалі журналісту ў тыднёвы тэрмін прывесці дарогу да ладу. Днямі мы атрымалі пісьмовае рэагаванне на артыкул за подпісам старшыні Шаркаўшчынскага райвыканкама, якое прыводзім ніжэй.

«Артыкул «Тыдзень — на падсыпку», надрукаваны ў газеце «Звязда» 17 чэрвеня 2010 года (№ 23 (217), разгледжаны Шаркаўшчынскім раённым выканаўчым камітэтам.

З мэтай ліквідавання названых недахопаў паведамляем, што цяпер праведзены бягучы рамонт дарогі да пашы ў вёсцы Сталіца: зроблена падсыпка, праведзена грэйдзіраванне.

Пытанне аб недапушчэнні падобных выпадкаў на тэрыторыі сельсаветаў раёна было разгледжана на пасяджэнні прэзідыума раённага Савета дэпутатаў 30 чэрвеня гэтага года».

Інга МІНДАЛЁВА.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

КАЛІ ЖАДАННІ НЕ СУПАДАЮЦЬ З МАГЧЫМАСЦЯМІ

«Мы хочам праз вашу газету звярнуцца да Прэзідэнта, бо ад сваіх мясцовых уладаў не можам дабіцца дапамогі ў вырашэнні нашых праблем, а ён неаднойчы падкрэсліваў, што галоўнае — зрабіць уладу на месцах больш адказнай перад людзьмі, набліжанай да штодзённых праблем і клопатаў канкрэтнага чалавека». З такіх слоў пачалася наша размова з дзвюма жыхаркамі Дзяржынска Раісай Несцераўнай Гаварковай і Валянцінай Мікалаеўнай Валковіч, якія спецыяльна прыехалі ў Мінск у пошуках дапамогі.

З сабой жанчыны прывезлі пухлую папку, у якой змяшчалася іх перапіска з гарадскімі выканаўчымі і камунальнымі службамі Дзяржынска. Высветлілася, што прэтэнзій у жанчын некалькі і што вырашыць свае пытанні яны не могуць ужо колькі гадоў.

— Мы неаднойчы звярталіся і ў гарвыканкам, і ў Дзяржынскую ЖКГ, — патлумачыла Раіса Несцераўна, дэманструючы стос адбіткаў заяў са шматлікімі подпісамі жыхароў вуліцы Гагарына і афіцыйных адказаў на іх, — а відавочных вынікаў як ні было, так і няма.

Калі канкрэтна, жанчыны дабіваліся ад мясцовых уладаў асфальтавання дарогі і асвятлення вуліцы Гагарына, дзе яны пражываюць, капітальнага рамонту (з цеплавой мадэрнізацыяй сцен) сваіх дамоў (№ 5, № 7, № 31А), добраўпарадкавання суседняга («бальнічнага») возера, якое цягнецца з аднаго боку вуліцы Гагарына, і пераробліванне лесвіцы з першага паверха на другі ў доме № 31А па вуліцы Гагарына, дзе прыступкі не адпавядаюць стандарту (занадта высокія).

Як патлумачылі жанчыны, свае кватэры ў дамах (двухпавярховых катэджах, разлічаных на 4 сям'і) яны атрымалі ад завода «Рамдэталь» у 1988 годзе. Тады ж за сродкі прадпрыемства па праезнай частцы вуліцы Гагарына быў пакладзены асфальт. Падчас газіфікацыі ў 93-м адпаведныя службы ўзнялі цэнтр дарогі, дзе пракладалі трубу, і зноў засыпалі траншэю зямлёй. З тых часоў дарога знаходзілася ў непрыдатным стане. На ёй утварыліся шматлікія яміны. З-за рэштак асфальту, які дзе-нідзе захаваўся, грэйдзіраванне дарогі было неэфектыўным. У вячэрні час на такой вуліцы, ды яшчэ пры дрэнным асвятленні, хадзіць (не тое што ездзіць) было небяспечна. Раіса Гаваркова паказала копіі двух сваіх бальнічных лістоў, датаваных 1998-м і 2001 гадамі, калі яна на згаданай вуліцы атрымала расцяжэнне звязак правага галёнкаступнёвага сустава (1998 год) і пашкоджанне звязак левага (2001 год).

Паводле слоў жанчын, іх дамам (якія, між іншым, знаходзяцца на балансе ЖКГ) даўно патрабуецца капітальны рамонт з цеплавой мадэрнізацыяй, бо «сцены прамярзаюць і пакрываюцца мохам, вонкавыя сцены дома № 5 рассыпаюцца, трэскаюцца, цэглу са сцяны можна дастаць, не прыкладаючы намаганняў»... Акрамя таго, ля дамоў няма тратуараў, адмосткі даўно патрэскаліся, вадасцёкавыя трубы ўстаноўлены неахайна — у доме № 31А вада з іх сцякае ў падвал.

— Мы колькі гадоў просім уцяпліць нашы дамы, — дадала Валянціна Валковіч. — Калі ў чарговы раз сёлета звярнуліся ў ЖКГ, атрымалі адказ, што «выкананне такога віду работ у найбліжэйшы час не плануецца, бо за перыяд 2008—2009 гадоў факту прамярзання сцен не выяўлена, заяў на дыспетчарскую службу не паступала». Але ў нас ёсць копіі нашых зваротаў наконт цеплавой мадэрнізацыі яшчэ за 2008 год... Што тычыцца лесвіцы з першага на другі паверх у нашым доме № 31А, вышыня прыступак там ад 17 да 25 сантыметраў, хоць, паводле стандарту, не павінна перавышаць 15 сантыметраў. Мы з мужам старэем, з кожным годам нам усё цяжэй узнімацца па такой лесвіцы. На нашу просьбу перарабіць прыступкі мы сёлета атрымалі такі адказ ад ЖКГ: «... рэканструкцыю маналітнай... лесвіцы выканаць немагчыма ў сувязі з вялікай стромкасцю лесвічнага марша, які быў выкананы пры будаўніцтве дома».

Дом № 7 па вул. Гагарына.

Вада з трубы сцякае ў падвал.

«Бальнічнае» возера, што цягнецца з боку вуліцы Гагарына, з'яўляецца зонай адпачынку.

— У жыхароў нашай вуліцы па той бок праезнай дарогі, ля возера, раней былі агароды, — тлумачыла Раіса Несцераўна. — Людзям забаранілі іх трымаць (маўляў, зона адпачынку), а адпаведнага добраўпарадкавання так і не навялі. Распранальні няма, трава — у рост чалавека. Насупраць сваіх дамоў мы абкошваем пустазелле самі, а ўвогуле гэтым павінны займацца камунальныя службы. Яны ж робяць гэта радзей, чым трэба і абкошваюць не ўсё возера...

Усе свае праблемы жанчыны агучылі на выязным прыёме грамадзян, які напрыканцы мая праводзіў у Дзяржынску намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Віктар Бура. Віцэ-прэм'ер выехаў на месца, каб на свае вочы пабачыць праблемную вуліцу, паставіў гарадскім уладам задачу — да 3 ліпеня выправіць сітуацыю.

— Адзінае, што аператыўна зрабілі ў поўным аб'ёме, — гэта асвятленне вуліцы Гагарына, — адзначыла Раіса Несцераўна. — Пытанне закрылі цалкам. Што тычыцца нашых дамоў, ніякага капрамонту мы не дачакаліся, у асабліва праблемных месцах камунальныя службы толькі падмазалі цэментам плямкі. Цэнтр дарогі, сапраўды, заасфальтавалі, цяпер аўтамабіль там праехаць можа, але па баках засталіся ўсё тыя ж яміны, ні тратуараў, ні бардзюраў да гэтага часу няма. Возера так і не добраўпарадкавана, мы прывезлі з сабой фотаздымкі ад 6 ліпеня, дзе добра бачна, якая там высокая трава. Самае крыўднае, што нашы мясцовыя ўлады ўжо адрапартавалі віцэ-прэм'еру пра тое, што ўсё зроблена.

Па каментарыі журналіст «Звязды» звярнуўся ў **Дзяржынскі гарадскі выканаўчы камітэт** і атрымаў ад мясцовых чыноўнікаў наступную інфармацыю.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» проводит внеочередное Общее собрание акционеров в форме заочного голосования путем письменного опроса акционеров 29 июля 2010 года по адресу: бульвар им. Мулявина, 6, 220005, г. Минск, головной офис ОАО «БПС-Банк».

Вопросы повестки дня:

1. Об утверждении изменений и дополнений, вносимых в Устав ОАО «БПС-Банк».
2. Об оказании ОАО «БПС-Банк» безвозмездной (спонсорской) помощи в 2010 году.
3. Об утверждении Дополнения 1 к Положению о Наблюдательном совете Открытого акционерного общества «Белпромстройбанк».
4. Об утверждении Дополнения 1 к Порядку определения и ведения учета аффилированных лиц ОАО «БПС-Банк».
5. Об утверждении новой редакции Положения о Департаменте внутреннего аудита ОАО «БПС-Банк».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров – 21 июля 2010 года.

Бюллетени для заочного голосования вручаются акционерам (их представителям), имеющим право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, при их обращении в банк при предъявлении документа, удостоверяющего личность акционера (его представителя).

Акционеры банка могут получить информацию о включении их в список для заочного голосования внеочередного Общего собрания акционеров и другую информацию в соответствии с законодательством Республики Беларусь в местах учета их акций в филиалах и отделениях банка или головном офисе банка по адресу: г. Минск, бульвар им. Мулявина, 6 или по телефону (017) 289 42 33.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

КАЛІ ЖАДАННІ НЕ СУПАДАЮЦЬ З МАГЧЫМАСЦЯМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Дзяржынскага гарвыканкама Станіслаў ДОЎНАР:

— Усе гэтыя пытанні, з якімі звярнуліся ў газету жыхары дамоў па вуліцы Гагарына, агучваліся на прыёме ў віцэ-прэм'ера Беларусі Віктара Буры падчас выязнога прыёму грамадзян у Дзяржынску. Віктар Паўлавіч асабіста з'ездзіў да гэтых дамоў (№ 5, 7 і 31А), на ўласныя вочы пабачыў сітуацыю з дарогай. Тады ж мы вызначылі аб'ём работ, якія неабходна было зрабіць па ўсіх праблемных кірунках. Пасля іх завяршэння падрыхтавалі фатаграфіі па кожным аб'екце і адправілі Віктару Паўлавічу ў пацвярджэнне таго, што абяцанае мы выканалі.

Што датычыцца стану вуліцы Гагарына, размова ішла не пра добраўпарадкаванне, а толькі пра ямавы рамонт і забеспячэнне праезду транспарту. Гэта мы здзейснілі. Пракладка тратуараў, бардзюраў і поўная замена асфальтавага пакрыцця ў найбліжэйшы час там не плануецца... Летась на падсыпку і будаўніцтва дарог з гарадскога бюджэту было выдаткавана 1,5 мільярда рублёў. Не кожны мясцовы бюджэт расходуе такія сумы на дарогі. Падсыпалі 9 вуліц, зрабілі праезды, але на ўсё проста не хапае грошай. Дарожны фонд таксама абмежаваны. Мы б з задавальненнем «закаталі» ў асфальт усе дарожкі і сцяжынкі, але, на жаль, абмежаванасць у сродках не дазваляе нам выканаць усе нашы планы.

Паўтаруся, тое, што мы паабяцалі, мы выканалі. Пракладка новага цвёрдага пакрыцця праезнай часткі дарогі па вуліцы Гагарына, а таксама абуладкаванне тратуараў не плануецца з-за адсутнасці сродкаў.

Наконт цеплавой мадэрнізацыі дамоў па вуліцы Гагарына. У нас на балансе ЖКГ знаходзіцца 96 шматпавярховых жылых дамоў (ад двух паверхаў і вышэй), і кожны жыхар хацеў бы, каб яго дому зрабілі капрамонт у першую чаргу. Аднак ёсць дакладна спланаваная гарадская праграма цеплавой мадэрнізацыі жылых дамоў, якой мы і прытрымліваемся. Вышэйзгаданыя дамы па вуліцы Гагарына таксама ўключаны ў гэтую праграму, але ў нас ёсць аб'екты, якія знаходзяцца ў значна горшым стане і патрабуюць неадкладных мераў.

Трэба ўлічваць, што гарадская ЖКГ — датацыйнае прадпрыемства... У год па горадзе на капрамонт і тэхнічнае абслугоўванне мы збіраем каля 800 мільёнаў рублёў адлічэнняў жыхароў. Яшчэ каля 300 мільёнаў нам дадае мясцовы бюджэт. У выніку прыкладна 1,1 мільярда рублёў мы задзейнічаем на капітальны рамонт жылфонду, на яго добраўпарадкаванне і г.д. Гэта мізэр. Для параўнання: каб правесці поўны капітальны рамонт аднаго дома (з улікам цеплавой мадэрнізацыі), неабходна патраціць як мінімум 1 мільярд рублёў. Такім чынам, мы за год збіраем грошы толькі на адзін дом, таму даводзіцца іх драбніць, «адцягваць» на экстранныя работы, напрыклад, на рамонт дахаў...

Дзяржынская ЖКГ у межах праграмы капітальнага рамонту жылфонду распрацавала 6 камплектаў праектна-каштарыснкай дакументацыі, якія прайшлі экспертызу, на капітальны рамонт і ўцяпленне шматпавярховых дамоў, якія знаходзяцца ў больш цяжкім стане.

Што датычыцца пытанняў наконт пераробліванне лесвіцы з першага паверха на другі ў доме № 31А па вуліцы Гагарына, тут трэба разумець, што лесвіца замацаваная ўсярэдзіне дома. Так было прадугледжана праектам — удалым ці не, цяпер позна абмяркоўваць. Мы гаспадыні паказалі, што для таго, каб зрабіць яе лесвіцу больш пакатай, трэба «вывесці» ніжнія прыступкі прама на ганак, за дзверы. Гэта проста тэхнічна немагчыма.

Намеснік старшыні Дзяржынскага гарвыканкама Аляксандр МІСЮЧЭНКА:

— У нас восем азёр па раёне, якія афіцыйна прызнаны санітарнымі службамі прыдатнымі для купання. На возеры, што месціцца побач з вуліцай Гагарына, арганізавана зона адпачынку, там людзі купаюцца, там стаяць альтанкі, лавачкі, прыбіральні, кантэйнерная пляцоўка і некалькі ўрнаў па перыметры. Гэтыя элементы добраўпарадкавання размешчаны не з боку горада, а на другім баку, дзе арганізаваны ўпарадкаваны пляж. З боку вуліцы Гагарына рабіць пляж немэтазгодна, бо там вялікі адхон і растуць дрэвы. Тэрыторыя ўздоўж возера перыядычна абкошваецца (яго абслугоўвае ЖКГ).

Заасфальтаваная дарога.

Інга МІНДАЛЁВА.

ПІЛОТНЫ ПРАЕКТ У СМАЛЯВІЧАХ

Замест прадмовы

Сталіца наша перанаселеная, у ёй жыве без малога пятая частка жыхароў краіны. Для параўнання, доўгі час колькасць жыхароў Мінска была супастаўнай з насельніцтвам Варшавы. Праўда, цяпер яна трохі вырвалася наперад, але ў Польшчы і народу жыве амаль у чатыры разы больш, чым у Беларусі. Таму зразумелыя пошукі на нацыянальным узроўні шляхоў абмежавання далейшага разрастання Мінска. Сярод шматабяцальных і эфектыўных мераў — планы па стварэнні гарадоў-спадарожнікаў вакол сталіцы. Дарэчы, гэта прыдумалі не ў Мінску. За мяжой гарады-спадарожнікі выдатна зарэкамендавалі сябе.

За ўзаемапаразуменне раёна і сталіцы

Сумесная сесія Смалявіцкага райсавета і Мінскага гарсавета магла б зняць спрэчныя пытанні, якія могуць ды і абавязкова, чаго хаваць, узнікнуць у ходзе будаўніцтва першага горада-спадарожніка. Сумесная сесія таксама дапамагла б не дапусціць памылак у ходзе рэалізацыі гэтага праекта. Дасягнутае загадзя, да стадыі актыўнага будаўніцтва ўзаемапаразуменне паміж раёнам і сталіцай было б толькі на карысць агульнай справе. Пакуль дэпутаты раённага Савета на сваёй сесіі грунтоўна не разглядалі (зразумела, у межах сваёй кампетэнцыі) праблематыкі горада-спадарожніка. Але намер такі ёсць, бо працэс яго будаўніцтва істотна закране ўсе аспекты жыцця раёна, узбагаціць яго ўлады дадатковымі клопатамі. Гарады-спадарожнікі — справа для краіны новая і ў многім нязведаная. І сёння ніхто вам дакладна не скажа, чым скончыцца эксперымент з узвядзеннем аднаго з іх у Смалявічах, ці ўсё атрымаецца так гладка, як намаляваліся і напісалі на паперы. І ўжо цяпер трэба думаць над тым, як папярэдзіць магчымыя пралікі.

— Таму дэпутаты райсавета лічаць мэтазгодным правесці на тэрыторыі раёна сумесную сесію разам з Мінскім гарсаветам. Але такая размова будзе карыснай толькі пасля заканчэння ўсёй складанай працы, што папярэднічае масавай забудове: усялякіх удакладненняў, зацвярджэнняў і г. д. Вось тады, калі будзе яснасць, можна запрасіць і мінскіх дэпутатаў. А тэмаў для размоў і абмеркавання знойдзецца больш чым дастаткова, — упэўнены **старшыня раённага Савета Аляксандр ЛЯХОЎСКІ**.

Погляд з Мінска

Спачатку ў сталіцы гаварылі пра дватры яе спадарожнікі, потым пра пяць, а адносна нядаўна прамільгнула інфармацыя пра верагоднае ўзвядзенне ў глыбокай перспектыве аж 9 гарадоў-спадарожнікаў у межах 50-кіламетровай адлегласці ад Мінска. Хоць, заўважым, рэальнай практыкі такога будаўніцтва ў краіне няма. Так, ёсць разуменне таго, што неабходна спыніць пашырэнне і перагруз сталіцы, выказваліся аргументы «за» і «супраць», прыводзіліся пэўныя разлікі і падлікі, але ніхто пакуль дакладна не сказаў, а як жа пойдзе справа, ці пераселіцца туды частка мінчан і г. д. Бо набываць жыллё ім давядзецца за ўласны кошт па рынкавых цэнах. Праўда, ім абяцаюць ільготнае крэдытаванне.

Пэўную яснасць у тэрміны будаўніцтва гарадоў-спадарожнікаў нядаўна ўнёс міністр архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр Селязнёў, які на прэс-канферэнцыі паведаміў, што 2010 год стане годам праектавання гарадоў-спадарожнікаў, а ў першай палове наступнага года трэба пабудаваць інфраструктуру, каб да канца 2011 года прыступіць да ўзвядзення жылля.

Яшчэ раней кіраўнік Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька паведаміў, што ў Смалявіцкім раёне адведзеная тэрыторыя, на якой прапануецца пабудаваць пасёлак на 20 тысяч жыхароў з усёй сацыяльнай (школа, дзіцячы садок, паліклініка) і інжынерна-транспартнай інфраструктурай. Тут будуць трох-, чатырох-, пяці- і, магчыма, 9-павярховыя будынкі. З Мінскам горад-спадарожнік звяжа гарадская электрычка. Старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Віктар Нікіцін паведаміў, што Смалявічы могуць стаць месцам будаўніцтва першага эксперыментальнага жылога раёна. На яго думку, гэта дазволіць ацаніць, наколькі жыхары Мінска праявяць цікавасць да такога жылля. Яўген Воўна, генеральны дырэктар аб'яднання «Мінскбуд», які будзе ўзводзіць першы горад-спадарожнік, кажа, што адпаведны пілотны праект вырашана адпрацаваць на прыкладзе Смалявічаў, каб паглядзець, якія слаі насельніцтва могуць пераехаць у гарады-спадарожнікі.

Погляд са Смалявічаў

Вось так гавораць сталічныя чыноўнікі рознага рангу. А што думае ў Смалявічах мясцовая ўлада з нагоды планаў разгарнуць на тэрыторыі раёна ўнікальны для Беларусі эксперымент? Меркаванне старшыні раённага Савета Аляксандра Ляхоўскага:

— Пачнём з таго, што Смалявіцкі раён — прыгарадны. Смалявічы фактычна ўжо з'яўляюцца горадам-спадарожнікам: больш за 20 працэнтаў насельніцтва раёна на працу даўно ездзіць у Мінск. У сваю чаргу шмат мінчан пастаянна жыве ў раёне, некаторыя тут знайшлі сабе працу. Так што ўзаемапранікненне раёна і сталіцы ідзе на поўны ход. І будаўніцтва горада-спадарожніка — гэта лагічны крок. Таму мясцовае насельніцтва маральна падрыхтаванае да гэтага, — кажа Аляксандр Аляксандравіч. На яго думку, лагічным і правільным з'яўляецца рашэнне распачаць узвядзенне гарадоў-спадарожнікаў менавіта са Смалявічаў. Па яго словах, так лічаць і дэпутаты райсавета.

У раёне жыве крыху больш за 43 тысячы чалавек. Большасць людзей, працягвае Аляксандр Аляксандравіч, абсалютна не супраць будаўніцтва на тэрыторыі раёна першага горада-спадарожніка. Наадварот, многія з яго ўзвядзеннем звязваюць паляпшэнне ўмоў жыцця мясцовага насельніцтва, адкрыццё новых працоўных месцаў, асабліва ў сферы паслуг, малога бізнэсу. І яшчэ людзі разлічваюць на тое, што новабудоўлямі будуць выключна жылыя кварталы, новыя аб'екты сацкультбыту, што сюды не будуць пераносіцца прадпрыемствы са сталіцы.

Аднак ужо бачныя абрысы будучых праблем. Мяркуецца, што сюды пераедуць жыць пераважна маладыя сем'і. А ў раёне ўжо дэфіцыт месцаў у дзіцячых садках. Значыць, іх трэба будзе ўзводзіць разам з жылымі дамамі. Узнікнуць праблемы і з аказаннем кваліфікаванай медыцынскай дапамогі — ужо не хапае медыкаў. І з першымі сотнямі навасёлаў паўстане пытанне аб павелічэнні медперсаналу. Пра яго вырашэнне варта думаць сёння.

Горад-спадарожнік пачнецца, па папярэдніх звестак, з будаўніцтва аднаго дома побач са Смалявічамі. Усяго ў горадзе плануецца пабудаваць прыкладна 1 млн — 1 млн 300 тысяч квадратных метраў жылля. Лічба вялікая. Нагадаем, у райцэнтры Смалявічы жыве 15 тысяч чалавек, з узвядзеннем горада-спадарожніка колькасць насельніцтва раёна ўзрасце яшчэ на 20 тысяч чалавек. У сувязі з гэтым узнікне шмат праблем з жыццезабеспячэннем гэтых дадатковых жыхароў. Што датычыцца прадуктаў харчавання, то тут, лічыць Аляксандр Ляхоўскі, пытанняў не павінна ўзнікнуць. На тэрыторыі раёна, напрыклад, знаходзіцца магутная бройлерная птушкафабрыка, якая толькі ў Мінску мае 10 фірмовых крамаў. Мяснымі і малочнымі прадуктамі, агароднінай раён здольны забяспечыць будучае папаўненне.

Вядома, у эксперыменце будуць задзейнічаны многія ведамствы і арганізацыі. І ў кожнай свой манеўр. Для ўлады раённага звяна, лічыць старшыня раённага Савета, адной з важных задач стане ўтылізацыя адходаў. Гэта праблема ўжо не першы год хвалюе мясцовую ўладу. І вырашаць яе трэба, упэўнены старшыня, па-сучаснаму, у адпаведнасці з замежнай практыкай. А гэта значыць, што не варта шкадаваць грошай на набыццё для першага горада-спадарожніка эфектыўнага міні-завода па раздзельнай перапрацоўцы смецця, цвёрдых адходаў з далейшым іх выкарыстаннем у прамысловасці. На думку Аляксандра Аляксандравіча, першы горад-спадарожнік павінен стаць узорам па перапрацоўцы гарадскіх бытавых адходаў, каб сюды ехалі па досвед.

У раёне для таго, каб «разбірацца» з адходамі традыцыйнымі спосабамі, ужо няма свабодных земляў. Хоць з пачатку года сіламі раёна, пераважна сельскіх Саветаў, былі ліквідаваны 82 звалкі. Але нярэдка потым на іх месцы зноў узнікаюць кучы смецця. Акрамя мясцовага насельніцтва свой немалы ўнёсак у праблему робяць 160 дачных таварыстваў, якія месцяцца на тэрыторыі раёна. Таму ёсць надзея, што мінскія ўлады знойдуць сродкі на набыццё міні-завода па перапрацоўцы бытавога смецця.

Акрамя таго, для наладжвання добрай сувязі сталіцы з гарадамі-спадарожнікамі неабходна вырашыць і транспартную праблему. Так, напрыклад, плануецца, што да Кургана Славы будзе хадзіць гарадскі транспарт — гэта будзе або хуткасны трамвай, або тралейбус, або аўтобус.

Кропка пастаўлена

У папярэдніх размовах і дыскусіях аб мэтазгоднасці ці немэтазгоднасці ўзвядзення гарадоў-спадарожнікаў, здаецца, пастаўлена вялікая тлустая кропка. Згодна з Дзяржаўнай праграмай па будаўніцтве буйных жылых раёнаў для жыхароў Мінска і вынасе (пераносе) са сталіцы ў населеныя пункты краіны вытворчых аб'ектаў, будуць узведзены дзевяць гарадоў-спадарожнікаў. У якасці такіх у Дзяржаўную праграму ўключаны, нагадаем, прамысловыя — Дзяржынск, Жодзіна, Фаніпаль; аграпрамысловыя — Смалявічы, Стоўбцы, Узда, Рудзенск; турысцка-крэацыйныя — Заслаўе, Лагойск.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Смалявіцкі раён.

ГАРАДЖАНЕ ДАГЛЕДЗЯЦЬ ВЯСКОВЫЯ МОГІЛКІ

Днямі старшыня Слонімскага райвыканкама Іосіф ПАЎЛЮКЕВІЧ падпісаў распараджэнне аб замацаванні арганізацый раёна за вясковымі могілкамі. Такім чынам мяркуецца весці добраўпарадкаванне, агароджванне і падтрыманне парадку на тэрыторыях вясковых могілак.

Сапраўды, праблема стану вясковых могілак не толькі на Слонімшчыне, але і па ўсёй Беларусі даволі трывожная. Многія месцы апошняга прытулку ў вёсках знаходзяцца ў жудасным стане. Асабліва ў нешматлюдных вёсках. А ў народзе кажуць, што па могілках можна вызначыць — у якой мы дзяржаве жывём і які дабрабыт насельніцтва.

Сёння многія вясковыя могілкі зараслі пустазеллем, хмызняком, шмат дзе неабходна тэрмінова спілоўваць і вывозіць старыя дрэвы. Нярэдка няма добрых пад'язных дарог, большасць могілак — неабгароджаныя. Але на любую справу, як вядома, патрэбныя грошы.

Старшыня Дзеравянчыцкага сельвыканкама Сяргей Бязносік сказаў, што мэтанакіравана на добраўпарадкаванне могілак грошай не выдаткоўваецца, але камітэты атрымліваюць сродкі на добраўпарадкаванне населеных пунктаў, а гэта значыць і могілкі. Гэта невялікая сума — ад 5 да 10 мільёнаў рублёў. Тым не менш дапамога ёсць.

— Хацелася б, каб самі вяскоўцы былі зацікаўленыя ў гэтай справе. Але ў кожнай вёсцы розныя людзі, — сказаў Сяргей Аляксандравіч. — Адны заўсёды адгукнуцца на прапанову навесці парадак, іншыя — проста не хочуць. Дый у невялікіх вёсках цяпер жывуць адны пенсіянеры, таму якія з іх памагатыя. На Дзяды і Радаўніцу, калі прыязджаюць на могілкі землякі з усёй Беларусі, шмат разоў звяртаўся да іх: давайце арганізуем суботнікі, прыедзем і ўсе разам навядзём парадак на магілах сваіх бацькоў і дзядоў. Людзі пагаджаюцца, але пасля забываюць, і ніхто не едзе. Але ж свет не без добрых людзей. Вось нядаўна, дзякуючы Мікалаю Дуброўскаму — дырэктару ААТ «Зодчы» са Слоніма, добраўпарадкавалі могілкі ў вёсцы Скоўдзічы. Цяпер разам з рабочымі льнозавода працуем на могілках у Вербалатах. У Гуменіках могілкі ачысцілі ад дрэў. Пакрысе праца ў гэтым кірунку праводзіцца.

— Распараджэнне старшыні райвыканкама аб навядзенні парадку на вясковых могілках мы падтрымліваем, — сказаў журналісту начальнік Слонімскага ўпраўлення магістральных газаправодаў Юрый Бяссонаў. — Нашы рабочыя даглядаюць двое могілак. Паглядзіце, якія дагледжаныя могілкі ў Польшчы, Германіі, Францыі і ў іншых еўрапейскіх краінах. Нам трэба з іх браць прыклад».

Сяргей ЧЫГРЫН.

СУПРАЦОЎНІКІ ДАІ ВАКОЛ НАС

Дзяржаўтаінспекцыя Магілёўскай вобласці мае намер узмацніць схаваны нагляд за выкананнем правілаў дарожнага руху. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі начальнік УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Міхаіл НЕЎМЯРЖЫЦКІ.

Тут маецца на ўвазе патруляванне на аўтамабілях грамадзянскага выканання. Такі схаваны нагляд, лічаць у ДАІ, будзе спрыяць адказнасці ўдзельнікаў дарожнага руху. Акрамя гэтага, Міхаіл Неўмяржыцкі ўпэўнены, што кожны супрацоўнік ДАІ — не толькі патрульныя, але і кабінетныя супрацоўнікі — павінны сачыць за выкананнем правілаў на дарогах нават па-за межамі сваёй непасрэднай працы. Па словах кіраўніка Магілёўскай ДАІ, калі супрацоўнік службы бачыць парушэнне, напрыклад, па дарозе на абед альбо дадому пасля працы, ён павінен зрабіць захады для стрымання парушальніка.

Між тым, у Магілёўскай вобласці ёсць тэндэнцыя да памяншэння колькасці дарожна-транспартных здарэнняў і іх ахвяраў. За паўгода ў аўтааварыях загінулі 45 чалавек, а гэта на 26 чалавек меней у параўнанні з леташнім першым паўгоддзем.

Ілона ІВАНОВА.

Сфатаграфавацца з Агінскім...

...можна будзе 7 жніўня ў вёсцы Залессе Смаргонскага раёна, дзе адбудзецца фестываль-кірмаш, прысвечаны 320-годдзю Залесся.

Мерапрыемства такога маштабу ладзіцца ля маёнтка Міхаіла Клеафаса Агінскага другі год запар. Леташні фестываль «Залессе запрашае сяброў!» стаў пробным каменем, «першым блінком», які да таго ж выйшаў зусім не камяком. Фестываль даў магчымасць сабрацца разам выхадцам з Залесся і суседніх вёсак, дакрануцца да сваіх каранёў, бліжэй пазнаёміцца з тымі, хто жыве ў Залессі сёння.

Сёлетні фестываль, прысвечаны юбілею вёскі, абяцае быць яшчэ больш захапляльным і разнапланавым, ён зацікавіць не толькі мясцовых жыхароў, але і ўсіх, хто неабыякавы да сваёй нацыянальнай культурнай спадчыны. Тут можна будзе набыць сувеніры — вырабы народных майстроў з лазы, саломкі, гліны, дарункі залескай зямлі — бульбу, агародніну, грыбы, ягады, мёд, малако, сыры, яйкі, масла, пакаштаваць традыцыйныя мясцовыя стравы і напоі і нават навучыцца іх гатаваць, наведаць з экскурсіяй маёнтак Агінскага, зрабіць фота на памяць.

Госці фестывалю могуць узяць непасрэдны ўдзел у святе — прывезці на продаж свае вырабы.

Пачатак мерапрыемства прызначаны на 11.00. Дабрацца да Залесся можна грамадскім транспартам (цягніком, аўтобусам) ці на ўласным транспартным сродку (машыне, калёсах).

Інга МІНДАЛЁВА.

ПАЗБЕГНУЦЬ «ПЕРАКОСАЎ» ДАПАМОЖА «ДЗЁННІК УЛІКУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

...У жыхароў бабруйскага рэгіёна ва ўтрыманні знаходзіцца 930 коней.

— Мы падлічылі, што гэтага недастаткова для правядзення ўсяго комплексу сельгасработ на асабістых падсобных гаспадарках, — прызнаўся старшыня райсавета. — Попыт на коней у раёне ёсць. Выправіць сітуацыю дапаможа казацкая суполка, якая існуе на тэрыторыі Слабадкоўскага сельсавета. Мы правялі перамовы і знайшлі з іх боку падтрымку. Размова ідзе аб адкрыцці невялікай фермы па развядзенні працоўных коней. Гэтая ідэя казацтва зацікавіла, калі праект рэалізуецца, попыт на коней мы цалкам задаволім.

У прыватнай уласнасці вясковых жыхароў Бабруйскага раёна ёсць 180 трактароў. Акрамя таго, на базе камбіната бытавога абслугоўвання створана спецыялізаванае падраздзяленне, якое аказвае насельніцтву платныя паслугі па апрацоўцы ўчасткаў.

— Развіццё асабістых падсобных гаспадарак у нашым рэгіёне часткова тармозіць праблема з забеспячэннем якасным насеннем бульбы, — працягвае дэпутат. — Палова раёна не мае з гэтым ніякіх пытанняў, бо там месцяцца землі СВК, якія займаюцца бульбаводствам і заадно забяспечваюць насеннем элітных гатункаў бліжэйшыя вёскі. Жыхарам другой паловы раёна не так пашанцавала. Ім прапануюць набываць насенне праз арганізацыі райпа, аднак гэтая схема працуе дрэнна па прычыне высокай цаны. Уявіце, калі кілаграм насеннай бульбы каштуе 2,6 тысячы, а чалавеку трэба набыць 100 кілаграмаў, значыць, неабходна патраціць 260 тысяч. Для вяскоўца гэта вялікія грошы. Вось людзі і садзяць тое, што вырасцілі самі, а яно, як правіла, не такое высокапрадукцыйнае, часта заражанае хваробамі і г.д.

Вельмі своечасовым, на думку старшыні раённага Савета, стаў Указ Прэзідэнта ад 14 чэрвеня г.г. № 302 аб прадастаўленні крэдытаў грамадзянам, якія ажыццяўляюць вядзенне асабістых падсобных гаспадарак. Дакумент прадугледжвае ў 2010—2011 гадах выдзяленне «Белагрупрамбанкам» крэдытаў тэрмінам да 7 гадоў у суме да 60 мільёнаў рублёў на адну гаспадарку пад 5 працэнтаў гадавых. На гэтыя грошы людзі змогуць набыць угнаенні, сродкі абароны раслін, насенне, а таксама аплаціць паслугі па яго пасеве, закупіць хатнюю птушку і свойскую жывёлу, саджанцы шматгадовых пладова-ягадных культур, будаўнічыя матэрыялы для парнікоў і цяпліц, сродкі механізацыі і абсталяванне айчыннай вытворчасці для вядзення сельгасработ.

— Сёння перад намі, мясцовымі ўладамі, пастаўлена задача падтрымаць тых вяскоўцаў, хто хоча весці асабістую гаспадарку. У гэтым кірунку мы і працуем, — падкрэсліў дэпутат. — Па выніках мінулага года доля сельгаспрадукцыі, выпрацаванай на асабістых падворках раёна, склала 56 працэнтаў. Будзем спадзявацца, што прынятыя кіраўніцтвам краіны меры станоўча паўплываюць на развіццё асабістых падворкаў і на павелічэнне аб'ёму сельгаспрадукцыі, якая там вырабляецца.

Інга МІНДАЛЁВА.

Бабруйскі раён.

Каб у вёскі ішла гармонія і прыгажосць

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар вёскі Дзятлавічы Лунінецкага раёна Аляксей Кацуба стварыў уласнае прадпрыемства па вытворчасці бетонных тратуарнай пліткі і агароджаў, распрацоўвае цікавы дызайн гэтых вырабаў, удасканальвае якасць. За шасцігадовы тэрмін працы прадпрыемства дзятлавіцкія агароджы можна сустрэць не толькі на прыватных сядзібах аднавяскоўцаў, але і абапал шматлікіх сацыяльных аб'ектаў раёна.

Немалаважным фактарам існавання фірмы, лічыць Аляксей, з'яўляецца занятасць мужчынскага насельніцтва вёскі. На здымку Аляксей Кацуба і бетоншчык Мікалай Сяргейчык аглядаюць якасць гатовай прадукцыі.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

«ТУТ ВАМ НЕ АМЕРЫКА!..»

альбо Як я з-за няправільнай інструкцыі зламаў бензакасілку

На дзень народзінаў бацькі падаравалі мне трымер — бензінавую ручную касілку для газона. Я ўзрадаваўся — хоць і ўмею трохі трымаць у руках касу, але ж так зручней і цікавей, ды і больш сучасна.

Прыехаў я ў сваю сядзібу ў дачным кааператыве «Вітамін», выцягнуў з каробкі той трымер і пачаў вывучаць інструкцыю. Каб усталяваць на трымер нож (для ўсялякіх лопухаў ды пругкага пустазелля) альбо леску (якая за кошт хуткага кручэння ідэальна зразае траву), трэба было адкруціць гайку, што трымае гэтыя прылады. Трэба прызнацца, што раней усе гайкі ў маім жыцці — у хаце, камп'ютары ці аўтамабілі — адкручваліся традыцыйна, гэта значыць супраць гадзіннікавай стрэлкі.

Фота Таццяны ШАПУЦЬКІ.

Пасля ўсіх прыгод карэспандэнт Лабадзенка нарэшце можа карыстацца трымерам.

Каб галоўка трымера не круцілася, я, згодна з інстукцыяй, замацаваў яе — засунуў у адтуліну адвёртку (гл. фота). А пасля — як паслухмяны спажывец — узяўся «адкручваць гайку». А яна не ідзе! Во — падумаў я — зусім здохлікам зрабіўся, толькі і хапае моцы, што на камп'ютары па клавішах артыкулы стукаць. Паклікаў на дапамогу сябра Валодзю Казанкова, вэб-рэдактара сайта тэлеканала СТВ. Я трымаў адвёртку ў адтуліне, а Валодзя з усяе моцы круціў гайку. А яна — ні на міліметр! Тады мы вырашылі, што, пэўна, бываюць жа гайкі, якія адкручваюцца і не па-чалавечы. Сталі круціць у іншы бок. Тое самае — колам стаіць. Праводзячы гэтыя практыкаванні, мы здорава раскалупалі тую адтуліну, куды засаджвалі адвёртку — метал мяккі, адвёртка перыядычна саскоквала, дзірка ў выніку павялічылася разы ў два. Была нядзеля — і, зразумела, што прадаўцы трымера, што сэрвіс-цэнтр — не адказвалі.



Трымаючы адной рукой адвёртку ў адтуліне (каб галоўка не круцілася), трэба было адкруціць другой рукой гайку.

— Лабадзенка, кідай дурное, ён нейкі сапсаваны, — падсумаваў Валодзя. — Вязі ў сэрвіс-цэнтр, хай як хочуць адкручваюць.

У панядзелак я вярнуўся да тэмы. Прадавец паведаміў мне, што гайка напраўду адкручваецца не як звычайна, а па гадзіннікавай стрэлцы. Калі я запытаўся, чаму пра гэта ані слова ў інструкцыі, ён адказаў, што прадаў трыста такіх трымераў — і ні ў кога падобнай праблемы не ўзнікла. Прыемна чуць, што з трохсот чалавек адзін ты такі пень аказаўся!..

У сэрвіс-цэнтры майстры нейкім чынам адкруцілі тую гайку. Я папрасіў замяніць мне раздзяўбаную галоўку, бо яна стала горш круціцца пасля маіх спробаў прывесці трымеру рабочы стан.

— А гэта вашыя праблемы, што не дадумаліся, як гайку адкруціць, — адказаў мне начальнік сэрвіс-цэнтра. — Вы яе самі раскалупалі, таму памяняць яе можам толькі за ваш кошт.

Я запратэставаў: у інструкцыі не напісана, як адкручваць гайку. Паведаміў, што скончыў журфак БДУ, дзе — уявіць толькі! — мяне не вучылі адкручваць гайкі.

— Тут вам не Амерыка! — выскаліўся начальнік сэрвіс-цэнтра. — Гэта там вы маглі б з нас спагнаць за тое, што інструкцыя недакладная, а ў нас — плаціце грошы і мяняйце.

Я напісаў ім скаргу ў кнігу прапаноў, забраў трымер і пайшоў дахаты. Дома, каб пацвердзіць свае меркаванні, затэлефанаваў у грамадскае аб'яднанне «Мінскае таварыства спажыўцоў». Яны, што добра, па тэлефоне кансультуюць задарма. Чалавек на тым канцы дроту ўважліва выслухаў мяне і падтрымаў. Маўляў, у нас ёсць ДАСТ, дзе напісана: калі тавар мае асаблівасць выкарыстання, пра гэта трэба папярэдзіць спажыўца ў інструкцыі. Мне параілі напісаць скаргу (што я і сам ужо зрабіў), а калі атрымаю адмоўны адказ, тады звяртацца ў суд.

Я затэлефанаваў прадаўцу трымера. Але ён развёў рукамі: у нас дамова з сэрвіс-цэнтрам — усе пытанні па рамонце і абслугоўванні да іх. Аднак параіў звяртацца не да таго начальніка сэрвіс-цэнтра, а да ягонага дырэктара.

Дырэктара на месцы не было, быў ягоны намеснік спадар Андрэй — па голасе выхаваны чалавек гадоў трыццаці. Ён уважліва мяне выслухаў, узяў інструкцыю — і пагадзіўся, што нідзе не значыцца, як адкручваць тую праклятую гайку. Паабяцаў, што накіруе ліст вытворцам — каб дадалі такі пункт у інструкцыю. А мяне папрасіў прыехаць зноў — ён дасць распараджэнне замяніць мне сапсаваную частку трымера.

Я прыехаў у сэрвіс-цэнтр, як Канстанцін Астрожскі пасля бітвы пад Оршай. Спадар Андрэй асабіста спусціўся ўніз і даў каманду начальніку сэрвіс-цэнтра ў маёй прысутнасці замяніць тую галоўку. Начальнік меў выраз твару — як тры лімоны з'еў.

Я падзякаваў спадару Андрэю за цывілізаваны еўрапейскі падыход да вырашэння праблемы. А сабе падумаў — ну так, тут не Амерыка. Але ж і не Трынідад і Табага!

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

«БЕЛАЎТАДАР» заклікае вярнуць дарожны фонд і ўвесці плату за дарогі

ПРА становішча і паляпшэнне якасці аўтамабільных дарог у краіне журналістам расказаў начальнік упраўлення ўтрымання дарожнай сеткі Дэпартамента «Белаўтадар» Аляксандр ГАЛАЎНЁЎ. Па яго словах, дарожным арганізацыям краіны не хапае фінансавання на бягучы і капітальны рамонт дарог.

Аднак перш чым перайсці да праблемных пытанняў, Аляксандр Фёдаравіч спачатку расказаў пра рэканструкцыю і будаўніцтва новых дарог:

— На сёння дарожная сетка ў краіне налічвае 86 337 кіламетраў, з якіх 15 495 кіламетраў — рэспубліканскія, астатнія — мясцовыя. Паляпшэнне стану дарог — гэта вялікая і амбіцыйная праграма, — сказаў Аляксандр Галаўнёў.

Ён паведаміў, што цяпер пачалося будаўніцтва дарогі ў абход Белавежскай пушчы, засталося дарэканструяваць 103 кіламетры дарогі Мінск — Магілёў, да чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе павінен быць пабудаваны першы этап другой кальцавой дарогі вакол Мінска, вядуцца перамовы з Сусветным Банкам і Кітаем аб выдзяленні крэдытаў на рэканструкцыю дарогі М5 на ўчастках Асіповічы — Бабруйск і Бабруйск — Жлобін адпаведна. Што датычыцца другой МКАД, то геаграфічна яна пройдзе па частцы дарогі М1 ад Дзяржынска і на поўдзень ад Мінска, а таксама ўжо існуючая дарога ад Дзяржынска да Заслаўля будзе перароблена ў чатырохпалосную. Гэта будзе зроблена да 2014 года, а пазней дабудуецца наступны этап ад Заслаўя за Мінскім морам да дарогі Р80. Як расказаў Аляксандр Галаўнёў, інвестар для будаўніцтва другой МКАД яшчэ не выбраны, але цяпер вядуцца перамовы з аўстрыйцамі, немцамі і французамі.

Ёсць пэўныя праблемы ў перамовах і з Кітаем наконт выдзялення крэдытаў на рэканструкцыю беларускіх дарог. Іх сутнасць у тым, што кітайцы даюць крэдыты толькі тады, калі і пераважную большасць прац будуць выконваць кітайскія фірмы:

— Каб атрымаць кітайскі крэдыт, я не магу правесці тэндар: я павінен знайсці кітайскую кампанію і разам з ёй пайсці ў кітайскі банк — толькі тады дадуць крэдыт, — тлумачыць Аляксандр Галаўнёў. — Я павінен за выдадзеныя грошы купіць кітайскае абсталяванне, прыцягнуць кітайскіх спецыялістаў, хоць у нас ёсць сваё не горшае абсталяванне, і магутнасці нашых арганізацый сёння загружаны каля 70 %. Акрамя таго, крэдытаванне мінімум пад 6 % плюс страхавыя рызыкі і далей — атрымліваецца не зусім тое, што нам трэба. Але мы сёння прапрацоўваем гэтыя пытанні, спрабуем паменшыць долю звязанасці крэдыту — кітайскія кампаніі пачыналі з патрабавання, каб 70 % прац выконвалі яны, а цяпер мы падыходзім да долі ў 30 %, што ўжо больш прымальна.

Такім чынам, ходам рэканструкцыі дарог Дэпартамент «Белаўтадар» у прынцыпе задаволены:

— Праграма рэканструкцыі дарог вельмі насычаная: калі апошнія 5 гадоў недзе 40—60 кіламетраў рэканструявалася, то за апошні год мы выходзім на паказчык 100—150 кіламетраў за год, прычым дарог першай катэгорыі. Таму ў плане па развіцці дарожнай сеткі мы ідзём вялікімі тэмпамі і нават перавышаем заданне праграмы Дарогі Беларусі на 2006—2015 гады, — сказаў Аляксандр Галаўнёў.

Але вось на рамонт ужо існуючых дарог «Белаўтадару» грошай не хапае — а толькі на падтрыманне іх у больш-менш належным стане:

— Калі будаўніцтву ў нас надаецца вялікая ўвага, то на ўсё віды рамонтаў на працягу апошніх пяці гадоў сумы сродкаў не павялічваюцца, а падтрымліваюцца на адным узроўні з улікам інфляцыі, — кажа Аляксандр Галаўнёў. — Прычым на некаторыя віды дарожна-будаўнічых матэрыялаў цэны растуць больш хутка, чым інфляцыя, таму перад намі стаіць задача — захаванне стану дарожнай сеткі, мы нават не кажам пра паляпшэнне. Менавіта таму даводзіцца прымяняць непапулярныя ў грамадстве тэхналогіі накшталт ямачнага рамонту і паверхневай апрацоўкі.

Ён паведаміў таксама, што пэўныя праблемы ёсць і з рамонтам мастоў: больш за 650 мастоў у краіне маюць клас грузапад'ёмнасці, не адпаведны сучасным нагрузкам, прыкладна столькі ж мастоў маюць недастатковыя габарыты:

— Мы на 15-20 % штогод павялічваем аб'ём маставых прац, але нам яшчэ не ўдалося спыніць прырост колькасці збудаванняў, што патрабуюць рамонту: мы робім, напрыклад, 20 %, а за год 22 % прырастае...

Асноўную прычыну ў недахопе грошай на рамонт і паляпшэнне якасці дарог «Белаўтадар» бачыць у скасаванні так званага мэтавага дарожнага фонду:

— Напэўна, ліквідацыя дарожнага фонду была не зусім правільнай, бо бюджэт да бясконцасці не расцягваецца і там заўсёды знаходзяцца больш ці менш важныя напрамкі. А калі існаваў дарожны фонд, то ён мэтава выкарыстоўваўся на дарогі, і ў тыя гады якраз адбылося істотнае паляпшэнне стану дарожнай сеткі, — кажа Аляксандр Галаўнёў. — Нагадаю, тады ў дарожны фонд ішоў 1 % ад абароту прамысловых прадпрыемстваў, падаткі з набыцця аўтамабіляў, падаткі з замежных карыстальнікаў дарог, ну і адна з асноўных крыніц папаўнення — акцыз з паліва. Існуе такое меркаванне, што дарожныя фонды выкарыстоўваліся неэфектыўна і не мэтава, аднак нас два разы правяраў дзяржкантроль, і неэфектыўнае і нямэтавае выкарыстанне склала ўсяго 0,1 % ад аб'ёму дарожнага фонду. Зразумела, і такія недахопы — гэта дрэнна, але ў цэлым, я лічу, эфектыўнасць заслугоўвае павагі, — сказаў Аляксандр Галаўнёў.

Ён жа паведаміў, што сёлета на дарожныя працы — рамонт і ўтрыманне — рэспубліканскіх дарог выдзелена 850 мільярдаў рублёў і паспрабаваў прыкінуць, колькі ж трэба насамрэч.

— Колькі я сустракаўся з дарожнікамі іншых краін, але яшчэ ніхто мне не сказаў, што ім хапае грошай на дарогі, — пачаў Аляксандр Галаўнёў. — Што датычыцца ўтрымання дарог, то сума, якая выдзяляецца нам, блізкая да аптымальнай, а калі павялічыць яе на 20 %, будзе зусім добра. Бо існуюць патрабаванні па знешнім выглядзе дарог — каб трава была скошаная да лесу як на полі для гольфа, прыбранае смецце і гэтак далей. Гэта, безумоўна, добра, але таксама каштуе вялікіх грошай. Калі казаць пра бягучы рамонт, то лічбу сродкаў, што выдаткоўваецца на гэта, трэба павялічыць у 2,5 раза, а сродкаў на капітальны рамонт — нават страшна казаць, разоў у 5. Калі сказаць папросту, то мы рамантуем за год 100 кіламетраў з 15 тысяч. Палічыце міжрамонтны перыяд — толькі праз 150 гадоў мы вернемся на гэты ж кіламетр, хоць міжрамонтны тэрмін не павінен перавышаць 20 гадоў.

Такім чынам, «Белаўтадар» прапануе вярнуцца да практыкі фарміравання дарожнага фонду і ўвядзення платы за праезд па дарогах:

— Мы сёння на ўсіх узроўнях выступаем за вяртанне дарожнага фонду, і прычым фонду мэтавага. У першую чаргу мы прапануем вярнуцца да такога паняцця, як акцызы на паліва, якія б ішлі ў дарожныя фонды: гэта найбольш дэмакратычны і правільны метад, які ацэньвае ўзровень карыстання кожным дарожнай сеткі, — лічыць Аляксандр Галаўнёў.

Што датычыцца платы за праезд, то ён расказаў, што яна не будзе ўводзіцца ні ў 2010-м, ні ў 2011 годзе:

— Гэтае пытанне адкладзенае да заканчэння рэканструкцыі да 4 палос дарог паміж Мінскам і абласнымі цэнтрамі. Прычым мы плануем браць плату толькі з грузавых аўтамабіляў агульнай масай больш за 12,5 тоны — каб плацілі тыя, хто зарабляе грошы пры дапамозе дарогі, гэта сусветная практыка. І плата будзе не за сам факт праезду, а за кожны пройдзены кіламетр.

Прынамсі, сёння, па словах Аляксандра Фёдаравіча, плата за праезд па трасе М1 акупляе яе ўтрыманне і часткова рамонт:

— Дарога М1 мае некалькі момантаў, якія змяншаюць яе акупляльнасць. Па-першае, яна не закрытая, гэта значыць, па ёй можна праехаць і не заплаціць, калі аб'ехаць пункты пропуску. Шмат хто так і рабіў пасля ўвядзення аплаты, а цяпер ужо не так: народ пачынае плаціць за камфорт, а не імкнецца праехаць па вёсках і зэканоміць. Ну а па-другое, сёння далёка не ўсе плацяць за гэту дарогу — напрыклад, беларускія карыстальнікі на легкавых аўтамабілях не плацяць наогул, хоць гэта вельмі значная частка транспартнага патоку.

Павел БЕРАСНЕЎ.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года
ОАО «Завод «Легмаш»

(в миллионах белорусских рублей)

АКТИВ	Код стр.	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства			
первоначальная стоимость	101	189 031	192 007
амортизация	102	163 631	163 602
остаточная стоимость	**110**	**25 400**	**28 405**
Нематериальные активы			
первоначальная стоимость	111	2	2
амортизация	112		1
остаточная стоимость	**120**	**2**	**1**
Доходные вложения в материальные ценности			
первоначальная стоимость	121	3 636	1 358
амортизация	122	172	328
остаточная стоимость	**130**	**3 464**	**1 030**
Вложения во внеоборотные активы	140	5 000	5 221
в т.ч. незавершенное строительство	141	3 833	3 993
ИТОГО по разделу I	**190**	**33 866**	**34 657**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	**210**	**8 111**	**12 090**
В том числе:			
сырье, материалы и другие ангалогичные активы	211	4 711	4 833
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	1 743	731
расходы на реализацию	214	1	4
готовая продукция и товары для реализации	215	1 594	6 502
расходы будущих периодов	218	62	20
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	246	6
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	**230**	**575**	**553**
В том числе:			
прочая дебиторская задолженность	232	575	553
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	**240**	**2 042**	**2 089**
В том числе:			
покупателей и заказчиков	241	1 099	841
поставщиков и подрядчиков	242	568	274
по налогам и сборам	243	218	228
по расчетам с персоналом	244	1	
разных дебиторов	245	156	746
Денежные средства	260	585	369
в т.ч. денежные средства на депозитных счетах	261	1	
Финансовые вложения	270	1	1
Прочие оборотные активы	280	882	849
ИТОГО по разделу II	**290**	**12 442**	**15 957**
БАЛАНС (190+290)	**300**	**46 308**	**50 614**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	9 511	9 511
Резервный фонд	**420**	**587**	**874**
В том числе:			
резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством	421	587	874
Добавочный фонд	430	29 913	31 918
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	-1 470	-880
Целевое финансирование	460	118	
Доходы будущих периодов	470	376	369
ИТОГО по разделу III	**490**	**39 035**	**41 792**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		260
ИТОГО по разделу IV	**590**		**260**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610		772
Кредиторская задолженность	**620**	**6 408**	**7 593**
В том числе:			
перед поставщиками и подрядчиками	621	1 493	2 236
перед покупателями и заказчиками	622	4 157	4 753
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	362	331
по налогам и сборам	625	236	124
по социальному страхованию и обеспечению	626	143	132
перед прочими кредиторами	628	17	17
В том числе из строки 625:			
инновационный фонд Минпрома	629	3	4
Задолженность перед участниками (учредителями)	**630**	**794**	**197**
В том числе:			
прочая задолженность	632	794	197
Резервы предстоящих расходов	640		
Прочие краткосрочные обязательства	650	71	
ИТОГО по разделу V	**690**	**7 273**	**8 562**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**46 308**	**50 614**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701	10	
краткосрочная кредиторская задолженность	702	6 398	7 593

АКТИВЫ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ	Код стр.	На начало года	На конец отчетного периода
Арендованные (в т.ч. полученные в пользование, лизинг) основные средства	001	7 000	1 191
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002	5	7
Материалы, принятые в переработку	003	468	252
Бланки строгой отчетности	006	1	1
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007	94	94
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	3 072	3 510
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011		1 358
Нематериальные активы, полученные в пользование	012		284
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013		1
Потеря стоимости основных средств	014	86	107

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 января 2010 года
ОАО «Завод «Легмаш»

(в миллионах белорусских рублей)

Наименование показателей	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	23 772	33 011
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	3 766	5 524
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	**020**	**20 006**	**27 487**
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	17 098	22 032
Валовая прибыль (020-021-030)	**040**	**2 908**	**5 455**
Расходы на реализацию	060	88	98
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	**070**	**2 820**	**5 357**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	1 009	2 493
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	133	147
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	**090**	**876**	**2 346**
В том числе:			
проценты к получению	091	1	1 220
доходы от операций с активами	093	875	1 126
Операционные расходы	100	1 024	2 842
В том числе:			
проценты к уплате	101		140
расходы от операций с активами	102	1 024	1 618
прочие операционные расходы	109		1 084
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)	**120**	**-148**	**-496**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	114	2 594
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	5	
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	**140**	**109**	**2 594**
Внереализационные расходы	150	791	862
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	**160**	**-682**	**1 732**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (070+120+160)	**200**	**1 990**	**6 593**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	334	1 029
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220		1 641
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (200+210-220)	**240**	**2 324**	**5 981**
Налоги на прибыль	250	492	1 381
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	391	447
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	39	102
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	**300**	**1 068**	**4 663**
Прибыль (убыток) на акцию, руб.	320	2	10
Количество прибыльных организаций	330	1	1
Сумма прибыли	331	1 068	4 663

5-9. Информация о дивидендах и акциях, количестве акционеров, задолженности

Показатель	Единица измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	6200	6200
в том числе: юридических лиц	лиц	1	1
в том числе: физических лиц	лиц	6199	6199
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	194	788,00
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	0,407450584960	1,65
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	0,09	0,08
Среднесписочная численность работающих	человек	532	599

Руководитель Бегляк А.С.

Главный бухгалтер Чайкина В.Г.

Дзяржкантроль

Наладзілі выпуск... неканкурэнтаздольнай прадукцыі

З-за непрадуманай інвестыцыйнай палітыкі кіраўніцтвам прадпрыемства «Ваўкавыскбудматэрыялы» наладжаны выпуск прадукцыі (мяшкоў), якая аказалася неканкурэнтаздольнай і не карыстаецца попытам. Пры гэтым было затрачана каля аднаго мільярда рублёў з абласнога бюджэту.

А службовыя асобы прадпрыемстваў «Дзітва» і «Лідскае», купляючы прэсы за кошт інавацыйнага фонду Мінэнерга ў рамках дзяржаўнай праграмы «Торф», не правялі маркетынгавага даследавання, што дазволіла пастаўшчыку завысіць іх кошт на 709,5 мільёна рублёў.

Гэтыя факты былі агучаныя на пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці па выніках праверкі ходу выканання аблвыканкамам, дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі рэгіёна патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 года «Эканомія і беражлівасць — галоўныя фактары эканамічнай бяспекі дзяржавы».

Праверка паказала, што сродкаў на тыя ці іншыя праекты з інавацыйнага фонду Мінэнерга і іншых фінансавых крыніц траціцца нямала, аднак далёка не заўсёды гэтыя грошы «вяртаюцца» адпаведным эканамічным эфектам. У прыватнасці, лічыць Камітэт дзяржкантролю Гродзенскай вобласці, не забяспечана эфектыўнае выкарыстанне 52,6 мільярда бюджэтных рублёў, выдзеленых у 2005—2008 гадах на развіццё льнаперапрацоўчай галіны. 17,5 мільярда рублёў затрачана на праекты (міні-ЦЭЦ, кагенерацыйная ўстаноўка) у адкрытых акцыянерных таварыствах «Мастоўдрэў» і «Альберцін», а заяўленых праектных характарыстык пакуль так і не дасягнулі. Не дасягнуты эканамічны эфект і ад двух праектаў 2008—2009 гадоў па «павышэнні эфектыўнасці выкарыстаня паліва» і «будаўніцтве газаматорнай электрастанцыі» ў ААТ «Гродна Азот». А затраты — ажно 143 мільярды рублёў.

На Лідскай птушкафабрыцы з 2008 года не выкарыстоўвалі абсталяванне для ўтрымання бройлераў коштам 1094 мільёны рублёў, прычым не забяспечыўшы яго захаванасць і дапусціўшы нястачу на 24 мільёны рублёў. І толькі пасля ўмяшання Камітэта дзяржкантролю распачалі працу па ўкараненні гэтага праекта.

А вось групавыя прыборы ўліку цеплавой энергіі на суму 78,2 мільёна рублёў, якія больш за дзесяць гадоў ляжаць на складзе УЖРЭП Ленінскага раёна г. Гродна, ужо наўрад ці спатрэбяцца — састарэлі. Не «пашанцавала» і набытым у снежні 2008-га і сакавіку 2009 года за бюджэтныя сродкі энергазберагальным ПІ-трубам і трубам «Ізапрафлекс» — у колькасці 4,7 тысячы метраў (коштам 465,4 мільёна рублёў). Яны захоўваліся... пад адкрытым небам.

Камітэт дзяржкантролю звярнуў таксама ўвагу на тое, што прадпрыемствы ЖКГ недастаткова тэмпамі працуюць па пераводзе камунальных кацельняў на мясцовыя віды паліва: з 27 набытых згодна з праграмай катлоў устаноўлена толькі 19. Шмат хібаў выяўлена і ў арганізацыі рацыянальнага выкарыстання, уліку і расходавання паліўна-энергетычных і матэрыяльных рэсурсаў. Напрыклад, ТАА «Іўенафтапрадукт» ажыццяўляла рэалізацыю нафтапрадуктаў, мінуючы АЗС, без прымянення касава-падсумоўваючага апарата і адлюстравання выручкі па звестках бухгалтарскага ўліку. А Смаргонскі філіял РДУП «Беларуснафта — Гроднааблнафтапрадукт» у 2008 годзе прадаваў біядызельнае паліва... пад выглядам дызельнага і ў выніку незаконна атрымаў 152,3 мільёна рублёў выручкі.

Камітэтам дзяржкантролю па выніках праверак за дапушчаныя парушэнні ў дачыненні да юрыдычных асобаў прыменена адміністрацыйных штрафаў на суму 1646 мільёнаў рублёў, 54 службовыя асобы аштрафаваныя на 36 мільёнаў рублёў. 45 чалавек прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасці, двое вызваленыя ад пасадаў. У бюджэт даналічана плацяжоў на 16,4 мільярда рублёў. Па матэрыялах праверак заведзены чатыры крымінальныя справы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Кватэрнае пытанне

На «роздум» дзесяць гадоў

Мы з мужам-інвалідам і дачкой, якой налета споўніцца 18, жывём у кватэры сацыяльнага карыстання. Якія правы на яе будзе мець дачка, калі нас не стане?

А.Г., *Мінскі раён.*

Парадак выдзялення жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду вызначаны Палажэннем, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565 (з наступнымі зменамі і дапаўненнямі). Гэтыя жылыя памяшканні выдзяляюцца грамадзянам, якія маюць права на атрыманне такога жылога памяшкання, і жонцы (мужу), якія сумесна з імі пражываюць, іх няпоўнагадовым і поўнагадовым непрацаздольным дзецям і непрацаздольным бацькам, якія не маюць ва ўласнасці жылых памяшканняў у гэтым населеным пункце.

У выпадку выезду наймальніка жылога памяшкання па дагаворы найму жылога памяшкання сацыяльнага карыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду на пастаяннае пражыванне ў іншае жылое памяшканне альбо яго смерці такі дагавор скасоўваецца (спыняецца).

Калі непрацаздольныя поўнагадовыя члены сям'і наймальніка, якія жывуць сумесна з ім, не маюць у карыстанні жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду на падставе дагавора найму альбо ва ўласнасці іншага жылога памяшкання ў гэтым населеным пункце агульнай плошчай 15 кв. метраў і больш на аднаго чалавека, якое адпавядае вызначаным для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням, з адным з іх заключаецца дагавор найму жылога памяшкання сацыяльнага карыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду.

Калі працаздольныя поўнагадовыя члены сям'і, якія жывуць сумесна з наймальнікам, не маюць у карыстанні жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду на падставе дагавора найму альбо ва ўласнасці іншага жылога памяшкання ў гэтым населеным пункце агульнай плошчай 15 кв. метраў і больш на аднаго чалавека, якое адпавядае вызначаным для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням, з адным з іх заключаецца дагавор найму жылога памяшкання сацыяльнага карыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду тэрмінам да 10 гадоў.

На працягу названага тэрміну грамадзянам, якія жывуць у гэтым жылым памяшканні, даецца пазачарговае права ў паляпшэнні жыллёвых умоў шляхам будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання з дзяржаўнай падтрымкай.

Пасля заканчэння тэрміну дзеяння названага дагавора грамадзяне, якія жывуць у гэтым жылым памяшканні, падлягаюць высяленню ў судовым парадку без выдзялення іншага жылога памяшкання.

Віктар САВІЦКІ.

Эпіднагляд

Збіраючыся ў лес, не забудзьце надзець капялюш

У апошнія гады на тэрыторыі Беларусі павялічваецца колькасць кляшчоў. Расце і захваральнасць на клешчавы энцэфаліт і хваробу Лайма, якія перадаюцца з кляшчамі. Як адзначыў урач-паразітолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Андрэй ВЕДЗЯНЬКОЎ, цыркуляцыя віруса клешчавага энцэфаліту ўстаноўлена ў 99 раёнах краіны (76 % тэрыторыі), а ўзбуджальніка хваробы Лайма — у 120 раёнах (92 % тэрыторыі).

Сёлета са скаргамі на ўкусы кляшчоў у медыцынскія ўстановы краіны звярнуліся каля 13,5 тысячы чалавек — на 25 % больш, чым за такі ж перыяд летась.

Назіраецца і пашырэнне арэала гэтых крывасмокаў. Калі раней яны жылі толькі ў лесе, то цяпер «перабіраюцца» на дачныя і прысядзібныя ўчасткі, сустракаюцца ў парках буйных гарадоў. Такім чынам узрастае рызыка заражэння людзей інфекцыямі, якія могуць працякаць вельмі цяжка і нават стаць прычынай інваліднасці.

Каб засцерагчы сябе ад магчымай небяспекі, трэба прытрымлівацца пэўных правілаў.

● Калі вы збіраецеся ў лес, абавязкова надзеньце галаўны ўбор і вопратку, якая б шчыльна прылягала да цела, з зашпіленымі манжэтамі на рукавах. Штаны павінны быць запраўленыя ў боты або перацягнутыя ля шчыкалатак тасьмой ці гумкай.

● Неабходна таксама праз кожныя дзве гадзіны рабіць агляд адзення і адкрытых участкаў цела. Кляшчы бачныя няўзброеным вокам.

● Страсаць варта ўсіх насякомых, якіх вы знайшлі. Акрамя таго, калі вы аматар лясных букетаў ці захапляецеся зборам лекавых раслін, абавязкова агледзьце гэтыя дары прыроды, ператрасіце іх таксама, каб не прынесці ў дом кляшчоў.

● Калі гулялі па лесе з сабакам, агледзьце і яго — кляшчы без цяжкасці могуць перапаўзці з поўсці жывёліны на чалавека ці на пасцельную бялізну, адзенне. Дарэчы, для свайго чатырохногага сябра лепш набыць спецыяльны ашыйнік, апрацаваны сродкам для адпужвання насякомых.

● Для кароткачасовага адпачынку лепш выбіраць адкрытыя паляны без сухастою, ламачча, падалей ад скірдаў сена, саломы, месцаў выпасу і стаянак жывёлы.

Што рабіць, калі клешч усё ж прысмактаўся? Не спяшайцеся выдзіраць яго адным махам — можаце адарваць і пакінуць пад скурай хабаток пераносчыка інфекцыі. Можна змазаць самога кляшча і скуру вакол яго вазелінам, крэмам, абкласці ватай ці марлевым тампонам і заляпіць пласт

УНІВЕРМАГ «БЕЛАРУСЬ» — НЯМА МЕЖАЎ ДАСКАНАЛАСЦІ

Дырэктар Мікалай МЯТЛІЦКІ.

Кантралёр-касір секцыі прадуктовых тавараў Людміла ШЧАРБАКОВА.

Не прадавайце мне тавар, прадавайце станоўчыя эмоцыі! Гэты выраз мог бы стаць маніфестам усіх пакупнікоў. Сапраўды, многія вядомыя эканамісты неаднойчы падкрэслівалі, што пры выбары тавару пакупнік кіруецца не столькі логікай, колькі эмоцыямі. Якасць абслугоўвання наўпрост уплывае на фарміраванне настрою кліента, а адпаведна — і на рост аб'ёмаў продажу.

Калі вы хочаце знайсці патрэбны вам тавар і заадно «падзарадзіцца» станоўчымі эмоцыямі, завітайце ў сталічны ўнівермаг «Беларусь». Тут прадстаўлены самы шырокі выбар прадукцыі — як айчыннай, так і замежнай вытворчасці, на любы густ і кашалёк. Ветлівыя прадаўцы дадуць падрабязную кансультацыю наконт абранага вамі тавару, раскажуць пра ўмовы яго эксплуатацыі, тэхнічныя характарыстыкі, тэрміны гарантыі і г. д. У кожнай секцыі ёсць кніга незадаволенага попыту, дзе любы пакупнік, які не знайшоў тут патрэбны яму тавар, можа пакінуць заяўку. Работнікі ўнівермага аператыўна звяжуцца з прадпрыемствам-вытворцай і пастараюцца ў самыя кароткія тэрміны выканаць заказ.


Прызёр конкурса прафесійнага майстэрства, прадавец секцыі мужчынскага адзення Уладзімір АЛЕЙНІКАЎ.

Ура! Сокі патаннелі!

НЕ СПЫНЯЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

— Наша прадпрыемства даволі сталае — два гады таму мы адзначылі яго 30-годдзе, — патлумачыў **дырэктар універмага «Беларусь» Мікалай Уладзіміравіч Мятліцкі.** — І самае дарагое, што ў нас ёсць, — гэта, бясспрэчна, калектыў, яго традыцыі, з'яднанасць. Больш за палову нашых работнікаў працуюць з моманту адкрыцця ўнівермага. Мы вельмі ашчадна ставімся да сваіх сталых, вопытных супрацоўнікаў, гэта наша эліта. Аднак час няўхільна ідзе наперад, «ветэраны гандлю» выходзяць на заслужаны адпачынак, ім на змену прыходзіць моладзь. Толькі сёлета з Мінскага дзяржаўнага гандлёвага каледжа да нас накіраваны 32 выпускнікі. Мы з'яўляемся базавай арганізацыяй для праходжання вытворчай практыкі навучэнцаў каледжа. Лепшых практыкантаў мы адбіраем і прапануем ім застацца ў нас на пастаянную працу.

Ва ўнівермагу сёння працуе 1200 чалавек. Нашы работнікі маюць вялікі сацыяльны пакет, для іх створана выдатная сацыяльная інфраструктура: у нас ёсць свая сталоўка, медпункт, спартыўная зала, цырульня, свой пакой для адпачынку і рэлаксацыі, бібліятэка, актавая зала. Мы нават адвялі асобныя месцы для тых нашых супрацоўнікаў, хто курыць. На тэрыторыі ўнівермага курэнне забаронена, але, улічыўшы, што нашы работнікі — жывыя людзі і не ўсе ў стане зусім адмовіцца ад шкоднай звычкі, мы абсталявалі спецыяльныя месцы для курэння — на вуліцы і ўнутры (адвялі асобны пакой). Там жа вывешваем інфармацыю пра шкоднасць цыгарэтаў для здароўя. Мы не дзейнічаем выключна забаронамі, агітуем за здаровы лад жыцця, і я з прыемнасцю магу канстатаваць, што станоўчыя вынікі відавочныя: курцоў у нашым калектыве становіцца ўсё менш і менш.

На прадпрыемстве арганізавана свая мастацкая самадзейнасць, акрамя таго, калектыў універмага бярэ ўдзел у масавых спартыўных мерапрыемствах горада, раёна і вобласці, рэгулярна выязджае на турзлёты.

...У сталіцы ледзь не кожны дзень адчыняюцца новыя магазіны, гіпер- і супермаркеты. Ва ўмовах такой жорсткай канкурэнцыі нашаму ўнівермагу спыняцца на дасягнутым нельга. Змены ў нас адбываюцца амаль кожны год — няма межаў дасканаласці. Укараняюцца новыя формы, новыя метады арганізацыі гандлю. У прыватнасці, большасць аддзелаў пераводзіцца на самаабслугоўванне. Гэта прагрэсіўная форма гандлю, якая, па-першае, дае пакупніку свабоду выбару, магчымасць бліжэй разгледзець тавар, памацаць яго, па-другое, палягчае працу прадаўцоў, па-трэцяе, павышае тавараварот. Напрыклад, пасля таго, як мы пашырылі плошчы і перавялі на самаабслугоўванне харчовую секцыю, тавараварот там павялічыўся больш чым удвая.

Мы ідзём па шляху перадачы складскіх памяшканняў на карысць гандлёвых (літаральна на днях пашырылі секцыю дываноў). Тавар павінен знаходзіцца не на складах, а ў гандлёвых залах, у «абарачэнні». Чым хутчэй мы яго выставім на продаж, тым хутчэй ён рэалізуецца, а, значыць, прынясе эканамічны эфект.

Яшчэ адзін кірунак, які мы цяпер актыўна развіваем, гэта пераход на абслугоўванне салоннага тыпу, калі на адной гандлёвай плошчы аб'яднана некалькі груп тавараў блізкай тэматыкі. Гэта робіцца для таго, каб пакупнік мог зайсці ў адзін аддзел і набыць там усё неабходнае. Напрыклад, у салоне дзіцячай вопратке акрамя бялізны для нованароджаных прапануецца трыкатаж і верхняе адзенне для школьнікаў, для падлеткаў — і для дзяўчынак, і для хлопчыкаў. У адным месцы можна цалкам апрануць дзіця — ад бялізны да касцюма і куртачкі. Летась мы аб'ядналі і перавялі на самаабслугоўванне гаспадарчую секцыю (сінтэтычныя мыйныя сродкі, бытавую хімію, гаспадарчыя прылады). Цяпер пакупніку ў пошуках розных гаспадарчых тавараў не трэба бегаць па паверхах і секцыях.

Першапачаткова ўнівермаг будаваўся як гандлёвае прадпрыемства з вялікай колькасцю дробных спецыялізаваных секцый, цяпер мы імкнёмся максімальна ўзбуйніць секцыі, аб'яднаць іх у салоны, каб, напрыклад, на адным паверху засталося ўсяго 4 секцыі — мужчынскі салон, жаночы, салон радыётавараў і салон гаспадарчых тавараў. Гэта максімальна спросціць арыентацыю ва ўнівермагу, пакупнік не будзе губляцца ў пошуках канкрэтнага тавару.

...Нягледзячы на аб'ектыўныя цяжкасці, з якімі давялося сутыкнуцца кожнаму гандлёваму прадпрыемству падчас пераадолення наступстваў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, універмаг «Беларусь» працуе з прыбыткам. За два апошнія гады тавараварот універмага вырас у 1,6 раза. На такую ж лічбу выраслa яго рэнтабельнасць і заробак работнікаў.

Веласіпеды беларускай вытворчасці ў шырокім асартыменце.

— Галоўнае, каб крызісу не было ў галовах, — падкрэсліў дырэктар. — Увогуле, усё залежыць ад каманды. А каманда ў нас (пачынаючы з прадаўцоў і заканчваючы намеснікам дырэктара) — моцная, з'яднаная, высокапрафесіянальная. Радыкальных зменаў ва ўнівермагу мы не праводзілі. У нас ёсць цудоўныя традыцыі папярэдніх гадоў, ёсць касцяк калектыву, які іх падтрымлівае. Наша задача — захаваць усё самае лепшае, што напрацавана калектывам за 32 гады, не згубіць выдатныя дасягненні мінулага і прымножыць іх. Карыстаючыся выпадкам, хачу павіншаваць усіх сваіх калег горада Мінска і Рэспублікі Беларусь з нашым прафесійным святам — Днём работніка гандлю, пажадаць поспехаў, удачы ў гэтай нялёгкай, але неабходнай справе, а ўсе крызісы, як гавораць беларусы, «хай ідуць на сухі лес».

КОЖНЫ ПРАДАВЕЦ — ПСІХОЛАГ

...Напрыканцы чэрвеня на базе ўнівермага «Беларусь» прайшоў гарадскі конкурс прафесіянальнага майстэрства, у якім узялі ўдзел многія буйныя гандлёвыя прадпрыемствы сталіцы. Па выніках прафесійных спаборніцтваў прадстаўнік універмага «Беларусь» — 21-гадовы **прадавец мужчынскага адзення Уладзімір Алейнікаў** заняў пачэснае другое месца. Прычым з мінімальным ад пераможцы адрывам — усяго ў адну дзясятую бала.

— На конкурсе нам было прапанавана выканаць 10 заданняў, — дзяліўся ўражаннямі лаўрэат. — Самым складаным было заданне на запамінанне 10 прадметаў за 15 секунд. Пры гэтым важна было запомніць і агучыць менавіта правільныя поўныя назвы тавараў, напрыклад, «нажніцы манікюрныя», «партманет мужчынскі». Самым лёгкім асабіста для мяне стала заданне на веданне закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў» (рыхтуючыся да конкурсу, я дасканала яго вывучыў). Было яшчэ заданне па афармленні вітрыны (выкладцы тавараў сваёй секцыі), заданне на кемлівасць. Хатнім заданнем было прадстаўленне падарунка — неабходна было падрыхтаваць, прыгожа афарміць і падарыць тавар па тэме маёй секцыі. Разам з мастакамі ўнівермага мы прыдумалі арыгінальны падарунак — альбом для сучаснага маладога мужчыны, які ўступае ў самастойнае жыццё. У альбоме магнітныя лісты і сілуэты мужчын — у спартыўным, класічным і вячэрнім стылі, а таксама вялікая колькасць варыянтаў адзення ў азначаных трох стылях — на магнітах. Сілуэты можна па-рознаму апранаць, камбінаваць дэталі паміж сабой, каб малады чалавек змог навучыцца самастойна падбіраць свой гардэроб. Прэзентацыя альбома была прадстаўлена ў вершах.

Ва ўнівермагу «Беларусь» я працую трэці год. У свой час патрапіў сюды на практыку пасля заканчэння гандлёвага каледжа і вырашыў застацца. У нас вельмі добразычлівы калектыў. Вазьміце любую секцыю — там працуюць добрыя, чуллівыя людзі. Гэта мяне і падкупіла. Менавіта таму я і застаўся тут на пастаянную працу.

Для таго, каб стаць сапраўды выдатным прадаўцом, неабходна любіць свой тавар, дасканала яго ведаць, ён павінен быць блізкі табе. І, зразумела, трэба любіць людзей, умець «гасіць» змрочны настрой пакупніка, напаўняць чалавека станоўчымі эмоцыямі. Кожны прадавец па-свойму псіхолаг. Галоўнае — зразумець, што канкрэтнаму пакупніку трэба, і прапанаваць менавіта той варыянт, які яму падыдзе. І калі пакупнік адыходзіць з усмешкай, задаволены пакупкай, ты разумееш, што стараўся не дарэмна.

ПАКУПНІКУ НА ЗАМЕТКУ

Ва ўнівермагу «Беларусь» пастаянна праводзяцца выставы, пашыраны продаж пэўных груп тавараў, дэманстрацыі мадэляў, дэгустацыі, рэкламныя акцыі, сезонныя і святочныя распродажы і г.д. Напрыклад, да канца ліпеня тут зніжаны цэны на тэлевізары як айчыннай, так і замежнай вытворчасці, на DVD-плэеры «Віцязь», на халадзільнікі, маразільнікі і пральныя машыны «Атлант», на летнія жаночы абутак «Марка», на купальнікі «Мілавіца», на ювелірную прадукцыю, на фарфоравы посуд, на мікрахвалевыя печкі, на патэльні і кухонныя прылады, на шпалеры, на сінтэтычныя мыйныя сродкі і г.д. Памер зніжак вагаецца ад 9,7 і да 21 працэнта. Філіял на вуліцы Маскоўскай (магазін «Прамтавары») з мая па верасень па выхадных днях прапануе пакупнікам 10-працэнтныя зніжкі на ўсе нехарчовыя тавары.

Напярадзе новы вучэбны год, і ўнівермаг загадзя рыхтуе самы разнастайны асартымент школьных тавараў — ад аддзення да канцтавараў. Завітайце ва ўнівермаг «Беларусь» і вы не толькі набудзеце патрэбны тавар, але і атрымаеце станоўчыя эмоцыі ад пакупкі і абслугоўвання.

Інга МІНДАЛЁВА,
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Выкарыстаць момант зніжак на пральныя парашкі раіць прадавец Валерыя УРУБЛЕЎСКАЯ.

Як больш выгадна і зручна купіць халадзільнік ці пральную машыну беларускай вытворчасці ў крэдыт, растлумачаць у секцыі.

Купляйце тэлевізары летам! Можаце зэканоміць да 900 тысяч рублёў.

Прадавец Людміла ПАТУРАЕВА шчыра раіць, што лепей купіць дзіцяці.

Международный Резервный Банк

220075, г. Минск, пер. Промышленный, 11
тел./факс: (017) 299 69 00, тел. (017) 299 69 02
e-mail: info@irb.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 г.

ОАО «Международный резервный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	01 июля 2010 г.	01 июля 2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		1 396,5	986,1
3	Средства в Национальном банке	1102		128,6	6 563,7
4	Ценные бумаги	1103		4 020,6	-
	для торговли	11031		4 020,6	-
	удерживаемые до погашения	11032		-	-
	в наличии для продажи	11033		-	-
5	Кредиты и другие средства в банках	1105		3 814,3	9 708,7
6	Кредиты клиентам	1106		7 617,4	2 408,4
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107		0,0	-
8	Основные средства и нематериальные активы	1108		952,8	928,2
9	Прочие активы	1109		2 302,2	949,1
10	**ИТОГО активы**	110		20 232,4	21 544,2
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202		-	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205		199,8	3 083,9
14	Средства клиентов	1206		998,0	928,5
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		-	-
16	Прочие обязательства	1209		1 175,1	127,4
17	ВСЕГО обязательства	120		2 372,9	4 139,8
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211		16 137,8	16 137,8
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		313,8	280,6
22	Накопленная прибыль	1214		1 341,7	973,6
23	Фонд переоценки статей баланса	1215		66,2	12,4
24	ВСЕГО капитал	121		17 859,5	17 404,4
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	12		20 232,4	21 544,2
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301		28 804,9	15 448,4
28	Обязательства	1302		28 496,8	15 380,7

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 г.

ОАО «Международный резервный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	01 июля 2010 г.	01 июля 2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		878,7	1 267,4
2	Процентные расходы	2012		15,7	54,1
3	Чистые процентные доходы	201		863,0	1 213,3
4	Комиссионные доходы	2021		2 351,5	177,2
5	Комиссионные расходы	2022		179,4	25,4
6	Чистые комиссионные доходы	202		2 172,1	151,8
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203		494,0	684,2
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		208,4	-
9	Доход в форме дивидендов	205		-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206		252,0	38,8
11	Прочие доходы	207		111,1	231,4
12	Операционные расходы	208		2 588,7	1 665,7
13	Прочие расходы	209		269,0	252,3
14	Налог на прибыль	210		142,4	45,8
15	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	2		596,5	278,1

И.о. Председателя Правления **А.Е. Добровольский**
Главный бухгалтер **С.С. Ящук**
Дата подписания 20 июля 2010 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 от 01.01.2010 г.
Кор/счет 3200007350013 в РЦ НБ РБ, МФО 153001735

ЛІЛЕІ Ў РОСКВІЦЕ

ЛЮБІМЫЯ КВЕТКІ

Васіль дэманструе паўмахровую лілею «Блондзі» — сапраўдную бландзінку з лёгкім жоўтым адценнем. Гаспадар бязлітасна абрывае з прыгожай кветкі пялёсткі: з-за анамальнай спёкі лілеі расцвілі сёлета раней, а падвялыя пялёсткі могуць стаць глебай для небяспечнай для расліны шэрай гнілі.

У Васіля далоні жоўтыя ад яркага пылку лілеяў:

— Са светлай адзежы адмываецца цяжка, сцеражыцеся! А ў мяне разам са скурай змываецца!

Рукі кветкавода не баяцца працы. За працоўнае жыццё 42-гадовага Васіля праз іх прайшлі толькі лілеяў тры сотні гатункаў! Аднак у гаспадарцы Французёнкаў не толькі лілеі: на пачатку вясны да іх у госці едуць атрымаць асалоду ад яркіх цюльпанаў, цяпер у дварыцвітуць разнастайныя фуксіі, а ў агародзе можна сустрэць і эхінацыю, на аснове якой ствараюцца лекі для падтрымкі імунітэту супраць грыпу і прастуды.

Уласна кажучы, кветкі — гэта хобі Васіля і Ганны, якое стала іх сямейнай справай. Васіль родам з Мінскай вобласці, і ў бацькоўскай гаспадарцы на вельмі бедных сухіх глебах ён з дзяцінства з цікаўнасцю вырошчваў лілеі, цюльпаны і ружы. Стараў нават штучную глебу: выкопваў зямлю па калена і замяняў урадлівай.

Калі малады чалавек стаў студэнтам Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, то дарыў любімыя кветкі сваёй каханай Ганне. Яна падзяліла захапленне мужа. І ўрэшце аграном па адукацыі і выкладчык акадэміі разам з жонкай заснаваў сваю ўласную кветкавую гаспадарку.

— Гэта маё прызванне! — проста гаворыць Васіль.

ЛЁГКАЯ РУКА

Зямля вакол дома Французёнкаў у Горках патанае ў сакавітай зеляніне і стракаціць яркімі фарбамі. З акна выглядваюць белыя і ружовыя архідэі. Хочацца пагладзіць круглую тую, якая падобная на мяккага вожыка. Дрэва(!) фуксіі літаральна засыпана яркімі чырвона-фіялетавымі кветкамі. Дэкаратыўныя мяцёлкі розных адценняў зялёнага, і нават з жоўтымі крапінамі, утвараюць востраў пасярод кветак.

Крэслы пад сонечным парасонам нібыта запрашаюць расслабіцца і прыняць сеанс водараторапіі, але самім гаспадарам удаецца толькі на хвілінку спыніцца, захапіцца прыгажосцю раслінаў і... хуткчэй за матыку!

— Гэта вялікая праца: мы ўвесь дзень з матыкамі, вёдрамі для паліву, — кажа Ганна. — Сагнуцца, на каленках, а можна і напаўляжачы, калі зусім сілаў нестае.

— У адрозненне ад вытворчасці садавіны і агародніны, дзе працэсы хімізавалі і механізавалі, вырошчванне кветак застаецца амаль цалкам ручной працай, — каментуе Васіль. — Ёсць секатары, паліваючыя пісталеты, апырсквальнік. Але ўсё гэта трэба трымаць рукамі.

Аднак усё ж галоўная зброя кветкавода — лёгкая рука.

— Ну што ж, цяпер гэта паняцце ўжо мае навуковае тлумачэнне, — разважае Французёнак. — У кожнага чалавека ёсць біяэнергетыка, і яна робіць уплыў на расліну. У чалавека з негатыўнымі думкамі кветкі расці не будуць. Так што лёгкая рука і любоў да раслін павінны быць.

Кветкаводы называюць сваю справу вельмі цяжкай. Яны кажуць, што такой справай можна займацца толькі тады, калі па-сапраўднаму яе любіш.

ПРАЦОЎНАЯ СПЁКА

Яркія фуксіі з цяжкасцю пераносяць высокія тэмпературы. Гэтая прыгожая расліна родам з умераных шыротаў Паўднёвай Амерыкі і можа ў нашы 35 градусаў з плюсам пазбавіцца не толькі кветак, але і лісця.

— Спякота — гэта проста бедства для кветак, — уздыхае Васіль.

У Горках ужо тры тыдні няма дажджу. І нават напярэдадні, калі навокал грымела навальніца, на зямлю Французёнкаў не ўпала ні кроплі. Кажуць, што існуе Горацкая прыродная анамалія, але сёлетняя сухая гарачыня перавысіла ўсе перасцярогі кветкаводаў. Ім, зразумела, даводзіцца яшчэ больш працаваць: паліваць, рыхліць зямлю і выдаляць пустазелле, якое забірае ў раслін вільгаць і пажыўныя рэчывы.

— І, зразумела, паліваць у сонейка нельга, — паміж справай нагадвае аматарам Васіль. — Кроплі вады дзейнічаюць як лінзы і атрымліваюцца апёкі. Карані раслін у экстрэмальных умовах спёкі працуюць дрэнна, а паліў можа яшчэ пагоршыць сітуацыю.

Гэта правіла, дарэчы, датычыцца не толькі кветак, але і ўсёй агародніны. На ўскрайку поля з лілеямі Французёнкі ўсё ж такі маюць невялікія грады з цыбуляй, буракамі, таматамі, агуркамі і духмянымі зёлкамі. Яны аднавілі нават вырошчванне бульбы:

— Так, бульба даступная і яе можна набыць. Але мы занепакоены якасцю. Атрымліваецца, што сваё ўсё ж такі больш экалагічнае і смачнае. Падаецца, што ў Беларусі цяпер было б вельмі актуальна заняцца вытворчасцю менавіта экалагічна чыстай прадукцыі, якая б мела вялікі попыт у нашай краіне і за яе межамі, у Еўропе.

ПАЎЛІНЫ ЗАМЕСТ КУРЭЙ

Французёнак — прозвішча незвычайнае для Гораччыны.

— Крупскі раён, адкуль я родам, — гэта перакрыжаванне ўсіх дарог, — тлумачыць Васіль. — І адтуль з 1812 года, я мяркую, і цягнецца маё прозвішча. Дарэчы, адтуль жа вядомае прозвішча Машэраў — ад «мон шэр» трансфармавалася. У нас там такіх шмат.

Але нягледзячы на такое звычайнае тлумачэнне, горацкія Французёнкі — усё ж незвычайныя, цікавыя людзі. Напрыклад, замест курэй у іх гаспадарцы жывуць паўліны — Кіруха, Пятруха, Кузя і Ляля. Яны добразычліва распускаюць для гасцей свае неверагодна прыгожыя хвасты, а малодшы яшчэ і прытанцоўвае на просьбе гаспадыні. Паўліны гучна крычаць, і нездарма гэтых птушак баіцца нават хатні кот. Птушкі выдатна прыжыліся, хоць сёлетняй халоднай і снежнай зімой давялося выдзяліць ім асобны абагравальнік.

Васіль, на здзіўленне многіх, дзеля сваёй любімай справы кінуў добры заробак у сталічнай фірме і сталую выкладчыцкую працу ў Горках, а цяпер шчаслівы мець сваю гаспадарку, якая ўрэшце пяройдзе ў спадчыну дзецям.

Васілю за ўсё сваё жыццё так і не ўдалося пакуль пабываць у паўнавартасным адпачынку: ён не можа кінуць свой кветкавы агарод ні на дзень. Надзея тут толькі на дачок, якія падрастаюць. Дзяўчынкі якраз маюць тую самую лёгкую руку, якая так патрэбна кветкаводу. У малодшай Антаніны прыжываецца ўсё, што ні пасадзіць у зямлю.

— Мая самая любімая расліна — гэта мірт, — паказвае дзяўчына на зялёны куст, які зацвітае дробнымі белымі кветачкамі. — Ён вельмі карысны і нават лячэбны.

ФУКСІІ Ў ДОБРЫЯ РУКІ

Ганна Французёнак — прыватны прадпрымальнік, і разам з мужам яна гандлюе кветкамі:

— Кветкавы бізнэс дае магчымасць зарабіць, але ён рызыкоўны, і нам даводзіцца хвалявацца аб хлебе надзённым.

Вядома ж, кветкі — тавар нятанны. Напрыклад, адна лілія каштуе цяпер прыкладна 5 тысяч рублёў, але нават калі не ўлічваць сваёй штодзённай працы, выдаткі на набыццё пасадачнага матэрыялу і сродкі абароны раслін вельмі значныя.

Горацкія кветкаводы працуюць па пошце, праз садовыя цэнтры альбо самі выязджаюць на рынак.

— Я быў выхаваны ў духу камунізму і пражыў сапраўдныя пакуты, пакуль нешта вырашыўся прадаваць, — прызнаецца Васіль. — Для мяне было вялікім стрэсам першым разам выехаць на рынак. Але я заўсёды разумеў, што ў гэтым нічога няма прыкрага. Гэта нармальна — гандляваць вынікамі сваёй працы.

Праўда, у кветкавых крамах Горак вы наўрад ці знойдзеце лілеі ад Французёнкаў. Кветкаводы жартуюць: маўляў, Галандыя бліжэй. Хоць якасць і асартымент горацкіх лілей зусім не саступаюць замежным, але крамы прытрымліваюцца звыклых схемаў.

Тым не менш Французёнкі прадаюць лілеі: у цыбулінках — ад 2 да 12 тысяч рублёў, у гаршках — ад 3 да 15 тысяч рублёў. Цяпер на рынках прапануюць шмат выкапаных лілей, якія цвітуць. Яны звычайна прыжываюцца, але прафесіяналы лічаць, што больш надзейна набываць расліны з закрытай каранёвай сістэмай у гаршках, якія можна высадзіць у адкрыты грунт у любы момант.

У жніўні і верасні, калі прыйдзе больш халаднаватае надвор'е, зацвітуць у поўную моц фуксіі. Адна культура — а такія розныя формы і колеры! Невялікая фуксія, якая цвіце, каштуе ў Горках 7-8 тысяч. Самыя эксклюзіўныя — да 40 тысяч рублёў. Увогуле, гэта зусім простая расліна, якую могуць вырошчваць усе, і спецыяльных ведаў для гэтага зусім не трэба.

— Многія людзі, калі набываюць шматгадовыя расліны, просяць прадаць ім нешта прыгожае, неераборлівае і каб не патрабавала догляду, — расказвае Васіль. — Можа, тады штучныя расліны? Не? Большасць нашых раслінаў неераборлівыя: трэба проста любіць іх і даглядаць.

Ілона ІВАНОВА.
Фота Ірыны САВОСІНАЙ.
г. Горкі.

ЖАРТ З НЕЗНАЁМЦА ПАВЯРНУЎСЯ ДЛЯ ДЗВЮХ ДЗЯЎЧАТ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВАЙ

Недарэчны жарт павярнуўся для дзвюх дзяўчат крымінальнай справай, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА **прэс-афіцэр Першамайскага РУУС Мінска Вольга КУЦЬКО**.

Выпадак адбыўся на аўтавакзале «Маскоўскі» ў Мінску. Малады чалавек — выхадзец з беларускай глыбінкі — пасля чарговага працоўнага тыдня вырашыў правесці выхадныя на малой радзіме. Чакаючы аўтобуса, хлопец пазнаёміўся з дзвюма дзяўчатамі. Разам з імі ён ужываў піва, а затым адна з новых знаёмых прапанавала адысці для «больш цесных» стасункаў.

Парачка накіравалася да бліжэйшых кустоў, дзе кавалеру было прапанавана распранацца. Нецвярозы хлопец спешна скінуў вопратку, пасля чаго дзяўчына і яе сяброўка схапілі ўсе яго рэчы і зніклі. Пацярпелы спадзяваўся, што яны вернуцца, але гэтага не адбылося. Голы хлопец быў вымушаны выйсці з-за кустоў і звярнуцца па дапамогу да мінакоў, якія выклікалі міліцыю. Вартавыя парадку даволі хутка затрымалі дзяўчат.

Затрыманыя патлумачылі, што хацелі пажартаваць. Аднак па законе такі ўчынак — злачынства. Менавіта таму ў дачыненні да абедзвюх заведзена крымінальная справа па ч. 2 арт. 206 «Грабеж» КК Беларусі, якая прадугледжвае да шасці гадоў пазбаўлення волі.

Кар. БЕЛТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Два полюсы

ШТО ШУКАЕМ?

Зчым шчыра згодны, дык з тым, што ў такую спякоту насамрэч разумныя думкі ў галаве, як марожанае, хуценька плавяцца... І ў гэтым пытанні большасць мужчын і жанчын, калі, вядома, яны — не фанаты спякоты, бадай, на адным «полюсе», ужо не першы тыдзень спякотным.

Калі раней любіў піва — хацеў бы стаць дэльфінам у моры піва. Цяпер, калі выпіваю гэты пенны напой толькі «на халяву» (ну, не ведаю я, дзе купіць насамрэч смачнае піва), дзе ж знайсці піўнога спонсара для карпункта? А лепш, спонсара ў міні-спадніцы!

Набраў у інтэрнэце камбінацыю слоў «сапраўдная жанчына». Ажно 41 мільён адказаў! А вось на запытанне «ідэальная жанчына» «толькі» 17 мільёнаў. Паказальна, аўтары «на прызямленні».

Дарэчы, для параўнання, аналагічнае запытанне пра мужчын дала адпаведна 31 і 13 мільёнаў адказаў. Узорная «дыскрымінацыя»! Не буду нічога цытаваць. Чытачы не дурнейшыя за нас, залезуць у віртуальнае павуцінне і самі пры вялікім жаданні змогуць усё прачытаць.

Чамусьці зараз успомніў, на мой погляд, вельмі актуальныя словы па нашай тэме. Ад «зорнай асобы». Іх выказаў наш зямляк — папулярны кампазітар і выканаўца Ігар Карнялюк. Ён дарэчы, паставіў на «базары» нечаканы рэкорд. Адказваў на пытанні журналістаў ажно больш за 1 гадзіну 40 хвілін (звычайна «зорная гадзіна» цягнецца каля 60 хвілін). Дык сказаў ён, што да 40 гадоў у стасунках з жанчынамі мужчына — юнак: думае не заўсёды галавой. Пры ўсім тым, што са сваёй жонкай ён жыве, калі не памыляюся, ужо пад трыццаць гадоў. А яму ж яшчэ і пяцідзесяці няма. Напэўна, у гэтым сэнсе, як творчы чалавек, — ён унікум. Колькі разоў жаніліся, скасоўвалі шлюб ягоныя калегі па творчым цэху! І гэта толькі афіцыйна. На жаль, Ігар не паведаміў, чым ва ўзросце да 40 думае жанчына.

Або ўзорным можа быць прыклад таго, як склаўся лёс у гераіні фільма «Масква слязам не верыць». Памятаеце, у яе пасля 40 жыццё толькі пачынаецца. І яна абавязкова, паводле ідэі сцэнарыста, сустрэне свайго не вельмі ўдачлівага, але такога «сапраўднага» Жору!!!

Між іншым, на тым жа мінулым «базары» выпадкова ўбачыў сваю былую «сапраўднасць». Сядзела на пешаходнай вуліцы і малявала партрэты мінакоў за грошы. А мы выпадкова праходзілі міма разам з маім паважаным калегам спадаром Анатолем.

Я так і не падышоў да «свайго мінулага». «З кім ты? Дзе ты? Мне ўсё роўна...» — проста як у той песні памянёнай «зоркі». А не ўзяла са мной калісьці шлюб таму, што... Хацела нявіннасць страціць толькі пасля шлюбу. Я, дурань, падтрымаў гэтую яе ідэю. Яна пайшла на курсы кіроўцаў і пазнаёмілася там з нейкім хлопцам. Мяне назвала сэксуальна разбэшчаным. І гэта за тое, што я так чакаў, спадзяваўся... Што дзіўна, праз нейкі час яна зноў пажадала сустракацца са мной. Ды я ўжо іншую знайшоў. А, памятаю, да гэтага вельмі перажываў: «За што, чаму кінула, прамяняла?»...

Я думаю, што «сапраўднасць» супрацьлеглага полу можа быць у тым, што дапаўняе цябе. Напрыклад, я — вельмі эмацыйны, таму вельмі было б добра, каб спадабаўся ў свой час спакойнай, ціхай жанчыне. Хе-хе. Ды не падабаліся мне такія!!! І ў выніку: я перыядычна «качаю правы», мая цяперашняя крычыць. Затое трохі пашанцавала: я раўную нават у снах, а яна — не!!! Такая па-свойму ўнікальная.

Наконт твайго знаёмага, Віка, які выдаў пытанне: «А тады навошта мне жонка?» Калі шчыра, я згодны з табой наконт таго, што ніхто нікому нічога не павінен. Але прызнаюся на ўсю краіну, калі гэта тычыцца зноў-такі мяне любімага. Наконт таго, што трэба кінуць усе справы і выканаць чарговае «патрабаванне», наконт рамонту сантэхнікі, забівання цвікоў...

Але калі б на месцы маці маіх дзяцей раптам, як у казцы, апынулася «ідэальная» гарачая штучка без аналагічных патрабаванняў — проста сэкс-бомба, якая не ўмела б кухарыць... Я б гэтую мару амаль усіх мужчын, верагодна, доўга не зацягваючы, вярнуў бы, як у яшчэ адным фільме (памятаеце, пра знаёмствы), як той армянін, якога іграў Мкртчан: «Раніцай яечня, на абед яечня»...

Напрыканцы пра думку маёй паважанай апаненткі пра тое, што (цытата): «Сапраўдны мужчына павінен быць»...

Мо таму дзясяткі тысяч дзяўчат толькі ў нашай краіне ва ўзросце даўно за трыццаць гадоў усё чакаюць свайго Прынца? Таму адмаўлялі ва ўступленні ў шлюб іншым. У выніку ні сям'і няма, ні дзяцей. Асабіста ведаю некалькі прадстаўніц «партыі ідэалаў» (некаторыя, дарэчы, і мяне бракавалі). У пераважнай большасці ў іх жанаты палюбоўнік. Ці жэніцца? Ніколі. Ці «пойдзе» такі «каханы» (чытай: партнёр) на дзіця? За рэдкім выключэннем, навошта сямейнаму мужыку дадатковыя траты і праблемы? Таму і не грэх тым жанчынам, у каго ёсць жанатыя палюбоўнікі, паралельна на сайтах знаёмстваў шукаць ідэал?

А наогул, як можна марыць сустрэць чалавека, якога можна было б назваць ідэальным? Камусьці ў стылі «Кіркараў», іншым «Абрамовіч»? Ці, што яшчэ лепш, яны ж і іншыя ў «адным флаконе»?

Я шчыра лічу ідэальнай Крупскую. Доўга тлумачыць чаму, тым больш у такую спякоту. Сапраўдны таварыш па барацьбе, у ссылку, куды трэба па заданні партыі разам з каханым. І ў апошні час усё больш пішуць, нераўнівай была... Так што патэнцыйныя «сапраўдныя» жанчыны, бярыце прыклад. Каб дзеля вас «сапраўдныя» мужчыны не спяшаліся ў ЗАГС з «кім папала» і не шукалі немаведама што.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У ПОШУКАХ САПРАЎДНАГА

...У такую спёку ляніва не тое што варушыцца — думаць. Хіба што пра тое, як добра было б ператварыцца на пэўны час у дэльфіна ці нават пінгвіна, перасяліцца ў ваду і там перасядзець чарговыя метэаанамаліі. Ці маляваць у думках ідэальны адпачынак — каму горы, каму мора, каму тэлевізар, гамак і халадзільнік. Вось, дарэчы, пра ідэал. Прапаную гэтым разам, пакуль яшчэ не скончылася паласа водпускаў і курортных раманаў, пагаварыць пра мой любімы штамп — «ідэальны мужчына/жанчына». Ёсць яшчэ варыянт — «сапраўдны». Але сутнасць ад гэтага не мяняецца — дзіўны від, ці то занесены ў Чырвоную кнігу, ці то выкапнёвы, ці ўвогуле ад пачатку і да канца прыдуманы, але дагэтуль закладзены ў аснову нашых рамантычных чаканняў.

Час ад часу і мяне «чапляе» гэтае вечнае пытанне: што ж яна за істота такая — «сапраўдная жанчына»?

Адказы ва ўсіх розныя. Дзеля цікавасці можаш паспрабаваць скласці партрэт ідэала па роспытах знаёмых. Магу паспрачацца, большасць гэтых разваг будзе пачынацца словамі «сапраўдная жанчына павінна...» (далей пойдуць варыяцыі — «умець выдатна гатаваць», «заўжды цудоўна выглядаць», «быць добрай маці», «ствараць утульнасць адной сваёй прысутнасцю» і г.д.). У вялізнай інфармацыйнай смятніцы інтэрнэту таксама пры жаданні знойдуцца сотні і тысячы «запаведзяў сапраўднай жанчыны», «прыкмет» і «партрэтаў ідэальнай жанчыны» з гэтымі ж зграбнымі зваротамі «сапраўдная жанчына заўжды павінна» ці, наадварот, «ніколі не павінна». І рэдкія, рэдкія адзінкі задумаюцца, перш чым ужываць падобнае клішэ: а чаму, уласна кажучы, павінна? Каму? Што значыць — «павінна ўмець гатаваць»? А калі не ўмее, то што — не жанчына? Ці не сапраўдная? Можа, па гэтай тэхніка-тактычнай характарыстыцы нехта выдае жанчынам сертыфікат якасці і адпаведнасці ГОСТу? Трызненне сівой кабылы, шаноўныя. У сям'і маіх бацькоў так атрымалася, што менавіта тату давялося вучыць маму гатаваць мноства страў, асабліва беларускай кухні, і ўсё ж па цяперашні час гатоўку мама недалюблівае — але я выклічу на дуэль кожнага, хто асмеліцца назваць маю матулю «несапраўднай жанчынай». І тата падтрымае! Альбо вось гэты цудоўны пасаж — «сапраўдная жанчына заўжды павінна выглядаць бездакорна». Як быццам ні ў каго з нас у жыцці не бывае хваробаў — уласных і сваякоў, бяссонных начэй, мігрэні ды іншых непрыемнасцяў і проста перажыванняў. Напляваць? І калі рэальная жанчына, уявіце сабе, бярэ да галавы свае і чужыя праблемы, а ў выніку нездатная 24 гадзіны ў суткі выглядаць як карцінка з глянцавага часопіса, запішам яе ў вечныя няўдачніцы ці ўвогуле спішам з рахункаў, каб не ганьбіла сваім выглядам стройныя шэрагі іншых — сапраўдных — жанчын?.. Альбо чалавек у рэшце рэшт зламае сабе псіхіку, уціскаючыся ў невядома кім прызначаныя рамкі «ты павінна»?

Нездарма ў псіхалогіі ёсць цудоўны закон чалавечых стасункаў: ніхто нікому нічога не вінен. Менавіта так: ніхто, нікому, нічога. Адзін знаёмы (сямейны, між іншым, чалавек) выдаў мне ў адказ паблажлівае: «А тады навошта мне жонка?». І я нават не ведала, як растлумачыць чалавеку, што мне вельмі шкада — яго і такіх, як ён. Бо калі жонка, жанчына ўвогуле патрэбная дзеля чагосьці — гатавання, мыцця бялізны і посуду, прыборкі дома, выхавання «спінагрызаў», урэшце, гарачага сэксу — а не проста таму, што без яе не можаш жыць — бедныя, бедныя, ды нават жабракі духоўныя такія людзі! Ім не патрэбна ніякая другая палавінка, ім патрэбны кухонны камбайн, пральная машына, дамработніца, «мая цудоўная няня» і сэксапільная медсястра ў адным ці розных флаконах. І гэтую мадэль стасункаў можна называць як заўгодна — кантрактам, двухбаковай дамоўленасцю, інструкцыяй па эксплуатацыі — але ніяк не шлюбам. І ўжо тым больш не сям'ёй. Пры гэтым, што дзівіць і бянтэжыць, пра «павіннасць» другога боку такія людзі добра памятаюць — значна лепш, чым пра свае абавязкі. Нашкодзіць мужык «налева» — і ўзгадвае перадусім не пра тое, што сапраўдны мужчына нясе адказнасць за свае паводзіны, словы і ўчынкі — а пра тое, што сапраўдная жанчына, бач ты, павінна быць цярплівай, мудрай і ўмець дараваць! І як тут рэальным жывым, а не ўяўным ідэальным паненкам не схапіцца за скалку ці чапялу?..

Карацей, прапагандавала і прапагандаваць буду гэту аксіёму: ніхто нікому нічога не вінен. А як жа тады абавязкі ў сям'і, запытаешся ты? Адказваю: вельмі проста. Сям'я — жывы арганізм. Калі ты парэзаў руку, тут ужо не да дэмагогіі, ці павінен ты прамыць і забінтаваць рану, або няхай рука сама справіцца, праўда? Вось абсалютна тое ж і паміж блізкімі людзьмі: хочаш, каб пра цябе паклапаціліся — не бойся ўпусціць карону, зрабі што-небудзь прыемнае першым, і кола далей само закруціцца. Без усякіх высвятленняў, хто павінен больш зарабляць, а хто — траціць «усе нашы грошы».

Што ж да сапраўдных мужчын, тут мая пазіцыя простая і непахісная. Сапраўдны мужчына павінен быць. Хоць бы адзін (але чым больш, тым лепш). Хоць бы дзеля таго, каб мільёны і мільярды жанчын імкнуліся стаць дзеля Яго — сапраўднымі і ідэальнымі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Фэст разьбяроў

Апошнія чатыры дні ліпеня ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту будзе праводзіцца Рэспубліканскае свята рэзчыкаў па дрэве — фэст разьбяроў. У ім возьмуць удзел народныя майстры з Гомеля і Брэстчыны. Творчы працэс узнікнення скульптуры адбудзецца на вачах у гледачоў. На спецыяльна адведзеных пляцоўках на працягу чатырох дзён мастакі будуць ствараць манументальныя скульптуры на тэму «Беларуская міфалогія». Іх творы застануцца ў музеі, упрыгожаць яго тэрыторыю. Кожны з наведвальнікаў музея зможа аддаць перавагу рабоце таго ці іншага творцы.

Але галоўныя падзеі свята адбудуцца 31 ліпеня. У гэты дзень на тэрыторыі музея будзе святкавацца Дзень украінскай народнай культуры ў Мінску. З канцэртам выступяць госці з Украіны — народныя фальклорна-этнаграфічныя ансамблі «Берагіня», «Червона калина», «Калина». Яны выканаюць народныя старажытныя песні Украіны. Будуць разгорнутыя выставы пісанак з Гуцульшчыны і Покуцця, украінскай народнай цацкі «Лялька-Матанка», гуцульскай разьбы па дрэве, украінскага ручніка. Пройдуць майстар-класы па напісанні пісанак і вырабе лялькі-матанкі. Бадай што самай незабыўнай абяцае стаць выстава-дэгустацыя «Украінскі каравай». Гэта сапраўды варта пабачыць і пакаштаваць!

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ТВОРЫ КОНКУРСУ СКЛАДАННЯ

Павел Арынушкін (Валгаград)



Белыя: Крd2. Фа5, пп. а2, b4, b7, g2, h4(7)

Чорныя: Крe4, пп. а4, b5, a7, d5, e5, f5, g3 (8)

Мат за 3 хады.

Аляксандр Сыгуроў (Самарская вобл.)

Яўген Фамічоў (Ніжагародская вобл.)



Белыя: Крf1, Лd3, Ле4, Се8, Кh2, пп. f2, f4(7)

Чорныя: Крh4, Ла5, Сс1, Ка2, Кf6, пп. c5, d5(7)

Мат за 4 хады.

Чакаем вашых адказаў.

ПРАВЕРЦЕ СВАЕ РАШЭННІ

Змяшчаем рашэнні кампазіцый, апублікаваных 7 ліпеня г.г.

С. Лойд. У задачы пешка ператвараецца ў белага караля. Два рэха-варыянты знайсці няцяжка. У другой задачы на дыяграме дзевяць чорных пешак. Убраць любую адну з іх, знаходзім адказ.

МАЙСТРЫ МІНУЛАГА ЧАСУ

Наступная партыя згуляная выдатным нямецкім майстрам і мацнейшым шахматыстам свету другой паловы XIX стагоддзя — Адольфам Андэрсанам (1818—1879). Цікавыя вяхі яго жыцця. Працаваў настаўнікам гімназіі ў Браслаўлі (цяпер Вроцлаў). У 1851 годзе ў Лондане ў першым міжнародным турніры лёгка перамог сваіх супернікаў. Здавалася б, па сіле гульні, яе разуменні, камбінацыйнаму дуэту яму доўгі час не будзе роўных. Але вось зазіхацела зорка таленту Пауля Морфі. Два шахматысты сустрэліся. Перамог амерыканец. Пасля раптоўнага адходу геніяльнага амерыканца ад шахмат, А. Андэрсан зноў паказвае выдатныя вынікі: перамога на другім міжнародным турніры, выйгрыш матчаў у не менш вядомых Коліша, Цукерторта і іншых.

Вось як «граміў» Андэрсан сваіх супернікаў.

Розанес — Андэрсан (1863 г.)

Каралеўскі гамбіт

1. e4 e5 2. f4 ef 3. Kf3 g5 4. h4 g4 5. Ke5 Kf6 6. Cc4 d5 7. ed Cd6 8. d4 Kh5 9. Cb5+ c6! 10. dc bc 11. K:c6 K:c6 12. Cc6+ Kpf8 13. C:a8 Kg3 14. Лh2 Cf5 15. Cd5 Kpg7 16. Kc3 Лe8+ 17. Kpf2 Фb6 18. Ka4 Фa6 19. Kc3 Ce5! 20. a4 Фf1+ 21. Ф:f1 C:d4 22. Ce3 Л:e3 з неміну-чым матам.

Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2 НПЗ серии БЛ № 0044234 — считать недействительным.

ДВА ДЫПЛОМЫ — БЕЛАРУСКІ І НЯМЕЦКІ

Факт

змогуць атрымаць сёлетнія першакурснікі факультэта будаўніцтва і транспарту Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

ГрДУ ўжо некалькі гадоў супрацоўнічае з Універсітэтам прыкладных навук у горадзе Біберах. Нямецкія студэнты працавалі на будаўнічых аб'ектах у Гродне, беларусы праходзілі практыку ў Германіі. І вось — сумесны праект, які, калі паспяхова вырашацца арганізацыйныя пытанні, можа стартаваць ужо з новага навучальнага года. Мяркуецца, што ў нашых студэнтаў будзе магчымасць на працягу трох гадоў вучыцца ў Біберахаў, а апошнія курсы — у ГрДУ. Праўда, адна з умоў навучання ў Германіі — добрае веданне нямецкай мовы.

Плануецца таксама, што ў кастрычніку дэкан інжынерна-будаўнічага факультэта Універсітэта прыкладных навук у г. Біберах прафесар Ханс-Георг Рыдыгер прачытае гродзенскім студэнтам спецкурс «Праектаванне і арганізацыя будаўнічай вытворчасці ў краінах ЕС».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Только памянулі дзеда, як...

Адзначыць дзедавы саракавіны ў в. Лахва (Лунінецкі раён) прыехаў з Масквы 26-гадовы ўнук.

Увечары ён пайшоў купацца на р. Смердзь, якая працякае непадалёк ад вёскі. Хлопец утапіўся, яго цела панесла цячэнне. Тапельца выцягнулі мясцовыя жыхары.

Установлена, што расіянін п'яным не быў, але меў праблемы з сэрцам.

Падчас працы на полі...

Каля в. Вельямовічы (Брэсцкі раён) на полі РУСП «Заходні» вадзіцель МАЗа наехаў на 21-гадовага мясцовага жыхара.

Хлопец быў цяжка траўмаваны і памёр на месцы. Установлена, што кіроўца быў цвярозы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Будзьце асцярожнымі, прымяняючы пестыцыды

Каб пазбегнуць страт ураджаю ад хваробаў, шкоднікаў, пустазелля, некаторыя садаводы і агароднікі змагаюцца біялагічнымі метадамі. Гэта, вядома ж, добра, і прадукцыя больш чыстая, але не ва ўсіх ёсць магчымасць сачыць за кожнай раслінкай, а тым больш, калі плошчы не дазваляюць. Таму даводзіцца звяртацца да пестыцыдаў, асартымент якіх на сёння даволі шырокі. Цяпер на паліцах крамаў можна купіць такія высокаэфектыўныя сродкі аховы раслін, як раундап, дэціс, тапаз і інш. Спынімся на двух пестыцыдах.

Дэціс. *Гэты інсектыцыд супраць вялікай колькасці шкоднікаў бульбы, агародніннych, пладовых, ягадных культур. Ён прымяняецца ў тым ліку супраць вельмі небяспечнага шкодніка бульбы — каларадскага жука. Ужо праз 30—40 хвілін пасля апрацоўкі дэціс знішчае жукоў і лічынак усіх узростаў, забяспечваючы ахову раслін на працягу месяца.*

Дэціс можна прымяняць і супраць іншых шкоднікаў бульбы: молі, тлі, лугавога матылька, совак і інш.

Тапаз. *Фунгіцыд сістэмнага дзеяння, які выкарыстоўваецца як для прафілактычнага апырсквання раслін супраць мучністай расы, так і для барацьбы з ёй і некаторымі іншымі хваробамі пладовых, агародніннych і дэкаратыўных культур.*

Практыка прымянення пестыцыдаў паказвае, што яны не прынясуць чалавеку, а таксама навакольнаму асяроддзю шкоды, калі пры іх выкарыстанні строга выконваць рэкамендацыі і інструкцыі, якія дадаюцца да прэпаратаў.

Пры рабоце з хімічнымі прэпаратамі абавязкова захоўвайце меры перасцярогі.

Любыя хімічныя прэпараты, ядавітыя травы, настоі, адвары і посуд для іх трэба захоўваць у асобным месцы, далёка ад харчовых прадуктаў, ад кухоннай пасуды. Катэгарычна забараняецца выкарыстоўваць тару з-пад хімічных прэпаратаў для захоўвання прадуктаў, вады.

Каб пазбегнуць атручэння пчол, нельга праводзіць хімічную апрацоўку раслін у час іх цвіцення. Пасля работы рукі і твар старанна вымыйце цёплай вадой з мылам.

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 25 (357)

Абрэзка рэмантантнай маліны

«Трэці год у нас расце рэмантантная маліна, позна ўвосень яна дае другі ўраджай. У літаратуры сказана, што парасткі, якія адраслі, трэба зразаць, але ж на наступны год яны дадуць яшчэ большы ўраджай. Як быць?» Г. Суша, пас. Ратамка.

— У звычайных гатункаў маліны летняга тэрміну выспявання пладаносяць двухгадовыя парасткі (затым іх выразаюць і спальваюць), — гаворыць **загадчык аддзела ягадных культур Інстытута пладаводства Ала ДЗМІТРЫЕВА**. — Рэмантантныя гатункі, наадварот, вырошчваюць як аднагадовыя.

Рэмантантная маліна мае патрэбу ў павышанай дозе пажыўных рэчываў, таму на кожны квадратны метр траншэі, выкапанай для пасадкі маліны, уносяць па 2 вядры перагною (кампосту), 1 л драўніннага або тарфянога попелу.

У першы год пасля пасадкі, калі новыя парасткі адрастаюць да 10-15 см, старыя зразаюць і спальваюць. Гэта дапамагае развівацца маладым парасткам і абараніць іх ад грыбковых захворванняў. На другі год у пачатку вегетацыі слабыя каранёвыя атожылкі выразаюць. Робяць гэта вострай рыдлёўкай або секатарам на глыбіню 2-3 см. Пры канчатковай нарміроўцы на кожным метры паласы пакідаюць ад 5 да 15 магутных парасткаў — у залежнасці ад гатунку. Для амаладжэння кожныя 4-5 гадоў у раслін выдаляюць старое карнявішча.

У гады, калі восень недастаткова цёплая і працяглая, суквецці нарміруюць. Пры гэтым выломваюць да палавіны сцябла (зверху) самыя слабыя пладовыя галінкі і выдаляюць запозненыя бутоны і кветкі. Дзякуючы такой працэдуры завязі, якія застануцца, выспяваюць хутчэй, а ягады робяцца больш буйныя і смачныя.

У рэмантантных гатункаў Геракл, Бабіна лета-2, Абрыкосавая, Бранскае дзіва і інш. асноўны ўраджай фарміруецца на аднагадовых парастках і выспявае, пакуль не надыдуць асенніе замаразкі. Вось таму іх лепш вырошчваць як аднагадовую культуру, выразаючы секатарам аднагадовыя парасткі, якія адпладаносілі, позна ўвосень (да пачатку ўстойлівых замаразкаў). Зразаюць іх як мага ніжэй, не пакідаючы пянькоў. З некаторых рамантантных гатункаў маліны (Вераснёўская, Прагрэс, Жар-птушка, Жураўлік і інш.) можна атрымліваць два ўраджаі за сезон: асноўны летні і дадатковы асенні. У такім разе наземную частку раслін на зіму не зразаюць, а рана вясной выдаляюць толькі верхавінку сцябла, якая адпладаносіла.

«Якую глебу любяць суніцы, чым іх трэба апрацоўваць і праз які час іх перасаджваць на новае месца»? Такія пытанні пра суніцы садовыя (клубніцы) цікавяць нашага чытача С. Н. Лайтэра з Брэсцкай вобласці.

Суніцы садовыя — непатрабавальныя ягады, але вельмі любяць, каб іх даглядалі. Яны могуць расці на самых разнастайных па механічным саставе глебах. Аднак лепш растуць і пладаносяць на глебах нейтральных або слабакіслых. Глебы са шчолачнай рэакцыяй ці балотныя можна выкарыстоўваць пад суніцы пасля карэннага паляпшэння. На кіслых глебах культура суніц патрабуе вапнавання, для чаго выкарыстоўваецца вапна, вапнавыя туфы і даламітавая мука. Наш чытач піша, што суніцы, якія паспелі, пакрываюцца шэрай гніллю.

— Гэта вельмі распаўсюджаная хвароба, — кажа **супрацоўнік аддзела ягадных культур Інстытута пладаводства Ларыса ІСАЧАНКА**, — якая ў гады з дажджлівым і халаднаватым летам можа выклікаць поўную гібель ураджаю. Узбуджальнік хваробы — шматедны грыб, які жыве ў глебе і на раслінных рэштках. Распаўсюджваюцца споры грыба ветрам, дажджом, пры паліве і ад судакранання ягад з глебай.

Для барацьбы з хваробай важна захоўваць правільную агратэхніку. Суніцы трэба высаджваць на добра асветленых участках, не дапускаць загушчэння пасадак і своечасова прарэджваць кусты. Пры праполках збіраць і спальваць усе заражаныя часткі расліны. Не ўносіць арганічныя і азотныя ўгнаенні ў лішніх дозах (мяркуючы па пісьму, шаноўны чытач, вы перакармілі расліны не калійным і фосфарным угнаеннем, а далі менавіта зашмат азотных). Своечасова трэба збіраць ураджай, — працягвае Ларыса Ісачанка, — пры гэтым гнілыя ягады класці ў асобную тару. У пачатку ўтварэння завязяў трэба мульчыраваць глебу пад суніцамі: з абодвух бакоў радка суніц раскладваць сухую рэзаную салому, ігліцу сасны (пасля ўборкі гэтыя матэрыялы збіраюць і знішчаюць). Апыліце куст і глебу пад ім драўнінным попелам (8—9 кг на 100 кв. м) у пачатку завязвання ягад. Пасадка цыбулі паміж кустамі (1 цыбуліна на чатыры кусты) крыху зніжае развіццё гнілі. Садаводы-аматары апырскваюць суніцы працэджаным настоем часнаку (100 г сухога лісця на 10 л вады, нагрэтай да 40 градусаў).

З хімічных сродкаў абароны прымяняюць фунгіцыд шырокага спектра дзеяння — эўпарэн. Ранняй вясной (да цвіцення суніц) апырскайце растворам з разліку 2 г прэпарату эўпарэна на 1 л вады. Пасля збору ўраджаю для знішчэння інфекцыі, якая прысутнічае на раслінах, неабходна правесці другое апырскванне эўпарэнам. Канцэнтрацыя раствору такая ж, як і пры першай апрацоўцы.

Цяпер, у канцы лета, вы можаце скасіць наземную частку суніц садовых, пакінуўшы верхавінкавыя пупышкі. Гэта мерапрыемства садзейнічае аздараўленню градкі ад шэрай гнілі, белай і бурай плямістасцяў, сунічнага кляшча, а таксама гэта амаладжвае расліны. У сухое надвор'е пасля скошвання градку паліце, расходуючы ад 0,5 да 1 л вады на кусцік. Паліваць расліны трэба цёплай вадой, не ніжэй за 15 градусаў. Для лепшага абнаўлення лістоў і закладкі кветкавых пупышак пасля плоданашэння мэтазгодна апрацаваць расліны 0,3-працэнтным растворам мачавіны (30 г на 10 л вады).

Скошаныя лісты суніц спаліць, а самі кусцікі падрыхліць, падкарміць, прапалоць, каб да позняй восені яны далі новую зялёную масу, — гэта дазволіць раслінам лепш перазімаваць і мець да вясны дастаткова пажыўных рэчываў.

І яшчэ. Рэпрадуктыўны тэрмін суніц садовых 3-4 гады, і тады, калі ёсць такая неабходнасць, можна перасаджваць іх у іншае месца.

Дапамажыце суніцам

У лазню — з галавой дракона

Пра змеегалоўнік малдаўскі мы неяк пісалі ў нашай рубрыцы. Расліна ўдала прапісалася на нашых агародах, і яна вартая таго. Думаеце, назва крыху дзіўная? Дык гэта не што іншае, як гатункі даволі вядомай расліны — турэцкай мелісы, вострапахучай і лекавай травы, якая часта трапляе ў продаж пад назвай мелісы. А вось лацінская назва Dracocephalum (даслоўны пераклад — «галава дракона») вельмі дакладна адлюстроўвае форму венчыка кветкі. Калі ў вас няма на агародзе гэтай расліны, паспрабуйце вырасціць, і вы ацэніце яе ўласцівасці не толькі ў салаце, у складзе прыпраў пры марынаванні агуркоў, але і ў лекавай гарбаце, і ў лазневай парылцы.

Змеегалоўнік малдаўскі — аднагадовая травяністая расліна вышынёй 30—80 см з белымі, блакітнымі або фіялетавымі кветкамі.

Нарыхтоўваюць траву, зразаючы наземную частку ў перыяд масавага цвіцення на вышыні 10—15 см ад паверхні глебы. Калі зрэзаць вельмі нізка, то ў сыравіне аказваецца вялікая колькасць грубых сцёблаў, ад якіх не будзе карысці. Перад сушкай расліну не трэба здрабняць, каб максімальна захаваць эфірны алей. Сушыць змеегалоўнік трэба ў цені, у памяшканні, якое добра праветрываецца. Не рэкамендуецца сушыць пры высокай тэмпературы (у электрасушылцы), таму што, зноў жа, улятучваецца эфірны алей, і сыравіна губляе большую частку карысных уласцівасцяў, а заадно і дзівосны водар.

У народнай медыцыне розных краін змеегалоўніку малдаўскаму прыпісваюць шматлікія лекавыя ўласцівасці. Эфір валодае антысептычным, ветрагонным і спазмалітычным дзеяннем, мае выражаны лімонны пах. У канцы цвіцення пах змеегалоўніка робіцца больш рэзкім. Флаваноідныя злучэнні, якія ўваходзяць у састаў расліны, дзейнічаюць на арганізм чалавека як жаўцягонны і антытаксічны сродак.

Пры ператамленні і павышанай узбуджальнасці, некаторых **жаночых захворваннях, звязаных з парушэннем абмену рэчываў**, змеегалоўнік выкарыстоўваюць у выглядзе настою:

1 ст. лыжку здробненай сыравіны заліваюць шклянкай кіпеню, настойваюць 10—15 хвілін і прымаюць па 1/2 шклянкі 3 разы на дзень.

Можна прыгатаваць менш канцэнтраваны настой:

1 ч. лыжка сыравіны на імбрычак, піць як гарбату пасля яды альбо перад сном.

Пры вострых бранхітах можна рабіць інгаляцыі:

2-4 ст. лыжкі кідаюць у каструльку, заліваюць кіпенем і дыхаюць над парай на працягу 8-10 хвілін.

Трэба памятаць! Эфірны алей у некаторых людзей выклікае алергію, таму перш чым рабіць такія інгаляцыі, пераканайцеся, што яны не прынясуць шкоду.

На камяні ў лазні можна выліць настой змеегалоўка, і тады ўсё памяшканне напоўніць чароўны водар. У гарбаты пры дабаўленні змеегалоўніка значна паляпшаецца смак і пах.

Прымяняюць змеегалоўнік малдаўскі пры лячэнні **інфекцый мочапалавых шляхоў**. У гэтым выпадку вельмі эфектыўным з'яўляецца настой, які выкарыстоўваецца для сядзячых ваннаў:

150—200 г сухой сыравіны настойваюць 20 хвілін у вядры кіпеню, працэджваюць, ахалоджваюць да тэмпературы 38—39 градусаў, выліваюць у таз. Прымаюць адпаведную працэдуру на працягу 10—15 хвілін.

Сыравіну змеегалоўніка, зрэзанага ў перыяд бутанізацыі (да пачатку цвіцення), таксама заварваюць як гарбату, але дзеянне такога напою будзе крыху іншым, таму што ў гэты перыяд утрыманне эфірнага алею ў раслінах параўнальна невысокае, але шмат іншых біялагічна актыўных рэчываў, якія дапамагаюць арганізму справіцца са **стрэсам**, ачуняць пасля **прастудных і інфекцыйных захворванняў**. Пры гэтым не ўзбуджаецца цэнтральная нервовая сістэма і не павышаецца артэрыяльны ціск, як пры прыёме прэпаратаў з жэньшэню ці араліі.

Калі і як убіраць

(Працяг. Пачатак у нумары за 15 ліпеня.)

Да самых ранніх культур адносіцца **гарох**. «Лапаткі» скараспелых гатункаў пачынаюць убіраць праз 45—55 дзён пасля масавых усходаў. Каб атрымаць зерне, гарох пакідаюць выспяваць на кусце і ўбіраюць, калі 80 працэнтаў бабоў пажоўкне, а гарошыны зробяцца цвёрдымі. Перад тым як закласці гарох на захоўванне, яго трэба высушыць. Малады горах кансервуюць або фасуюць у пакеты і замарожваюць. Можна спачатку яго паварыць 3-5 хвілін у падсоленай вадзе, памешваючы, астудзіць у халоднай вадзе і адкінуць на друшляк, а затым пасушыць і замарозіць.

Боб пачынаюць убіраць з ніжняга яруса ў недаспелым выглядзе, калі стручкі дасягнуць 5-7 см у даўжыню, а ў пладоў з'явіцца спецыфічны бабовы смак і яны перастануць гарчыць. Звычайна раннія гатункі можна ўжываць праз 50—55 дзён пасля з'яўлення ўсходаў, сярэднеспелыя і сярэднязпозніе адпаведна праз 60—65 і 100 дзён. У свежым выглядзе боб доўга не захоўваецца. Даўней убіралі боб у стадыі поўнай спеласці і сушылі. Аднак перад тым, як з яго прыгатаваць якую-небудзь страву, даводзілася замочваць у вадзе і доўга варыць. У некаторых выпадках так робяць і цяпер. Але сёння ёсць гатункі і для замарожвання.

Фасолю звычайную можна ўжываць у ежу, калі стручкі дасягнуць 10 см, звычайна праз 8-10 дзён пасля ўтварэння завязі. У гэты перыяд насенне дробнае, але пры націсканні «лапаткі» лёгка раскрываюцца. Ураджай збіраюць выбарачна некалькі разоў на тыдзень. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што паўцукрыстыя гатункі трэба ўбіраць раней, таму што ў іх бабы грубеюць хутчэй. Сабраную фасолю ў стадыі малочна-васковай спеласці можна захоўваць не больш як трое сутак, у халадзільніку — тыдзень. Пасля 3-5-хвілінnай бланшыроўкі ў вадзе нарэзаныя на кавалкі стручкі выкарыстоўваюць для прыгатавання яечні, першых і другіх страў, а таксама для кансервавання. Фасолю можна засаліць у эмаліраваным посудзе: заліваюць расолам (на 1 кг фасолі — 50 г солі). Зверху кладуць драўляны круг і гнёт.

Спаржавую фасолю, як правіла, раннія гатункі можна выкарыстоўваць для ўсіх відаў спажывання і перапрацоўкі праз 40—45 дзён пасля ўсходаў.

Падрыхтоўку **цыбулі** да ўборкі пачынаюць загадзя. Калі ўтвараюцца даволі буйныя галоўкі, зямлю ад іх трэба акуратна адгрэбці, каб яе «плечукі» добра праграваліся на сонейку. Палівы і падкормкі ў гэты час спыняюць. Калі вегетацыя зацягнулася і зялёнае пяро працягвае расці, трэба яго злёгку прым

БЕЛИНВЕСТБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 года

Наименование банка: **ОАО «Белинвестбанк»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		278 739,1	237 343,8
3	Средства в Национальном банке	1102		252 517,2	153 672,3
4	Ценные бумаги	1103		368 041,1	327 721,9
	для торговли	*11031*		-	-
	удерживаемые до погашения	*11032*		-	33 034,1
	в наличии для продажи	*11033*		368 041,1	294 687,8
5	Кредиты и другие средства в банках	1105		672 808,4	222 684,0
6	Кредиты клиентам	1106		3 942 812,9	3 322 487,7
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107		427,0	427,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108		236 771,2	211 128,8
9	Прочие активы	1109		72 334,0	97 248,0
10	**Итого активы**	**110**		**5 824 450,9**	**4 572 713,5**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202		213 290,5	357 481,2
13	Кредиты и другие средства банков	1205		548 726,1	344 199,7
14	Средства клиентов	1206		3 668 998,0	3 053 068,7
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		615 468,6	107 640,1
16	Прочие обязательства	1209		74 862,9	71 185,6
17	**Всего обязательства**	**120**		**5 121 346,1**	**3 933 575,3**
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211		382 089,6	382 089,6
20	Эмиссионный доход	1212		0,1	0,1
21	Резервный фонд	1213		39 074,8	33 857,6
22	Накопленная прибыль	1214		186 400,1	134 807,0
23	Фонд переоценки статей баланса	1215		95 540,2	88 383,9
24	Всего капитал	121		703 104,8	639 138,2
25	**Итого обязательства и капитал**	**12**		**5 824 450,9**	**4 572 713,5**
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301		4 710 263,8	3 607 573,3
28	Обязательства	1302		1 411 415,3	1 171 945,0

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 года

Наименование банка: **ОАО «Белинвестбанк»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		354 464,6	285 029,4
2	Процентные расходы	2012		226 001,4	208 435,8
3	*Чистые процентные доходы*	201		128 463,2	76 593,6
4	Комиссионные доходы	2021		69 744,9	57 192,6
5	Комиссионные расходы	2022		14 019,5	7 352,7
6	*Чистые комиссионные доходы*	202		55 725,4	49 839,9
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203		39 317,2	(-29 258,6)
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		15,4	(-287,3)
9	Доход в форме дивидендов	205		36,5	33,5
10	Чистые отчисления в резервы	206		51 826,6	22 033,7
11	Прочие доходы	207		38 873,3	76 093,3
12	Операционные расходы	208		110 674,1	96 766,3
13	Прочие расходы	209		47 126,1	18 354,0
14	Налог на прибыль	210		7 754,7	5 781,8
15	**Прибыль (убыток)**	**2**		**45 049,5**	**30 078,6**

Первый зам. председателя Правления **Н.Ф. Прима**

Главный бухгалтер **А.Н. Сырокваш**

www.belinvestbank.by

Минск, пр-т Машерова, 29

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3, выдана Национальным банком Республики Беларусь 27.10.2006.
Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».

Як стаць віртуозамі тэатра?

Праект

Маладыя беларускія аўтары і рэжысёры збяруцца разам, каб прысвяціць спектакль Мінску.

Гэта будзе не проста спектакль, а нават «спектакль-фестываль». Ён складзецца з драматургічных мініяцюраў, якія могуць замяняцца цягам часу на новыя, больш надзённыя. Бо спектакль павінен быць жывым не толькі па форме, але і па змесце: яго задача — шляхам тэатра, сучаснай мастацкай мовай гаварыць аб праблемах беларускага грамадства.

Ну і як вы лічыце, дзе гэтыя праблемы больш відавочныя? Напэўна, у мегаполісе. Значыць, у сталіцы, дзе жыве больш людзей, куды імкнецца моладзь з глыбінкі, дзе, лічыцца, віруе жыццё. Таму тэма спектакля зададзена: «Мінск — любоў мая».

Не ведаю, як хто, а я, напрыклад, не магу разважаць аб праблемах, калі думаю пра любоў. Магчыма, інакш глядзяць на гэтае пачуццё Мікалай Рудкоўскі і Андрэй Курэйчык — тыя з драматургаў, хто запрошаны для напісання мініяцюр. І не толькі яны, бо калі такі праект пачынаць, то напэўна, таксама дзеля таго, каб абудзіць творчыя сілы і заахвоціць маладых драматургаў пісаць пра сучасную Беларусь. Гэта якраз тая драматургія, якой вельмі бракуе беларускім тэатрам. Ставіць яе будуць маладыя рэжысёры, сярод якіх пагадзіўся быць Сяргей Кавальчык.

Гэты праект задуманы Міністэрствам культуры разам з Сучасным мастацкім тэатрам пад кіраўніцтвам Уладзіміра Ушакова, вядомага па праекце «Віртуозы сцэны». «Жывы спектакль» для Беларусі — цікавая ідэя і вельмі патрэбная для творчых праяў маладых аўтараў і рэжысёраў. Аўтары ідэі думаюць і пра будучыню: магчыма, адзін спектакль дасць глебу для стварэння гарадскога фестывалю сучаснага тэатральнага мастацтва з запрашэннем іншых тэатраў, дзе ёсць месца спектаклям пра нашых сучаснікаў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ЖАРТЫ ПАМЯНЯЮЦЬ НА ВЯЛІКІЯ ГРОШЫ

Упершыню ў Віцебску грошы можна будзе зарабіць на жартах. Абласны цэнтр стане першым беларускім горадам, дзе правядуць кастынг будучых удзельнікаў папулярнага расійскага тэлевізійнага шоу «Смех без правілаў». Маладыя гумарысты могуць паспаборнічаць за істотныя грашовыя прызы.

Адна толькі ўмова для ўдзелу ў кастынгу: узрост ад 18 да 28 гадоў. Арганізатары праекта — вядомы забаўляльны тэлеканал «ТНТ-Тэлесетка» і маскоўскі прадзюсарскі цэнтр «Дзве зоркі».

У Віцебску «агледзіны» маладых і вясёлых запланавалі правесці 1 жніўня ў Палацы культуры чыгуначнікаў (кастынг распачынаецца а дзявятай гадзіне вечара). Потым расіяне будуць шукаць таленты ў іншых гарадах Беларусі. Відаць, сваіх гумарыстаў у іх не хапае. У нас, упэўнены, шмат!

Самым таленавітым гумарыстам арганізатары гарантуюць выступленні на вялікай сцэне і добрыя ганарары.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВІЦЯЗІ ЧЫСЦІЛІ БЕРАГІ РЭК

Валанцёры з усіх рэгіёнаў Беларусі шмат карыснага зрабілі падчас знаходжання ў валанцёрскім лагеры працы і адпачынку «Віцязь». Працу лагера арганізаваў Віцебскі гарадскі камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

Сорак «Віцязяў» — хлопцы і нават дзяўчаты — чысцілі ад смецця берагі ракі Віцьба, у гонар якой атрымаў назву абласны цэнтр, і магутнай Заходняй Дзвіны. Наводзілі парадак на тэрыторыі Парку культуры і адпачынку імя Савецкай Арміі, прыбіралі несанкцыянаваныя звалкі на старых могілках і ў лесапаркавай зоне на ўскраіне Віцебска.

У ліку іншага моладзь дапамагла добраўпарадкоўваць тэрыторыю чыгуначнага вакзала, які капітальна рамантаваўся. Праявілі валанцёры і свае творчыя здольнасці. У прыватнасці, падчас першай дабрачыннай акцыі па раздачы гараджанам бяздомных кацянят і сабак, наведвальнікам Віцебскага заапарка паказалі спектакль «Маленькі прынц».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Жэўжыку ад бабулі

і ад дзядулі таксама ў спадчыну засталіся скарбы: спевы, найгрышы, танцы — усё, што перадавалася з даўніны дзятве ад старэйшых.

«Жэўжык», так завецца фальклорны гурт Любанскага раённага цэнтра культуры, збірае гэтыя скарбы ў вёсках і паказвае іх у сваіх канцэртных праграмах. Да гледачоў маленькія выканаўцы выходзяць са сваімі імяннымі драўлянымі птушачкамі ў руках. Сёлета гурт выдатна выступіў на рэгіянальным свяце «Казкі бабулі Аўдулі».

На гэтым фотаздымку вы бачыце маленькіх аматараў фальклору Арцёма ВЫСКВАРКУ і Алену ДРАБУДЗЬКУ.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

Занатоўкі мастака

АЛА І ВАДА

«Сядзіш і каву сваю п'еш. Ведала, што тут будзеш сядзець і каву піць. На небе замовіла сабе сустрэчу з табой. Бывае, робіцца сумна і думаю: даўно не бачыла Глобуса. Раз, і сустракаю! Здараецца, што цябе няма ў горадзе, тады мне сустракаецца твой брат». — «Выдатна, Ала. Я радуюся нашай невыпадковай сустрэчы. Дзеля чаго ты мяне замаўляла, цікава?» — «Глобус, ты ведаеш, я чалавек вясковы, таму добра стаўлюся да вады. Яна — жывая субстанцыя. Яе нельга на доўгі час заганяць у трубы. Вы тут, у горадзе, пазаганялі ваду ў жалезныя трубы і там яе трымаеце. Потым адкручваеце кран, а самі ідзяце ў другі пакой размаўляць па скайпе ці глядзець тэлевізар. Яна цячэ і цячэ, з трубы ў трубу, з аднаго палона ў другі палон. Няправільна гэта, жорстка! Ты так не рабі з вадою». — «Ала, я так і не раблю з вадою». — «Вось і ўсё, што хацела сказаць. Дзеля гэтага і замовіла на небе нашу сустрэчу».

СЕЗАН І СУР'ЁЗНАСЦЬ

Жывапісец Поль Сезан не пайшоў на пахаванне сваёй маці, пра што напісаў Бернар. Сезан не наведаў пахаванне, бо не знайшоў у сабе сілы, каб прапусціць звычайныя гадзіны працы на натуры. Сезан пісаў свой вечна-зялёны краявід, калі на могілках засыпалася зямлёю цела ягонай маці. Іншыя сведкі сцвярджаюць, што жывапісец быў чалавекам надзвычайнай дабрыні, але ніхто не аспрэчыў факт адсутнасці Поля Сезана на пахаванні роднай маці. Сезан быў сур'ёзным творцам і сур'ёзным чалавекам, але сур'ёзны мастак у Сезане быў значна мацнейшы за чалавека.

ВАЛ І ГАРЭЛКА

Ёсць людзі, з якімі добра выкурваецца на крамным ганку вечаровая цыгарэта. А ёсць такія, з кім выдатна выпіваецца ранішні кубак кавы. З кімсьці ў парку цікава гаворыцца пра мастакоўскую свядомасць і натхненне ў сонечным краявідзе. А ёсць сабутэльнікі, з якімі добра п'ецца гарэлка. Чаму? А хто ж пра тое ведае... Гэта нераўнуючы як і каханне: або яно ёсць або няма. Добра п'ецца гарэлка з беларускім філосафам Валянцінам Акудовічам. Колькі разоў я з ім піў, столькі разоў мне добра пілося. Можа я з ім мала выпіваў? Можа і так. Трэба было выпіваць і болей, і часцей. Падобнае меркаванне пра Валянціна склалася не толькі ў мяне. Адзін маскоўскі літаратар так сфармуляваў свае адносіны з мінскім філосафам Акудовічам, якога ён па-сяброўску называе Валам: «Як Вала ўбачу, дык адразу хочацца бегчы ў краму, па гарэлку!»

ВОЛЬГА, ЗАЛАТЫ КРЫЖ І ЛАНЦУЖОК

Напярэдадні Пасхі дачка маёй знаёмай Вольгі заклала ў ламбард залаты крыж з ланцужком. Вольга паскардзілася на пятнаццацігадовую дачку, якая выносіць з дому і прадае каштоўныя рэчы. Прапалі кінакамера з фотаапаратам, прапалі айфон і нэтбук... Калі жанчына заўважыла знікненні, дык абшукала дачку. Знайшлася квітанцыя. Залаты крыж з ланцужком жанчына з ламбарда выкупіла. Астатнія рэчы прапалі незваротна. Атрыманыя грошы дзяўчынка прагуляла-прапіла з сябрамі. Маці давялося правяраць сваё дзіця на наркотыкі. Кроў у дачкі была чыстая. Хоць з гэтым пашанцавала. Вольга пачала пытацца ў мяне... Што рабіць з дачкою? Як яе ўратаваць ад ненармальнасці? Хіба нармальны чалавек будзе зносіць з дому і прадаваць рэчы? Я не ведаю што і параіць знерваванай маці, бо ўсе выпадкі зладзейства ў сям'і вельмі характарныя і непадобныя адзін да другога. Залаты крыж я дзяўчынцы-зладзейцы не вярнуў бы, а ланцужок аддаў бы.

УЛАД І ДУХІ

Можа гэта былі і не духі, а туалетная вада, але ва ўспамінах сведкаў фігураваў флакон з духамі, а не з ласьёнам ці водарнай вадою. Гісторыя хахалявання і рэўнасці не магла аздабляцца водарам таннай парфумы, і яна аздобілася духамі. Пачалося з таго, што Улад пасярод працоўнага дня прывёў дадому каханку. Ён прывёў яе пасярод дня, бо жонка была на працы, а старэнькая маці выправілася на леціша. Ці нехта добры падказаў жонцы пра сэкс-прыгоды Улада? Ці яна сама высачыла мужа-здрадніка? Гісторыя пра тое маўчыць. Але толькі Улад распачаў любошчыць каханку (пазней гэты эпізод будзе апісаны Уладам сто разоў і ва ўсіх падрабязнасцях!), як жонка пазваніла ў дзверы. Яна збіралася дзверы адчыніць, балазе ключы меліся, але прадбачлівы Казанова-Менскі зачыніўся на засаўку. Жонка біла ў дзверы кулакамі і каленьмі, лаялася-брахала-мацюкалася на ўвесь пад'езд, а потым дастала з сумачкі духі, разбіла флакон аб дзвярную ручку і падпаліла абіўку. Колькі там было духоў? Колькі таго пажару? Паўвядра вады хапіла, каб дрогка-сіняе полымя патушыць. Добрыя суседзі і патушылі. Яны і супакоіць абражаную, зняважаную і прыніжаную спрабавалі. Жонка не супакойвалася ніяк. Яна прасядзела, прарыдала, праскуголіла пад абпаленымі дзвярыма гадзін з адзінаццаць. Потым сышла назаўжды. Каханка таксама не вытрымала напалу вогненных жарсцяў і кінула Улада назаўсёды. Добра, што старэнькая маці вярнулася з леціша толькі праз тры тыдні, і ёй ніхто нічога не расказаў пра духі і пажар, бо дзверы на той час ужо ababіліся новым скуразамяняльнікам. Дарэчы, Улад заўжды карыстаўся парфумам толькі выдатнай якасці.

БУАЛО І НЯЗДАРЫ

Французскі паэт Буало ў сваіх «Сатырах» пачаў называць імёны бяздарных рыфмаплётаў. Да Буало ў Францыі графаманаў крытыкавалі, але не называючы. Адкрыццё, зробленае Буало, мела працяг, бо няздара павінен ведаць, што ён — няздара і дрэнь. Нічога страшнага ў грамадстве не адбудзецца, калі які з графаманаў даведаецца пра сваю бяздарнасць.

ТРУШЫН І ШЧАРБАКОЎ

У Трушына і Шчарбакова я вучыўся трудным колеразлучэнням. Можна было сказаць «цяжкія колеразлучэнні», але гэта будзе не так трапна. Каб згарманізаваць сіні з чырвоным ці зялёны з чырвоным, даводзіцца добра натрудзіць руку і вока. У Шчарбакова добра згарманізоўваліся сіні з чырвоным, у Трушына — зялёны з чырвоным. Каларысты так казалі пра Шчарбакова і Трушына ў нашай мастацкай вучэльні. Шчарбакоў тады напісаў карціну ў сініх і чырвоных тонах, на якой стаялі жанчыны з рыдлёўкамі ў свежавыкапаным акопе. Трушын напісаў вечаровы зялёна-чырвоны краявід з малочна-белымі каровамі. Каларысты напісалі па вялікай карціне і з'ехалі з Мінска ў свой змрочны Кёнігсберг, які называюць Калінінградам. Пра лёс Шчарбакова і Трушына я нічога не ведаю, але я ім удзячны за выдатныя прыклады працы з труднымі колеразлучэннямі.

Адам ГЛОБУС.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

Працягваем нашы конкурсы рашэнняў кампазіцый на 64 і 100-клетачных дошках.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-7/12



Белыя: b2, дамкі c1, e3 (2). **Чорныя:** a3, b4, d8, e5, e7 (5). Выйгрыш.

АЎТАРСКІ-12/5



Белыя: d4, e7, дамка c1 (3). **Чорныя:** a3, f4, f8, g5 (4). Перамога белых.

БЛІЦ-55/4

Белыя: 18, 23, 26, 28, 29, 33, 42, 43, 45, 46, 47, 48, 50 (13). **Чорныя:** 8, 20, 30, 31, 32, 34, 35, 36, 37, 39, 40, 44 (12). Перавага белых пры дапамозе прыёма запірання чорных фігур.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

МІЖНАРОДНЫЯ ТУРНІРЫ

Адзін з іх меў традыцыйную назву «Злата Прага», другі прайшоў на курорце Салоу (Іспанія). У абодвух перамог былы мінчанін Аляксандр Балякін, які зараз выступае за Галандыю. Прадстаўнікі Беларусі занялі такія месцы: Андрэй Толчыкаў — чацвёртае ў першым турніры, Анатоль Гантварг — трэцяе ў іспанскім.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

«Пагода ў доме»-7 (М. Грушэўскі): **№ 9.** f8 (a3:c5A) a3, d2x. A(a7:c5) c1 (e3) f4 (b2) g7 (c1) gh6x i **№ 10.** g7 (fe3) f8, e3! (d4) b6, e3x.

Аўтарскі-12 (П. Шклудаў): **№ 2.** e3 (b4A) h6 (a3B) f8 (g3C) b4, h4 (f4D) f2x. A(g3) h6 (h2) f8 (c5E) a3 (d4) g1x. B(g3) f8 (h2G) a3 (g1) ac5x. C(f4) b4, h6 (g3) e3 (h2) g1x. D(d4) g5 (c3) c1x. E(g1) c5x. G(f2) ag1 (a3) b4x i **№ 3.** f4 (f6AB) e3 (fe5) g5 (ed4) h6, h4 (b4C) g5 (a3) c1 (e5) g7 (c5D) h8 (cd4) g5 (b2) gf6, a1x. A(a5) e5, e3, f8x. B(d4) g5 (bc5E) f6, e3, d4/e3x. C(d4) g5 (c3) c1 (e5) g7 (c5) h8 (ed4) g7/f6 (b4) a3 (e3) f2 (d2) c3, e1 (a3) c3x. D(f4) g5/h6 (b2) c1 (a1) h8 (c5) cb2 (c5) d8x. E(dc5) f6, e3, b4/a3x.

Бліц: 55/1 (І. Івацка). 1, 18-12, 3, 25, 19-14, 46x і **55/2** (Г. Андрэеў). 18-12 (49) 3 (8) 10 (14) 34x.

Сярод правільна рашыўшых — майстар Аляксандр Ляхоўскі (Жодзіна) прывёў: у бліцы-55/1 (І. Івацка) — 1. 7-1/7-2x, у заданні № 10 конкурсу «Пагода ў доме»-7 (М. Грушэўскі) — 1. fg7/ab8x.

Усміхнемся!

У спякоту прадпрымальны Карлсан здаваў сябе ў арэнду па 5000 рублёў за гадзіну.

☺

Адэса, бацька вялікай сям'і купіў латарэйны квіток. Увечары ўся сям'я збіраецца за сталом і пачынае марыць:

— Вось выйграем легкавы аўтамабіль!.. У нядзелю паедзем за горад. Вакол птушачкі спяваюць, кветкі растуць...

— Возьмем з сабой бабулю, дзядулю і Фіму...

— Як Фіму?! Ён жа не аддаў тры рублі за мяса!

— Фіма, выйдзі з машыны!

☺

У жанчыны павінна быць усё прыгожае: і душа, і думкі, і ўсё, пра што вы цяпер падумалі... Прычым абедзве...

☺

— Ты што такі сумны?

— Ды вось — сын нарадзіўся...

— А як назвалі?

— Людовік...

— Чаму?!

— Таму што чатырнаццаты!

Сердечно поздравляем коллектив минского предприятия **"ОАО «БЕЛРЕАХИМ»** (отдел удобрений) **с Днем работника торговли!** Желаем крепкого здоровья, успехов в труде, благодаря вам цветут сады, увеличиваются урожаи, радуются люди.

Ваши постоянные клиенты.

СПЯКОТА. ХАЛАДЗІЛЬНІК СКРАЛІ

Віцебскі 73-гадовы пенсіянер паскардзіўся ў міліцыю на тое, што з яго кватэры пры невядомых абставінах скралі халадзільнік.

Высветлілася, што халадзільнік скралі два беспрацоўныя (29-гадовы і 25-гадовы). Скрадзенае канфіскавалі. Заведзена крымінальная справа. Якім чынам крымінальны дуэт здолеў незаўважна скрасці з кватэры шматкватэрнага дома вялікі халадзільнік, абавязкова высвятляць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Куплю дом у вёсцы да 20 км ад МКАД у любым стане і а/м маладзей чым 1990 г. ВАЗ ці імпартны.
Тэл. 8 025 6548116.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.07	21.25	16.18
Віцебск —	4.49	21.21	16.32
Магілёў —	4.57	21.15	16.18
Гомель —	5.01	21.03	16.02
Гродна —	5.23	21.38	16.15
Брэст —	5.32	21.31	15.59

Месяц

Першая квадра 18 ліпеня. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Кірылы, Панкрата, Фёдара.*

К. *Марыі, Магдалены, Лаўрэнція.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

22 ліпеня

Дзве даты

1895 год — нарадзіўся Павел Осіпавіч Сухой, савецкі авіяканструктар, доктар тэхнічных навук, Двойчы Герой сацыялістычнай працы, Лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР. Адзін са стваральнікаў рэактыўнай і звышгукавой авіяцыі. Стварыў баявы шматмэтавы самалёт Су-2, штурмавік Су-6. Сканструяваў больш як 50 мадэляў самалётаў, 20 з іх выпускаліся серыйна. На самалётах яго канструкцыі ўстаноўлены рэкорды свету па працягласці, хуткасці і вышыні палёту. Памёр у 1975 годзе. Яго імем названы Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, у Гомелі, Глыбокім і Лунінцы ўстаноўлены помнікі.



356 год да н.э. — нарадзіўся Аляксандр Македонскі, вялікі палкаводзец.

Цытата дня:

«Людзі плачуць над выдумкамі паэтаў, а на сапраўдныя пакуты глядзяць спакойна і раўнадушна».

Ісакрат (436—338 да н.э.), афінскі прамоўца.

ХЛЕБНАЯ ЛАПАТА

Абавязковы атрыбут сялянскага жыцця, пры непасрэдным удзеле якога выпякалі хлеб. У традыцыйнай культуры славянаў даволі часта выкарыстоўвалася ў розных абрадавых кантэкстах і мела адпаведныя абрадавыя функцыі. Так, самым актыўным чынам хлебную лапату ўключалі ў абрад выпякання вясельнага каравая. На Піншчыне перад тым, як пасадзіць каравай у печ, хросная маці злёгку ўдарала хлебнай лапатай усіх, хто прысутнічаў у хаце, «каб шчасце было». Пасля таго, як каравай дастануць з печы, яна ж тройчы стукала хлебнай лапатай па першай бэльцы, якая знаходзілася на століе ў непасрэдна блізкасці ад печы.

● Тая дзяўчына, якая ніяк не магла выйсці замуж, выхоплівала лапату з рук хроснай і выбягала на вуліцу. Лічылася, калі яна першым сустрэне мужчыну, то хутка выйдзе замуж, калі жанчыну — яе мары ў гэтым годзе не здзейсняцца. На Берасцейшчыне хлебнай лапатай бабы стараліся дакрануцца да хроснага бацькі, які сядзеў у час выпякання вясельнага каравая на покуце. Кожная з прысутных падыходзіла да хроснага, «біла» яго хлебнай лапатай і пасыпала мукой. Пасля таго, як вясельны каравай вымуць з печы, хросны бацька ставіў хлебную лапату ў чырвоны кут, дзе яна знаходзілася тры дні.

● Лічылася, што прадуцыравальныя якасці — так званы спор ці ўдачу — хлебная лапата магла перадаваць не толькі людзям, але і жывёле. Так, каб карова «прыйшла з цяляткам», перш чым адправіць да быка, яе тройчы «перакрыжоўвалі» (злёгку білі па спіне) хлебнай лапатай.

● У паўсядзённым жыцці ў дачыненні да хлебнай лапаты існаваў шэраг правілаў і забаронаў. Так, пасля таго, як хлеб паставілі ў печ, хлебную лапату трэба было падняць як мага вышэй, дакрануцца да бэлькі або пячной трубы, каб хлеб добра падняўся. А потым трэба было лапату выставіць у сенцы або паставіць у клець, «каб у хаце ніхто не быў нікому павінен». Прычым лапату трэба было паставіць ручкай дагары. Хлебную лапату забаранялася выкарыстоўваць не па прызначэнні. Лічылася, той, хто парушыць гэтае правіла, будзе хварэць, дзеці перастануць расці, хлеб перастане падымацца, і такой лапатай у далейшым карыстацца будзе нельга.

● Хлебную лапату выкарыстоўвалі і як магічны сродак падчас лячэння дзяцей. На Палессі рабілі так: хворае дзіця садзілі на лапату і падносілі да моцна напаленай печы, у якой палаў моцны агонь, і «пужалі» хваробу. Пры гэтым прыгаворвалі, што калі хвароба «не адчэпіцца» ад дзіцяці, то яе спаляць у печы.

Хлебнай лапатай «закрыжоўвалі» навальнічную хмару. Для гэтага бралі велікодны абрус (той, які быў на стале ў дзень святкавання Вялікадня), прымацоўвалі да лапаты і размахвалі, як харугвамі, з боку ў бок, як бы разганяючы хмары.

● Дзяжа і хлебная лапата заўсёды ўяўляліся як неразлучная пара, якая толькі разам будзе спрыяць дабрабыту і шчасцю ў гэтай сям'і. Таму, калі трэба было знішчыць старыя дзяжу і лапату, іх палілі разам — на масленічным або купальскім вогнішчы, калі трэба было купіць або зрабіць новыя — набывалі разам, толькі парай.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЯК ТЫЯ ВАЎКІ

У в. Магіліцы, што ў Івацэвіцкім раёне, сярод белага дня ў пенсіянера ўкралі каня.

Жывёліна стаяла на двары каля хаты і нечакана для гаспадара знікла. Аператыўнікі прыехалі на месца здарэння і пасля пошуку знайшлі астанкі каня. З ім расправіліся мясцовыя жыхары — беспрацоўныя і рабочы.

Зладзеяў затрымалі.

МЯСА НЕ ПРАПАДЗЕ

У Кобрынскім раёне, побач з беларуска-ўкраінскай мяжой, з дапамогай цеплавізара «Эфа» была выяўлена павозка з 13 тушамі.

Мяса, а таксама каня з павозкай даставілі на мабільную пагранзаставу «Дзівін».

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3541. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12